Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

2 ЛЮТАГА 2008 г.
СУБОТА
№ 21 (26134)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

170 гадоў таму нарадзіўся Кастусь КАЛІНОЎСКІ

Фотарэпартаж з вуліцы імя нацыянальнага героя ў Мінску — на 3-й старонцы.

КДК Беларусі і Падліковая палата Расіі працуюць у поўным узаемадзеянні

Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі і Падліковая палата Расіі працуюць у поўным узаемадзеянні. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Падліковай палаты Расіі Сяргеем Сцяпашыным.

«Вельмі добра, што ў свой час мы ўстанавілі трывалыя кантакты паміж кантрольнымі ведамствамі нашых краін», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, вопыт работы КДК Беларусі сведчыць аб тым, што і Падліковай палаце РФ мэтазгодна было б мець такія ж шырокія паўнамоцтвы.

«Расія — наш прыярытэтны рынак», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Вядома, мы сутыкаемся з тым, што на рынку не ўсё так сумленна, як нам хацелася б. Таму вельмі важна, каб КДК і Падліковая палата сумесна выяўлялі любыя моманты карупцыйнай дзейнасці і прававыя парушэнні», — дадаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу, Сяргей Сцяпашын паведаміў Прэзідэнту Беларусі, што кантрольныя ведамствы Беларусі і Расіі дамовіліся ў гэтым годзе ў аператыўным рэжыме вывучыць ход выканання ўсіх праграм бюджэту Саюзнай дзяржавы. «У Саюзнай дзяржавы няма сваёй падліковай палаты, і мы два гады таму ўзялі на сябе функцыю па кантролі за бюджэтам і навялі парадак, — адзначыў кіраўнік Падліковай палаты РФ. — Цяпер бюджэт прымаецца без спазнення. Да таго ж ён абсалютна празрысты». Разам з тым, падкрэсліў Сяргей Сцяпашын, выкананне бюджэту Саюзнай дзяржавы патрабуе большай эфектыўнасці. «Калі з 21 бюджэтнай праграмы выконваецца толькі 12 — гэта дрэнна. Часам на ўзгадненне ведамствамі выканання праграм патрабавалася па два—тры гады», — заўважыў кіраўнік расійскага кантрольнага ведамства. «Таму мы прапануем ўнесці кіруючым органам Саюзнай дзяржавы прапанову аб увядзенні нормы аператыўнасці выканання саюзных праграм», — сказаў Сяргей Сцяпашын. Акрамя таго, Падліковая палата Расіі сумесна з КДК Беларусі маюць намер удзяліць увагу рабоце мытных органаў Саюзнай дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У бліжэйшыя дні магчыма сустрэча Прэзідэнтаў Беларусі і Расіі

У бліжэйшыя дні магчыма сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна. Аб гэтым паведаміў журналістам у Мінску Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў. «Не выключана магчымасць сустрэчы ў бліжэйшыя дні двух прэзідэнтаў. Што датычыцца кола пытанняў, то яны самі вырашаць, што абмяркоўваць», — сказаў ён.

У Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі магчымасць такой сустрэчы пацвердзілі.

Падліковая палата Расіі будзе садзейнічаць вяртанню ў Беларусь слуцкіх паясоў

Аб гэтым заявіў журналістам у Мінску старшыня Падліковай палаты Сяргей Сцяпашын.

Ён расказаў аб сваім наведванні Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі. Як вядома, слуцкія паясы — найвялікшая гістарычная і культурная каштоўнасць Беларусі — у музеі не захоўваюцца. У той жа час у Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве экспануецца больш як 20 слуцкіх паясоў і больш як 40 знаходзяцца ў запасніках. Сяргей Сцяпашын паабяцаў кіраўніцтву беларускага музея, што абмяркуе гэту праблему з кіраўніком Федэральнага агенцтва па культуры і кінематаграфіі Міхаілам Швыдкім і міністрам культуры РФ Аляксандрам Сакаловым.

На думку Сяргея Сцяпашына, трэба арганізаваць выстаўку слуцкіх паясоў у Беларусі і «падумаць пра магчымую іх арэнду». Паясы могуць пастаянна экспанавацца ў беларускім музеі.

БЕЛТА.

Спыніць выпадкі выплаты зарплаты ў канвертах

«МПЗ неабходна прыняць меры па спыненні парушэнняў парадку налічэння заработнай платы, выплаты падаткаў, асабліва з боку ПУП», — адзначыў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей СІДОРСКІ, выступаючы на калегіі Міністэрства па падатках і зборах.

Паводле слоў Сяргея Сідорскага, працэс пераходу ІП у ПУП у краіне ідзе складана. Многія ПУП ужо зарыентаваліся, як знізіць сумы падаткаў, якія выплачваюцца ў бюджэт, у тым ліку шляхам заніжэння ў дакументах памераў заработнай платы работнікаў. «Нам трэба не дапусціць, каб па дакументах заработныя платы былі ніжэйшыя за бюджэт пражыткавага мінімуму. Мы будзем рабіць усё, каб работа ПУП была празрыстая», — сказаў кіраўнік урада.

Аб'ём ценявога бізнэсу ў сферы паслуг будаўнічай галіны ацэньваецца ў некалькі мільярдаў долараў. Фінансавым ведамствам краіны неабходна прадумаць і рэалізаваць сістэму мераў па легалізацыі ценявога бізнэсу. Перш за ўсё гэта датычыцца незаконнай дзейнасці ў сферы будаўніцтва. У прыватнасці, як паведаміў Сяргей Сідорскі, спасылаючыся на даныя Камітэта дзяржкантролю, сёння да 80 працэнтаў работ па вырабу вокнаў ідзе нелегальна. Паслугі па аддзелцы кватэр таксама ажыццяўляюцца асобамі, якія не зарэгістраваны як прадпрымальнікі або юрыдычныя асобы. «Неабходна ўскрыць гэты бізнэс, легалізаваць яго», — падкрэсліў прэм'ер. Ён лічыць, што для гэтага неабходна на першым этапе мінімізаваць стаўкі падаткаў для грамадзян, якія ажыццяўляюць такую дзейнасць. У выніку ўсё гэта будзе садзейнічаць павелічэнню паступленняў у бюджэт краіны.

У Беларусі неабходна перагледзець дыферэнцыраваную шкалу ставак падаходнага падатку.

Паводле слоў кіраўніка ўрада, цяперашняя шкала ставак падаходнага падатку дзейнічае ўжо 8 гадоў. За гэты час адбыліся істотныя змены ў сістэме падаткаабкладання, павялічылася заработная плата ў краіне.

Акрамя таго, сёння ў Беларусі намецілася тэндэнцыя адтоку спецыялістаў рабочых спецыяльнасцяў, а таксама асобных катэгорый спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (хімікі, спецыялісты ў галіне высокіх тэхналогій і інш.) для работы за мяжой. Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў краіне неабходна стварыць такую сістэму заработнай платы, каб гэтым людзям было выгадна працаваць і зарабляць у Беларусі. Зрабіць гэта можна, у тым ліку шляхам перагляду асобных пытанняў падаткаабкладання.

У Беларусі неабходна навесці парадак з выплатай падаткаў пры рэалізацыі тавараў праз Інтэрнэт, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі.

Асаблівую ўвагу Сяргей Сідорскі звярнуў на неабходнасць прадаўжэння работы па спрашчэнні сістэмы бухгалтарскага ўліку, пераходу тут на новыя інфармацыйныя тэхналогіі, а таксама максімальна магчымай адмовы ад папяровага дакументаабароту.

«Стварайце мікраасяроддзе для развіцця бізнэсу ў малых і сярэдніх гарадах, каб не прадпрымальнікі хадзілі за чыноўнікамі, а наадварот», — сказаў ён. Сяргей Сідорскі адзначыў, што ўрадам для гэтага ў краіне праведзена вялікая работа, прыняты неабходныя нарматыўныя дакументы, прадастаўлены беспрэцэдэнтныя падатковыя льготы. «Але гэта адна трэць усёй неабходнай работы, дзве трэці — гэта работа на месцах», — падкрэсліў ён. На яго думку, рэзерваў у краіне для развіцця бізнэсу ў невялікіх гарадах дастаткова.

БЕЛТА.

Вёска Лобча Лунінецкага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Павялічваюцца БПМ, дзіцячыя дапамогі і «планка даплат» па адраснай сацыяльнай дапамозе

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў апараце Савета Міністраў, зацверджаны новы бюджэт пражыткавага мінімуму ў цэнах снежня. Такім чынам, з 1 лютага па 30 красавіка яго «сярэдні» памер будзе складаць 200 080 рублёў.

Пры гэтым, зазначылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, у сувязі са змяненнем бюджэту пражыткавага мінімуму, павялічваецца і крытэрый патрэбы для аказання адраснай сацыяльнай дапамогі. Права на штомесячную адрасную дапамогу будуць мець адзінокія грамадзяне і сем'і з даходамі менш за 200 080, а на аднаразовую адрасную сацыяльную дапамогу — з даходамі менш за 240 тыс. рублёў на чалавека.

Адначасова ўзрастуць і дзіцячыя дапамогі. У прыватнасці, як адзначыла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва, зараз аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці вызначана ў 1 млн 400 рублёў, аднаразовая дапамога пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — у 1 млн 400,5 тысячы рублёў, а штомесячная дапамога на дзіця ва ўзросце да 3 гадоў — у 160 060 рублёў.

Сяргей ГРЫБ.

Да 200-годдзя нацыянальнага драматурга

З наступнага панядзелка Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне сярэбраныя і медна-нікелевыя памятныя манеты «В. Дунін-Марцінкевіч. 200 гадоў», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Сярэбраная манета выпушчана наміналам 10 рублёў, пробай сплаву 925, масай 16,81, а медна-нікелевая — наміналам 1 рубель. Першая манета адчаканена якасцю «пруф», другая — «пруф-лайк». Тыраж сярэбранай і медна-нікелевай манет — па 3000 штук кожная.

Ігар ГРЫШЫН.

(Працяг тэмы на 3-й стар.)

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

Ну і стыхія!

ЦЁПЛА! ТОЛЬКІ Ў ПАНЯДЗЕЛАК СТАНЕ ХАЛАДНЕЙ, УНАЧЫ ДА МІНУС 9

Сёння ўдзень атмасферны фронт са Скандынавіі прынясе нам мокры снег і дождж, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Раніцай у суботу месцамі па Мінскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях магчымы парывы ветру да 15—18 м/с. Тэмпература паветра — 0—5 градусаў цяпла. У сталіцы чакаецца мокры снег і дождж, тэмпература паветра — 0 — плюс 2 градусы.

У нядзелю ўдзень амаль паўсюдна, а ўначы па поўдні краіны пройдзе мокры снег і дождж. Тэмпература паветра на працягу сутак ад 4 градусаў марозу да 2 цяпла.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, у першай палове лютага чакаецца адносна цёплае зімовае надвор'е, калі тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а ўдзень каля 0. Больш халоднымі чакаюцца толькі наступныя панядзелак і аўторак — 4—9 градусаў. У асобныя дні, галоўным чынам у Брэсцкай і Гомельскай абласцях, дзённая тэмпература павялічыцца да 4—5 градусаў цяпла.

У другой палове месяца чакаецца частае чаргаванне цёплага і халоднага надвор'я. На большасці тэрыторыі Беларусі будзе ісці снег, мокры снег, у перыяд адліг мокры снег з дажджом. Месцамі туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на захадзе — мінус 3 — плюс 2, на ўсходзе — ад 4 да 9 марозу. У самыя халодныя ночы пры праясненнях да мінус 10—11 градусаў. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да плюс 5 градусаў, у самыя халодныя дні — на 3—4 градусы ніжэй.

Сіноптыкі падлічылі, што сярэднямесячная тэмпература паветра ў лютым будзе прыкладна на 1 градус вышэй за норму, якая складае ад 3,5 да 8 градусаў марозу. Месячная норма ападкаў будзе ў межах нормы, што адпавядае 28—40 міліметрам.

Увогуле істотных маразоў у лютым сіноптыкі пакуль не прадказваюць.

Сяргей КУРКАЧ.

Як нас дураць

«ПЛАСТЫКАВЫЯ» ЗЛАДЗЕІ

У Мінску, Бабруйску і Жлобіне пацярпелі больш за 20 трымальнікаў пластыкавых банкаўскіх картак, якія сталі ахвярамі хітрых злачынцаў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, крымінальнікі абкрадвалі людзей выпадковым чынам — з дапамогай спецыяльнага прыстасавання, якое атрымала назву «ливанская пятля» — гэта капронавая нітка з металічнай скабой. Выкарыстоўваючы яе, прайдзісветы блакіравалі пластыкавыя карткі ў карткапрыёмніку банкамата і забіралі сабе «пластык». Пасля ім удавалася рознымі праўдамі і няпраўдамі атрымліваць да выкрадзеных картак пін-коды. Разумела, што апошняя аперацыя — зняць чужыя грошы з карт-рахунку — была прасцей простага.

Нахабнікі дзейнічалі па схеме, з якой, мяркуем, чытачам будзе карысна азнаёміцца, каб не стаць у будучым ахвярамі махляроў. Як высветлілася, адзін са злачынцаў прыстройваўся за спінай у свайго патэнцыйнага «кліента», і калі крэдытная картка, што блакіравалася «ливанскай пятлёй», не вярталася з карткапрыёмніка пацярпеламу, ён ахвотна прыходзіў на дапамогу — са, здавалася б, слушнай парадай: маўляў, неабходна зноў набраць пін-код. Калі прасцяк «купляўся», «дарадчык» бачыў і запамінаў код. А вось на той выпадак, калі трапляўся больш пільны чалавек, зламыснікі мянялі на банкаматах нумары кантактных тэлефонаў экстранных службаў банка на мабільныя нумары, якія былі зарэгістраваны на падстаўных асобаў і знаходзіліся ў іх у карыстанні. Зразумела, што звярнуўшыся па такім тэлефоне, уладальнікі пластыкавых картак, якія нібыта «праглынуў» банкамат, самі раскрывалі махлярам свой пін-код.

Паводле звестак Алега Слепчанкі, падобныя злачынствы рэгіструюцца ў нашай краіне ўпершыню. А што ж датычыцца аферыстаў, якія такім чынам дурылі людзей, то яны ўжо затрыманы супрацоўнікамі Упраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС сумесна з калегамі з УУС Магілёўскага аблвыканкама. Як высветлілася, у склад міжрэгіянальнай злачыннай групы, што спецыялізавалася на «пластыку», уваходзілі чатыры чалавекі. Акрамя таго, устаноўлена дачыненне затрыманых да ўчынення 23 падобных злачынстваў.

Не выключана, аднак, што пацярпелых нашмат болей, што, дарэчы, і павінна высветліць следства, якое працягваецца. Калі ж сярод нашых чытачоў таксама ёсць людзі, якія трапілі ў падобную «пастку», то іх просяць звярнуцца ва Упраўленне па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Беларусі тэлефонах у Мінску: 218 71 29 і 218 72 64.

Ігар ГРЫШЫН.

24 з выключэннямі

На слыху

Варта нагадаць, паводле новага Працоўнага кодэкса, у Беларусі тэрмін асноўнага водпуску вызначаны ў 24 каляндарныя дні. Разам з тым у гэтым правіле будуць свае выключэнні. Як паведаміла намеснік начальніка юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Маслоўская, пастановай урада ад 24 студзеня зацверджаны шэраг катэгорый работнікаў, асноўны водпуск якіх складзе большую працягласць.

Гаворка ідзе аб педагагічных работніках устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай, пачатковай, базавай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, сярэдняй адукацыі для дзяцей-інвалідаў, хворых дзяцей, работніках спецыяльных устаноў адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых, лячэбна-выхаваўчых, сацыяльна-педагагічных устаноў і арганізацый сацыяльнага абслугоўвання, санаторных дашкольных устаноў для хворых дзяцей, а таксама аб выратавальніках прафесійных аварыйна-выратавальных службаў, работніках-інвалідах, работніках ва ўзросце да 18 гадоў і работніках, якія занятыя ў зонах з правам на адсяленне, першачарговае і наступнае адсяленне ці эвакуацыі ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

У прыватнасці, адзначыла Валянціна Маслоўская, з улікам спецыфікі работы і працяглых летніх канікулаў педагагічным работнікам вызначаны водпуск у 56 каляндарных дзён. Менавіта такі адпачынак будзе прадастаўляцца ў агульнаадукацыйных установах, дапаможных школах, школах-інтэрнатах, цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, міжшкольных навучальна-вытворчых камбінатах працоўнага навучання і прафарыентацыі, цэнтрах дапрызыўнай падрыхтоўкі, установах, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых установах (дырэктарам, начальнікам ці загадчыкам, іх намеснікам па навучальнай, навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай, навучальна-вытворчай, выхаваўчай рабоце, па вытворчым навучанні, курсавой падрыхтоўцы, рабоце з замежнымі вучнямі, па спорце; загадчыкам філіялаў, інтэрнатаў агульнаадукацыйных устаноў, навучальна-кансультацыйных пунктаў, аддзяленняў, вытворчай практыкі, адасобленых падраздзяленняў вытворчага навучання, цэнтраў прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў і дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; начальнікам аддзелаў выхаваўчай работы з моладдзю, выкладчыкам, настаўнікам, настаўнікам-дэфектолагам, настаўнікам па спорце, кіраўнікам фізвыхавання, дапрызыўнай падрыхтоўкі, музыкальным кіраўнікам і трэнерам-выкладчыкам).

Права на водпуск у 56 каляндарных дзён маюць таксама асобныя катэгорыі супрацоўнікаў ВНУ (рэктары, першыя прарэктары, прарэктары па навучальнай, навуковай, выхаваўчай, лячэбнай (клінічнай), летняй рабоце, вячэрнім, завочным, вытворчым навучанні, загадчыкі падрыхтоўчых аддзяленняў, дырэктары, начальнікі ці загадчыкі структурных падраздзяленняў па асноўнай дзейнасці і іх намеснікі па асноўнай дзейнасці, загадчыкі дактарантуры, аспірантуры, ардынатуры, магістратуры, інтэрнатуры, навучальна-кансультацыйных пунктаў, дэканы і іх намеснікі, загадчыкі ці начальнікі кафедраў, прафесары, дацэнты, старшыя выкладчыкі, выкладчыкі, асістэнты, выкладчыкі-стажоры, кіраўнікі вытворчай практыкі, начальнікі і загадчыкі ўпраўленняў, аддзелаў па выхаваўчай рабоце з моладдзю і іх намеснікі, вучоныя сакратары), асобныя работнікі санаторных дашкольных устаноў ці груп для дзяцей, хворых на туберкулёз, санаторных дашкольных устаноў ці груп для дзяцей, што перанеслі анкагематалагічныя захворванні, спецыяльных дашкольных устаноў ці груп, дамоў дзіцяці (загадчыкі, намеснікі загадчыкаў па асноўнай дзейнасці, выхавальнікі-метадысты, выхавальнікі, кіраўнікі фізвыхавання, музычныя кіраўнікі, настаўнікі-дэфектолагі), асобныя катэгорыі работнікаў дзіцячых дамоў, дзіцячых сацыяльных прытулкаў, сацыяльна-педагагічных цэнтраў, навучальна-выхаваўчай установы «Рэспубліканскі цэнтр рэабілітацыі дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху (дырэктары, іх намеснікі па навучальнай, навучальна-выхаваўчай, навучальна-метадычнай, выхаваўчай рабоце, старшыя выхавальнікі, выхавальнікі, музычныя кіраўнікі, настаўнікі-дэфектолагі), работнікі дамоў-інтэрнатаў і спецыялізаваных устаноў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і работнікі дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў» Міністэрства працы і сацыяльнай абароны (выхавальнікі, педагогі-арганізатары, сацыяльныя педагогі, настаўнікі-дэфектолагі), асобныя катэгорыі работнікаў санаторных дашкольных устаноў ці груп для дзяцей, хворых на туберкулёз, і дзяцей, што перанеслі анкагематалагічныя захворванні, санаторных школ-інтэрнатаў для дзяцей з захворваннямі на туберкулёз і з рызыкай яго развіцця, спецыяльных устаноў адукацыі, сацыяльна-педагагічных, спецыяльных навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых устаноў (кіраўнікі гурткоў, клубаў па інтарэсах, калектываў аматарскіх аб'яднанняў, секцый, студый і г.д.), асобныя катэгорыі работнікаў дапаможных школ і школ-інтэрнатаў, цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, спецыяльных навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых устаноў (старшыя выхавальнікі і выхавальнікі). Апроч таго, водпуск у 56 каляндарных дзён маюць педагогі-псіхолагі, сацыяльныя педагогі, педагогі-арганізатары, старшыя медсёстры, майстры вытворчага навучання ва ўстановах адукацыі (за выключэннем устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, устаноў і падраздзяленняў, што забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў), а таксама трэнеры-выкладчыкі ў спецыялізаваных навучальна-спартыўных установах.

У той жа час, заўважыла Валянціна Маслоўская, шэраг катэгорый работнікаў адукацыі будзе карыстацца адпачынкам у 30 каляндарных дзён. Менавіта 30-дзённа вызначана для загадчыкаў, іх намеснікаў па асноўнай дзейнасці, выхавальнікаў-метадыстаў, выхавальнікаў, музычных кіраўнікоў і кіраўнікоў фізвыхавання ва ўстановах дашкольнай адукацыі (за выключэннем спецыяльных дашкольных устаноў і груп, санаторных дашкольных устаноў і груп для дзяцей, хворых на туберкулёз, і дзяцей, што перанеслі анкагематалагічныя захворванні); для загадчыкаў навучальна-метадычных кабінетаў і навучальных лабараторый ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых установах; для выхавальнікаў ва ўстановах, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі і ў ВНУ; для кіраўнікоў гурткоў, клубаў па інтарэсах, калектываў аматарскіх аб'яднанняў, секцый і студый ва ўстановах адукацыі (апроч санаторных дашкольных устаноў і груп для дзяцей, хворых на туберкулёз, і дзяцей, што перанеслі анкагематалагічныя захворванні, санаторных школ-інтэрнатаў для дзяцей з захворваннямі на туберкулёз і рызыкай яго развіцця, спецыяльных устаноў адукацыі, сацыяльна-педагагічных, спецыяльных навучальна-выхаваўчых і лячэбна-выхаваўчых устаноў, устаноў пазашкольнага выхавання і навучання), для канцэртмайстраў, акампаніятараў і метадыстаў ва ўстановах адукацыі (за выключэннем устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, устаноў і падраздзяленняў, што забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў).

Апроч таго, асноўны адпачынак працягласцю 30 каляндарных дзён вызначаны для работнікаў прафесійных аварыйна-выратавальных службаў, работнікаў, якія прызнаныя інвалідамі, і работнікаў ва ўзросце да 18 гадоў. Адначасова, зазначыла Валянціна Маслоўская, асноўны водпуск работнікаў, якія занятыя ў зоне з правам на адсяленне, складзе 37, а работнікаў, якія занятыя ў зонах эвакуацыі, першачарговага і наступнага адсялення ў выніку катастрофы на ЧАЭС, — 44 каляндарныя дні.

Сяргей ГРЫБ.

«БЕЛАВІЯ» ЎВОДЗІЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ТАРЫФЫ НА РЭЙСЫ З КАЛІНІНГРАДА І ВАРШАВЫ Ў ЕРЭВАН

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе кампаніі.

«Белавія» прапануе пасажырам ажыццяўляць палёты з Калінінграда і Варшавы ў Ерэван са стыкоўкай у Нацыянальным аэрапорце Мінск. На гэтыя напрамкі з 30 студзеня па 15 сакавіка будуць дзейнічаць спецыяльныя тарыфы. Палёт па напрамку Калінінград — Ерэван і назад для пасажыраў будзе каштаваць 280 еўра (без такс і збораў), а па напрамку Варшава — Ерэван і назад — 299 еўра (без такс і збораў). Палёты па спецыяльных тарыфах магчымы ў перыяд з 30 студзеня па 1 мая.

Напрыклад, па серадах самалёт па напрамку Калінінград — Мінск — Ерэван будзе вылятаць з Калінінграда ў 16.15 з прыбыццём у Мінск у 17.45 і прызямленнем у Ерэване ў 02.25.

ЦАНА НА ГАЗ ДЛЯ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГІМ КВАРТАЛЕ ПАВЯЛІЧЫЦЦА НЯЗНАЧНА

Аб гэтым паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў. Рост будзе нязначны, у межах 10 працэнтаў ад дзеючай сумы. Цяпер цана на расійскі газ складае $119 за тысячу кубаметраў.

БЕЛТА.

КУРСЫ ВАЛЮТ

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 195,97
1 латвійскі лат	4 580,80
1 літоўскі літ	925,59
1 чэшская крона	123,32
1 польскі злоты	887,48
1 расійскі рубель	88,04
1 украінская грыўня	425,01

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,4201
10 UAH	47,8825
1000 BYR	11,3483
EUR	36,3225

Курс у гандлёвых кампаніях (на 1.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

МІНТРАНС ПРАПАНУЕ ФАРСІРАВАЦЬ ПРЫНЯЦЦЕ ДАКУМЕНТА АБ АДМЕНЕ ФІКСАВАНЫХ ТАРЫФАЎ ЗА НАВУЧАННЕ Ў АЎТАШКОЛАХ

Аб гэтым паведаміў міністр транспарту і камунікацый Уладзімір Сасноўскі на пасяджэнні калегіі міністэрства.

Паводле яго слоў, органы ўнутраных спраў паказваюць на праблему, звязаную з пагаршэннем якасці падрыхтоўкі вадзіцеляў транспартных сродкаў у аўташколах. «Мы не падзяляем гэты пункт погляду ў поўнай меры, хоць залішняе рэгуляванне гэтага бізнэсу прывяло да таго, што аўташколы ў 2007 годзе сталі менш рэнтабельныя», — сказаў ён. Таму Мінтрансу трэба фарсіраваць дакумент па лібералізацыі ўмоў вядзення бізнэсу ў сферы падрыхтоўкі вадзіцеляў аўтатранспартных сродкаў. Цяпер з 420 дзеючых у Беларусі аўташкол амаль трэць мае нулявую рэнтабельнасць, а астатнія блізкія да гэтых паказчыкаў. Папярэдне гэты дакумент падтрыманы ў міністэрствах, Саўміне і Адміністрацыі Прэзідэнта.

БЕЛТА.

НА «ШЭЎРАЛЕ» — У ДЗІЦЯЧУЮ КАЛЯСКУ

Практычна ўвесь студзень супрацоўнікам ДАІ Гродзеншчыны з поспехам удавалася папярэджваць дзіцячы дарожна-транспартны траўматызм. Калі год таму за такі ж перыяд у аўтааварыях пацярпелі сем непаўналетніх, то на працягу 30 дзён студзеня — ніводны. А вось у апошні дзень месяца ў Ваўкавыску пацярпела сямімесячная дзяўчынка.

Сямейная пара прагульвалася па вячэрнім горадзе. Перад сабой бацькі кацілі каляску з дачкой. Калі ішлі па тратуары вуліцы С. Панковай, на яго выскачыў, трапіўшы ў занос, аўтамабіль. Машына правым крылом зачапіла каляску, з якой выкінула дзяўчынку. З траўмамі галавы немаўля давялося шпіталізаваць. Маці дзяўчынкі паспела заўважыць толькі прыкладную камбінацыю лічбаў рэгістрацыйнага знака аўтамабіля. Выехаўшы на праезную частку, ён знік у невядомым напрамку.

Пачаўшы пошук аўтамабіля і вадзіцеля, супрацоўнікі ДАІ ў адным з гаражоў знайшлі аўтамабіль «Шэўрале-Кавалер». Пашкоджанні і драпіны на ім пацвердзілі меркаванні аб дачыненні гэтай машыны да наезду. Пазбаўлены раней права кіравання юнак, які падазраецца ў наездзе і раней прыцягваўся да адказнасці за ўчыненае ДТЗ, адшукваецца.

Мікалай КАРАБАН, начальнік УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме проводят открытый аукцион

по продаже обращенного в доход государства гаража общ. пл. 520,4 кв.м, расположенного: Борисовский р-н, д. Углы. Начальная цена 148 000 000 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 04.03.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 2246134, (80177) 739327.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

У Беларусі спрашчаецца долевае будаўніцтва жылля

Адпаведны ўказ № 55 «Аб некаторых пытаннях долевага будаўніцтва» Прэзідэнт Беларусі падпісаў 31 студзеня.

Дакумент выдадзены ў мэтах удасканалення парадку долевага будаўніцтва шматкватэрных жылых дамоў і больш хуткага забеспячэння жыллём грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

У адпаведнасці з указам скарачаецца пералік дакументаў, неабходных для пачатку будаўніцтва. Акрамя таго, выключаюцца абавязацельствы па страхаванне будаўніцтва, якія павялічваюць кошт квадратнага метра жылля.

Прыбытак арганізацыі-забудоўшчыка пры будаўніцтве жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, вызначаецца ў памеры да 5 працэнтаў ад каштарыснай вартасці аб'екта. Гэта норма дасць магчымасць прыцягнуць дадатковыя інвестыцыі грамадзян і юрыдычных асобаў у долевае будаўніцтва. Такі падыход дазволіць рэгуляваць кошт будаўніцтва жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэтаму таксама будзе садзейнічаць прывязка фіксаванай цаны да статыстычных індэксаў змянення кошту будаўніча-мантажных работ.

Забудоўшчыку дазваляецца скасоўваць дагаворы з нядобрасумленнымі дольшчыкамі, якія не ўносяць плату за будаўнічыя работы або не даюць згоды на абгрунтаванае змяненне цаны аб'екта. Гэта дасць магчымасць ажыццяўляць своечасовае фінансаванне і будаўніцтва жылых дамоў, а таксама абароніць права добрасумленных дольшчыкаў на атрыманне жылля ў запланаваныя тэрміны. Будуць таксама зніжаны штрафы, якія накладаюцца на забудоўшчыкаў.

Юрыдычным асобам прадастаўляецца права на ўдзел у долевым будаўніцтве жылля без абмежаванняў, што дасць магчымасць ім будаваць кватэры для сваіх работнікаў, стварыць фонд службовага жылля для прыцягнення асабліва каштоўных спецыялістаў, аператыўна вырашаць пытанні развіцця вытворчасці і калектыву.

Указ таксама дазваляе перадачу месцаў агульнага карыстання асобе, упаўнаважанай мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, калі на момант уводу дома ў эксплуатацыю таварыства ўласнікаў не створана. Пры гэтым у дакуменце канкрэтызаваны парадак падрыхтоўкі неабходных для гэтага дакументаў, якія ўключаюць тэхнічны пашпарт на аб'ект будаўніцтва.

Указ у больш поўнай меры ўлічвае патрабаванні нарматыўных актаў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва з улікам нежылых памяшканняў і іншых элементаў, якія адносяцца да жылога дома ў адпаведнасці з зацверджаным праектам на яго будаўніцтва.

Для ўліку рэгіянальных асаблівасцяў будаўніцтва жылых дамоў долевым спосабам Тыпавы дагавор стварэння аб'екта долевага будаўніцтва заменены на Прыкладны.

Акрамя таго, указам уносяцца змяненні ў дадаткі да Прыкладнага дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва. У прыватнасці, дапоўнены паказчыкі характарыстык аб'екта, патрабаванні канчатковага разліку з дольшчыкам толькі па фактычнай плошчы, удакладнены парадак разліку затрат забудоўшчыка на будаўніцтва аб'екта долевага будаўніцтва і паслуг забудоўшчыка, не ўключаных у зводны каштарысны разлік кошту будаўніцтва і яго эксплуатацыі да перадачы дольшчыку. Для павышэння адказнасці забудоўшчыка за якасць будаўніцтва ў асобны дадатак да акта прыёмкі-перадачы аб'екта долевага будаўніцтва вынесены пералік заўваг па аб'екту долевага будаўніцтва з называннем тэрміну іх устаранення.

Такім чынам, прапанаваныя ва ўказе змяненні і дапаўненні даюць магчымасць, з аднаго боку, зацікавіць забудоўшчыкаў у развіцці долевага будаўніцтва жылля, а з другога — у поўнай меры забяспечыць інтарэсы грамадзян-дольшчыкаў.

Указ уступае ў сілу з дня апублікавання. Яго дзеянне распаўсюджваецца ў тым ліку на дагаворы стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва, заключаныя пасля ўступлення ў сілу ўказа ад 15 чэрвеня 2006 года № 396.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Адна з галоўных задач — паляпшэнне фінансавага становішча прадпрыемстваў

На выніковым пасяджэнні Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь міністр гандлю Аляксандр ІВАНКОЎ, паведаміў журналістам, што забастоўка польскіх мытнікаў на забеспячэнні беларускага рынку прадуктамі харчавання ніяк не адбілася.

— Беларускі рынак незалежны ад імпарту прадуктаў харчавання, — упэўніў Аляксандр Іванавіч. — 86 працэнтаў прадуктаў на рынку краіны — беларускай вытворчасці. Усіх тавараў, якія былі завезены раней, хапіла б яшчэ на 40 дзён. Мы згубілі толькі на транспартных паслугах. У хуткасці мы падлічым, колькі тады прад'явім прэтэнзіі палякам.

Міністэрства гандлю выканала і нават перавысіла ўсе прагнозныя паказчыкі за мінулы год. Так, тэмп росту рознічнага тавараабароту склаў 115,3 працэнта, бытавых паслуг насельніцтву — 121 працэнт, інвестыцый у асноўны капітал — 173 працэнты, у тым ліку за кошт замежных крэдытаў — 2,15 млн долараў ЗША.

— Галоўная задача нашага Міністэрства, — падкрэсліў Аляксандр Іванкоў, — арганізаваць, накарміць, апрануць і зрабіць гэта як мага лепей. Рост тавараабароту летась перавысіў рост вытворчасці тавараў амаль на 8 працэнтных пунктаў, на пакупку тавараў насельніцтва патрацілі 66 працэнтаў сваіх даходаў.

Асаблівую ўвагу міністэрства надало Дзяржаўнай праграме адраджэння і развіцця вёскі. На рэалізацыю праграмы затрачана 31,5 млрд рублёў. У выніку адкрыты 59 новых сельскіх комплексных прыёмных пунктаў, адрамантаваны 382 пункты. Жыхарам вёскі прадастаўлена 50 відаў новых паслуг. І, бадай, самым вялікім дасягненнем гандлёвай галіны стала ліквідацыя стратнасці арганізацый бытавога абслугоўвання, што дазволіла павялічыць плацяжы з прыбытку ў бюджэт на 37 працэнтаў. За мінулы год таксама было адкрыта 1279 новых гандлёвых аб'ектаў плошчай больш за 67 тысяч кв. метраў за кошт новага будаўніцтва і рэканструкцыі.

Адной з галоўных задач на 2008 год Аляксандр Іванкоў лічыць паляпшэнне фінансавага становішча прадпрыемстваў. Паводле даных міністэрства, 46—50 працэнтаў прадпрыемстваў не маюць уласных абаротных сродкаў, а таму для іх фактычна немагчыма перайсці на самафінансаванне.

Міністр таксама адзначыў, што сёлета перад галіной стаіць задача павялічыць тавараабарот на 13 працэнтаў. У гэтай сувязі Аляксандр Іванкоў заўважыў, што ў 2008 годзе тэмпы росту рэальных грашовых сродкаў даходаў насельніцтва будуць не такімі высокімі, як рост тавараабароту: эканоміка дазваляе іх павысіць на 8,5 працэнта. У гэтай сітуацыі стаіць задача дадаткова прыцягнуць у абарот 450 млрд беларускіх рублёў за кошт зберажэнняў грамадзян і развіцця продажу тавараў у крэдыт.

Міністр паабяцаў, што сёлета цяжкасцяў з пастаўкамі малака ў гандлёвыя сеткі Мінска не будзе, як гэта здарылася ў другой палове мінулага года. Міністэрства падтрымлівае ініцыятыву Мінсельгаспрада аб павелічэнні закупачных і адпускных цэнаў на прадукцыю жывёлагадоўлі. «Паколькі закупачныя і адпускныя цэны на гэту прадукцыю ў Беларусі ў 3—4 разы ніжэй, чым у суседніх краінах», — дадаў Аляксандр Іванкоў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ОАО «Барановичидрев»

уведомляет своих акционеров о проведении 5 марта 2008 года очередного общего собрания акционеров.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах работы Общества в 2007 году и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2008 год.
2. Рассмотрение бухгалтерского баланса и направлений использования нераспределенной прибыли за 2007 год. Утверждение порядка выплаты и размера дивидендов за 2007 год.
3. Установление норматива распределения нераспределенной прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2008 год и I квартал 2009 г.
4. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о деятельности в 2007 году.
5. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об увеличении уставного фонда Общества за счет источников собственных средств.
8. О внесении изменений в Устав Общества.
9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи в 2008 году.

Собрание состоится по адресу: г. Барановичи, пос. Восточный, 3, клуб ОАО «Барановичидрев». ***Начало в 14.00.***

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни в период с 25 февраля 2008 года с 9.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.30) в здании заводоуправления, кабинеты 9, 10, а в день проведения собрания — по месту проведения собрания с 13.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 13 часов до 13 часов 50 минут по месту проведения собрания при предъявлении документов, удостоверяющих личность.

УНН 200299909.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Ацясаву Аляксандру Ягоравічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.

Наўздагон

Усіх — на пяцідзёнку! І гімназістаў, і ліцэістаў!

Паклапаціцца аб пераходзе да 1 верасня 2008 года ўсіх тыпаў агульнаадукацыйных установ на пяцідзённы навучальны тыдзень павінны ўпраўленні адукацыі аблвыканкамаў і Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама — менавіта такі пункт утрымліваецца ў рэкамендацыях, прынятых па выніках прайшоўшай у студзені рэспубліканскай нарады, прысвечанай развіццю сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі (гл. «Звязду» за 18 і 22 студзеня.)

У сувязі з плануемым пераходам усіх навучальных устаноў на вучэбную пяцідзённу на Нацыянальны інстытут адукацыі, Акадэмію паслядыпломнай адукацыі і ўпраўленне агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі ўскладаецца задача ўнесці да 1 мая гэтага года неабходныя карэктывы ў адукацыйныя стандарты і вучэбныя праграмы, якія прадугледжвалі б устанаўленне міжпрадметных сувязяў, ліквідавалі складаны і другарадны матэрыял, а таксама празмерную тэрміналагічную насычанасць. Упраўленню агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі неабходна да 1 сакавіка распрацаваць і зацвердзіць тыпавы вучэбны план для ўсіх тыпаў агульнаадукацыйных устаноў, які б прадугледжваў арганізацыю навучальнага працэсу ў рэжыме 5-дзённага навучальнага тыдня.

Мясцовым органам кіравання адукацыяй даручана таксама забяспечваць пастаянны кантроль за захаваннем устаноўленых санэпідслужбай нарматываў вучэбнай нагрузкі і «дазіроўкай» хатніх заданняў. Яшчэ адзін важны накірунак — правядзенне неабходнай інфармацыйнай і прафарыентацыйнай работы сярод выпускнікоў для задавальнення патрэбаў эканомікі ў рабочых кадрах. У прыватнасці, пастаўлена задача забяспечыць у 2008 годзе прыём у навучальныя ўстановы прафтэхадукацыі не менш як 30 працэнтаў выпускнікоў базавай школы. І ў далейшым ажыццяўляць пастаянны кантроль за размеркаваннем патокаў выпускнікоў базавай школы з улікам іх жыццёвых планаў, магчымасцяў і патрэбаў рэгіёна.

Галоўнаму інфармацыйнаму аналітычнаму цэнтру Міністэрства адукацыі і ўпраўленню агульнай сярэдняй адукацыі даручана распрацаваць нарматыўны прававы дакумент, які б рэгуляваў ахову аўтарскіх правоў стваральнікаў электронных сродкаў навучання. Ёсць прыемная навіна і для педагогаў: мясцовым органам кіравання адукацыяй рэкамендавана мінімізаваць аб'ём статыстычных справаздач па выніках чвэрці (трыместра), навучальнага года, не дапускаць складання статыстычных справаздач, не прадугледжаных нарматыўнымі прававымі дакументамі, а таксама выключыць з практыкі работы правядзенне масавых маніторынгавых мерапрыемстваў і даследаванняў, не ўзгодненых з Міністэрствам адукацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Белая Русь» рыхтуецца да з'езду

16 лютага ў Мінску павінна прайсці пашыранае (з удзелам прадстаўнікоў усіх раённых арганізацый) пасяджэнне Рэспубліканскага савета Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Падчас пасяджэння павінна разглядацца пытанне аб скліканні першага з'езда аб'яднання. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік старшыні РГА «Белая Русь» дэпутат Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі, першы з'езд плануецца прызначыць прыкладна праз два месяцы пасля правядзення Рэспубліканскага савета. Таксама, паводле слоў Віктара Гумінскага, падчас лютаўскага пасяджэння Рэспубліканскага савета мяркуецца абмеркаваць праграму дзейнасці РГА «Белая Русь» і прыняць рашэнне аб вынясенні яе на разгляд з'езда. Павінна адбыцца абмеркаванне арганізацыі працы грамадскага аб'яднання «з улікам вопыту Гродзенскай абласной арганізацыі». Намеснік старшыні РГА паведаміў, што апошнім часам назіраецца павелічэнне колькасці членаў арганізацыі з ліку дэпутатаў усіх узроўняў. «У тым ліку і дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Ёсць нагода

...І мой сурок са мною!

Апошні месяц зімы — выдатная нагода задумацца пра вясну. Асабліва сёння. Нехта прыгадае, што католікі святкуюць Грамніцы, і знойдзе з гэтай нагоды парачку «беспамылковых» народных прымет, хтосьці іншы прыслухаецца да старажытнаславянскіх традыцый дня Лады, у які кароў выганяюць з хлява для прыгрэву, і сочаць: каля апоўдні сонца — да ранняй вясны, калі завіруха — уся масленіца такой будзе, калі вецер — да сырога года. Усе астатнія будуць узносіць пашаны і ўскладаць спадзяванні на звычайнага, не надта гераічнага грызуна, якому выпадае шанц пакрасавацца толькі раз на год. Да сурка, бо сёння — яго дзень.

Дзе было прыдумана гэтае свята, можна доўга спрачацца, але вось афіцыйна зацверджана яно ў ЗША і Канадзе, прычым адзначаецца з 1886 года. «Правільнага» амерыканскага сурка завуць Філ, і ён мае пастаянную прапіску — горад Панксутоні ў штаце Пенсільванія, які праславіўся, як ніколі, пасля выхаду на экраны аднайменнага фільма «Дзень сурка» з выдатным акцёрскім дуэтам Біла Мюрэя і Эндзі Макдауэл.

Штогод 2 лютага да сурка ў госці прыходзіць вялікая і прадстаўнічая дэлегацыя, плюс тысячы гледачоў — і ўсе пачціва просяць прадказаць, якой будзе вясна і ці хутка яна прыйдзе. Уласна кажучы, ад заспанага грызуна (а на зіму сурок упадае ў спячку) патрабуецца нямнога: вылезці з нары. Калі пры гэтым звярок «убачыць свой цень», г. зн. дзень будзе сонечны — яшчэ каля 6 тыдняў варта чакаць дрэннага і па-зімоваму халоднага надвор'я. Калі ж уласнага ценю сурок не спалохаецца (надвор'е воблачнае) і адразу назад у нару не палезе — ура, хутка вясна.

Першы прагноз Філа, як сведчаць гісторыкі, спраўдзіўся — ценю не ўбачыў, і вясна была ранняя. Але ўвогуле грызун да сваіх абавязкаў ставіцца халатна, і яго прагноз, паводле назіранняў за 100 гадоў, збываецца толькі ў 39 працэнтах выпадкаў.

У некаторых іншых краінах, дзе суркі не з'яўляюцца настолькі рэспаўсюджанымі, «барометрам» вясны служаць барсукі, мядзведзі або вожыкі — галоўнае, каб жывёла на зіму ўпадала ў спячку. Ва Украіне, напрыклад, 5 гадоў запар надвор'е прадказвае байбак Цімка, які за свае заслугі — прагнозы яго збываюцца гэтаксама прыкладна з 30-працэнтнай верагоднасцю — нават атрымаў прыжыццёвы «помнік» — кавалак злёгку апрацаванага палена.

Яшчэ адна даўняя традыцыя, якая пайшла з Еўропы — нямецкі абрад пад назвай Candelmas (ад слова «свечка»). Цырымонія прыпадала на сярэдзіну паміж першым днём зімы (ім лічылася 21 снежня) і першым днём вясны (21 сакавіка). Лічылася таксама, што ў гэты дзень адбылося рытуальнае ачышчэнне Марыі — 40 дзён пасля нараджэння Ісуса. Існавала павер'е, што калі Candlemas здарыцца сонечным, то вецер і холад затрымаюцца яшчэ на 6 тыдняў, а калі будзе ісці снег ці дождж, то астатнія зімнія дні будуць спакойнымі і яснымі. Паводле звычаю, святары ў гэты дзень бласлаўлялі свечкі і раздавалі іх людзям, каб у цёмныя зімовыя дні ў кожным доме было крыху святлей...

Што датычыцца Беларусі, то, напрыклад, у Мінскім заапарку суркоў няма — але затое ёсць вожык і мядзведзь. Менавіта ў іх і можна «пацікавіцца», калі дазволяць заатэхнікі, ці хутка нам чакаць вясны.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Нашчадкі вогненных вёсак: працяг тэмы

РОДАМ НЕ З ДЗЯЦІНСТВА, А З ВАЙНЫ...

Родам ён з вёскі Чорная Вірня Жлобінскага раёна. Спаленая нямецка-фашысцкімі акупантамі і адноўленая пасля вайны, вёска пазначана ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» разам з іншымі адроджанымі вёскамі на галінах сімвалічных Дрэў Памяці.

Леанід Іванавіч імкнецца рабіць усё магчымае, каб жыла памяць вайны.

Пра акцыю «Звязды» «Нашчадкі вогненных вёсак» (праводзіцца газетай сумесна з мемарыяльным комплексам «Хатынь»), якая была адзначана Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за 2007 год, Леанід Гірыловіч даведаўся з сюжэта, паказанага Першым нацыянальным тэлеканалам. Адразу патэлефанаваў і прыйшоў у рэдакцыю.



«У маёй роднай Чорнай Вірні на месцы хат засталіся коміны...» — гаворыць Леанід Іванавіч ГІРЫЛОВІЧ

— Вы пачыналі праект пры падтрымцы Мікалая Пятровіча Гірыловіча, якому ўдалося выжыць у знішчанай фашыстамі ў чэрвені 1944-га вёсцы Дальва Лагойскага раёна. Мікалай Пятровіч Гірыловіч пайшоў з жыцця. А ў «Звязду» прыйшоў Леанід Гірыловіч. Магчыма, мы далёкія сваякі...

Гэта пакаленне, у якога не было дзяцінства.

Пакаленне, у якім бадай што кожны можа сказаць пра сябе: «Я родам не з дзяцінства, а з вайны...».

* * *

— Трагедыя ў нашай вёсцы здарылася восенню 1943 года. Ужо пакапалі бульбу, склалі яе ў ямы... Мабыць, быў кастрычнік — чысло не помню, — уздыхае Леанід Іванавіч.

Старшы навуковы супрацоўнік мемарыяльнага комплексу «Хатынь» Ірына Напрэева ўдакладніла: гітлераўцы знішчылі вёску Чорная Вірня ў лістападзе 1943 года. Да вайны там было 177 хат, 962 жыхары. Вораг спаліў 112 хат, знішчыў 105 жыхароў...

* * *

Расказвае Леанід ГІРЫЛОВІЧ:

— Я нарадзіўся ў 1934 годзе, сястра Ларыса — у 1941-м. Бацька Іван Іосіфавіч да вайны працаваў трактарыстам у Хальчанскай МТС, маці — у калгасе. Вясной 1941 года бацьку забралі ў армію. Калі пачалася вайна, пры адступленні ён заехаў дахаты развітацца (ён быў кіроўцам бронемашыны). З вайны бацька не вярнуўся... Прыйшлі ў вёску немцы — пачалі ўсталёўваць сваю ўладу, вербавалі ў паліцыю людзей. І ў нас знайшлося некалькі адшчапенцаў, хаця большасць паліцаяў была з суседняй вёскі Баброўка. Для падпольнай работы было пакінута некалькі чалавек, але іх схапілі і расстралялі... Паступова набірала моц партызаншчына.

У 1943 годзе папаўзлі чуткі, што немцы пачалі адступаць. Усе былі рады. Немцы яшчэ летам рыхтавалі сабе лінію абароны. Якраз праз нашу вёску Чорная Вірня, а таксама праз Дзяніскавічы, Майскае, Малыя Казловічы... Немцы разам з паліцаямі прымушалі людзей капаць траншэі, акопы... Маці загадзя насушыла сухароў. Мала што можа здарыцца, а сухар у кішэні будзе: згрызеш, не памрэш з голаду...

Наступіла восень, канец кастрычніка, немцы адступалі і за сабой усе палілі. Ведаючы гэта, мы ўсе павыносілі з хаты. Куфар з вопраткай закапалі ў агародзе.

Міхаіл ГІРЫЛОВІЧ. Вена, 1945 г.

Аднойчы раніцай у вёску панаехала шмат немцаў. Каля нашай хаты паставілі машыны, гарматы... А ў гэты час маці наварыла бульбы ў мундзірах для хлеба, я абіраў.

— Бульбу — для хлеба?

— Так. Бульбу ачышчалі ад шалупіння, таўклі ў ступе. А ў драўлянай дзежцы пакідалі закваску пасля хлеба (пакідалі крыху цеста). Хлеб пяклі на тыдзень—два... Муку перамешвалі з тоўчанай бульбай, рабілі свойскія вясковыя булкі. Такі хлеб вельмі смачны, і ён захоўваецца доўга, не чарсцвее.

Немцы былі ў Чорнай Вірні, а ў суседняй вёсцы Шляхі, што за 3 км, ужо былі нашы. Раптам мы ўбачылі, што адтуль едуць на машыне савецкія салдаты — не ведаючы, што ў вёсцы вораг. Немцы як лупанулі па іх: машына ў кювет, усіх пабілі. Гэта было на маіх вачах: фашысцкая лінія абароны праходзіла непадалёк ад нашай хаты. Падрабязнасці гэтай гісторыі я даведаўся ўжо пасля вайны ад свайго дзядзькі Міхаіла Іванавіча Гірыловіча, камандзіра роты аўтаматчыкаў, якая ў той час якраз была ў Шляхах. Дарэчы, з вайны дзядзька вярнуўся сапраўдным героем, ён увесь час быў на перадавой. Сярод шматлікіх узнагарод — ордэн Аляксандра Неўскага, які прысуджаўся камандзірам толькі за асаблівыя заслугі. Ён, камандзір батальёна, вывеў людзей з акружэння без страт. Выйшаў пераможцам з сітуацыі безнадзейнай.

— Вось здымак: Вена, 1945 год. «На памяць Моці...». Хто гэта?

— Мая маці, Матрона Дзмітрыеўна...

— Наколькі я зразумела, жыхары Чорнай Вірні апынуліся літаральна паміж двух агнёў?

— Так, мы былі ў зоне абстрэлу... А раніцай наступнага дня немцы ўсіх людзей выганялі з хат. Нямоглыя, старыя, якія засталіся ў вёсцы, — усе былі знішчаны. Маці несла на руках 2-гадовую сястру. А мне 10 гадкоў, хлапчанё, нёс карзіну з сухарамі... Немцы гналі жыхароў Чорнай Вірні і Дзяніскавічаў. Куды? Ніхто не ведаў.

Раптам пачалося страшнае. Канвой знік — і на полі за вёскамі Майскае і Антонаўка людзей пачалі абстрэльваць. Паніка, крыкі, стогны, параненыя, забітыя... Маёй маці асколак прабіў цёплую хустку, але, на шчасце, не параніў.

Агонь прыпыніўся, з'явіўся нямецкі канвой, — жывых пагналі далей. Нямоглых, якія не маглі ісці, расстрэльвалі... А потым зноў абстрэл. Ад куль і снарадаў не было куды схавацца: голае поле, людзі як на далоні. У мяне шок, істэрыка. Кінуў карзіну з сухарамі і пабег да лесу. Бягу, спатыкаюся, падаю, зноў падымаюся, бягу, побач са мной выбухі, сыплюцца кулі... Дабягаю да лесу, а там немцы. Спужаўся і давай бегчы назад... Нас гналі больш як 80 км, ажно за Бабруйск. Зараз еду па гэтай дарозе і ўспамінаю: Божа мой, Божа...

— Калі вы вярнуліся ў родную вёску?

— У чэрвені 1944-га. Ішлі пешшу, ехалі на спадарожных машынах... А паабапал дарогі столькі забітых немцаў... Дабраліся да Чорнай Вірні, а хаты нашай няма — стаіць толькі комін ад печы. Як і замест дзесяткаў іншых хат...

Як гаравалі, цяжка нават успамінаць. Закапаная пад падлогай у хаце бульба абгарэла, з яе рабілі крухмал, так і харчаваліся. Хадзілі паўголымі, а потым страшэнная малярыя... Школа была знішчана, у адной з уцалелых хат арганізавалі заняткі. Не было ні паперы, ні алоўкаў, ні падручнікаў. Пісалі на паперы, якой упакоўвалі снарады. Чарніла рабілі з сажы і жалудоў. Так вучыліся пісаць першыя ў жыцці літары...

* * *

Усё жыццё Леанід Гірыловіч працаваў шчыра і сумленна, апошнія амаль тры дзесяцігоддзі, да выхаду на пенсію, — механікам на Мінскім маргарынавым заводзе. Выхаваў дзвюх дачок.

... Але вайна яго не адпускае. Ён імкнецца рабіць усё, каб жыла памяць вайны. Памяць людзей, забітых у 1943 годзе на тым страшным полі. Пасля вайны падлічылі: загінула там больш як 40 чалавек.

У лісце, накіраваным у Жлобінскі райвыканкам, Леанід Іванавіч Гірыловіч напісаў:

«Я лічу гэта месца святым — гэта ж гісторыя нашага пакалення! А з іншага боку, мы павінны належна выхоўваць пакаленні, якія ідуць за намі, — каб традыцыі патрыятызму, любові да Радзімы не перапыняліся».

Сакратар Майскага сельскага выканаўчага камітэта Жлобінскага раёна Наталля Крыпіневіч паведаміла, што ў жніўні 2007 года на месцы расстрэлу мірных жыхароў спецыялізаваны пошукавы ўзвод 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна правядзіў раскопкі, у ходзе якіх былі выяўлены астанкі двух мірных жыхароў (пасля вайны родныя астаткі загінулых забралі іх целы і пахавалі на могілках). У снежні 2007 года знойдзеныя астанкі былі перазахаваны, устаноўлены крыж і агароджа.

Намеснік старшыні Жлобінскага райвыканкама Віктар Касцяйкоў, да якога я звярнулася ў час падрыхтоўкі публікацыі, паведаміў, што гэту сітуацыю адміністрацыя раёна трымае на кантролі:

— Вы ж разумееце: зіма, надвор'е зусім не спрыяльнае для адкрыцця помнікаў, — патлумачыў Віктар Аляксеевіч. — Але пастараемся зрабіць усё магчымае, каб да Дня Перамогі помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, быў устаноўлены. Гэта наш доўг памяці.

* * *

Гэта наш доўг памяці...

Леанід Іванавіч Гірыловіч перакананы, што, акрамя слоў аб тым, што тут спяць вечным сном загінулыя ў Вялікую Айчынную вайну ад куль гітлераўцаў два невядомыя землякі, — на помніку абавязкова трэба пазначыць: «У лістападзе 1943 года на гэтым месцы нямецка-фашысцкімі акупантамі абстрэлана мірнае насельніцтва вёсак Чорная Вірня і Дзяніскавічы. Загінула больш за 40 чалавек».

Гэта наша гісторыя — трагічная і гераічная.

Гэта гісторыя і пакалення, у якога замест дзяцінства была вайна.

Таццяна ПАДАЛЯК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА і з архіва Л.І. ГІРЫЛОВІЧА.

ПАСТАНОВА САВЕТА БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ № 1

Аб развіцці атамнай энергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь

У мэтах развіцця атамнай энергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь Савет Бяспекі Рэспублікі Беларусь пастанаўляе:

1. Ажыццявіць будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь атамнай электрастанцыі (далей — АЭС) сумарнай электрычнай магутнасцю 2000 МВт з уводам у эксплуатацыю першага энергетычнага блока ў 2016 годзе, другога — у 2018 годзе.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечыць:

паведамленне ва ўстаноўленым парадку Міжнароднаму агенцтву па атамнай энергіі аб прынятым у Рэспубліцы Беларусь рашэнні па будаўніцтве АЭС;

сумесна з Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь вызначэнне схемы, а таксама крыніц фінансавання праекта будаўніцтва АЭС і да 1 студзеня 2009 г. далажыць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь;

сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі рэалізацыю Плана асноўных падрыхтоўчых работ, якія неабходна выканаць да пачатку будаўніцтва АЭС у Рэспубліцы Беларусь, і аб ходзе выканання далажыць Кіраўніку дзяржавы па выніках работы за 2008 год;

будаўніцтва АЭС у тэрміны, устаноўленыя пунктам 1 гэтай Пастановы.

3. Кантроль за выкананнем гэтай Пастановы ўскласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

31 студзеня 2008 г.
г. Мінск.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЫБУХІ Ў БАГДАДЗЕ: 72 ЗАГІНУЛІ, БОЛЬШ ЗА 100 ПАРАНЕНА

72 чалавекі загінулі і каля 100 атрымалі раненні ў выніку двух выбухаў, што прагрымелі ўчора на рынках Багдада.

Першы тэракт адбыўся на папулярным сярод іракцаў «птушыным рынку» Аль-Газль. Выбуховае прыстасаванне было схавана ў скрынцы з птушкамі. Другі выбух прагучаў на рынку гародніны. Нагадаем, у мінулым месяцы ў Іраку загінула 767 чалавек.

ЗША ВЫПРАБАВАЛІ НАЙМАГУТНЕЙШУЮ ЭЛЕКТРАМАГНІТНУЮ ПУШКУ

ВМС ЗША паведамілі, што на палігоне ў Штаце Вірджынія праведзена выпрабаванне самай магутнай у свеце электрамагнітнай пушкі. Дзякуючы гэтаму прыстасаванню снараду без парахавога зараду была прыдадзена хуткасць 9 тысяч км/гадз. За кошт высокай кінетычнай энергіі снарада быў разбураны стары бетонны бункер.

Хуткасць снарадаў, якія будуць выпускацца з новай зброі, у пяць разоў перавысіць хуткасць гуку. Снарад будзе набіраць такую хуткасць пры праходжанні праз магутнае электрамагнітнае поле. Мяркуецца, што далёкасць палёту снарадаў зможа дасягаць 400 км.

МУЖЧЫНЫ ПОМСЦЯЦЬ ЧАСЦЕЙ, ЧЫМ ЖАНЧЫНЫ

Згодна з вынікамі апытання, праведзенага жаночым часопісам Mini, трэць усіх апытаных людзей помсціць. Пры гэтым 70 працэнтаў не шкадуюць аб тым, што помсцілі і могуць зрабіць гэта зноў. Цікава, што насуперак распаўсюджанаму меркаванню, жанчыны помсцяць радзей за мужчын.

Згодна з апытаннем, пра помсту калі-нікалі думалі 55 жанчын і прыкладна столькі ж апытаных мужчын. Вось толькі ажыццявіць свае планы часцей выпала прадстаўнікам моцнай паловы чалавецтва: 21 працэнт мужчын супраць 18 працэнтаў рэспандэнтак. Асноўнай прычынай помсты для 28 працэнтаў жанчын з'яўляецца здрада другой паловы, у мужчын прагу да помсты здрада выклікае толькі ў 17 працэнтах выпадкаў. Сярод 26 працэнтаў рэспандэнтаў мужчынскага полу асноўнай прычынай помсты становіцца канфлікт на працы.

ДЗІЦЯЧЫ ЛОЖАК «ЛАЛІТА» ОСПРАВАКАВАЎ СКАНДАЛ У БРЫТАНІІ

Адзін з брытанскіх Інтэрнэт-магазінаў зняў з продажу дзіцячую мэблю з сэксуальна-афарбаванай назвай «Лаліта». Кампанію пратэстаў ініцыяваў бацькоўскі форум. Адміністрацыі магазіна давялося шукаць інфармацыю пра персанаж Набокава ў Вікіпедыі, пасля чаго яны прызналі сваю памылку.

ПАЛІЦЫЯ УЭЛЬСА ПРОСІЦЬ ДАРЭМНА НЕ ТУРБАВАЦЬ

Паліцыя Паўднёвага Уэльса заклікае брытанцаў устрымацца ад званкоў «не па адрасе». А такіх шмат: адна жанчына скардзілася праваахоўнікам, што ў яе няма дробязі, каб патэлефанаваць з аўтамата, другая — на свайго мужчыну, які не аддае пульт ад тэлевізара, трэцяя паведаміла, што яе каханы «выставіў любімага хамячка пад дождж».

Спорт-тайм

КУБАК ПЕРШАГА КАНАЛА — У КІЯЎЛЯН

У Ізраілі завяршыўся Кубак Першага канала. У фінале сустрэліся кіеўскае «Дынама» і данецкі «Шахцёр». Пераможцу выявіла толькі серыя пасляматчавых пенальці. Больш дакладнымі ў ёй аказаліся кіяўляне.

БЕЛАРУСКІ АБЫГРАЛІ ГРУЗІНАК І СЛАВЕНАК

Дзве перамогі атрымала жаночая зборная Беларусі па тэнісе ў Будапешце на старце Кубка федэрацыі ў першай групе Еўра-Афрыканскай зоны. 30 студзеня ў падгрупе «С» падапечныя Дзмітрыя Татура перамаглі зборную Грузіі — 3:0, а 31 студзеня — з аналагічным вынікам тэнісістак Славеніі. Заключную сустрэчу папярэдняга раўнда Беларусь сыграе са Швецыяй, якая таксама выйграла два першыя матчы. У наступны раўнд выходзіць пераможца групы.

ІГАР КРЫУШЭНКА ЗБОРАМ ЗАДАВОЛЕНЫ

Спарынгам з ульянаўскай «Волгай» сталічнае «Дынама» завяршыла праграму вучэбна-трэніровачнага збору ў Анталі. У Турцыі «беларблакітныя» правялі чатыры спарынгі, у двух з іх атрымалі перамогі (над маскоўскім «Лакаматывам» (2:1) і азербайджанскім «Карванам» (3:0)), з «Волгай» згулялі ўнічыю (1:1) і прайгралі маскоўскім аднаклубнікам (1:3).

Аднак на радзіме каманда прабудзе нядоўга. Ужо шостага лютага мінскія дынамаўцы накіруюцца зноў у Турцыю, дзе будуць працаваць на працягу двух тыдняў. Ігар Крыушэнка, падводзячы вынікі збору, адзначыў, што ён застаўся задаволеным і якасц

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 1 (23)

КАЛІНОЎСКІ. ПАЛЁТ У ВЕЧНАСЦЬ

У нас ёсць нацыянальны герой. Імя Кастуся Каліноўскага гісторыя неаднойчы імкнулася сцерці з памяці і наноў адраджала, але славуты змагар за чалавечы гонар беларусаў назаўсёды належыць сваёй Бацькаўшчыне.

170 гадоў таму ў Мастаўлянах на Гродзеншчыне нарадзіўся будучы кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання, рэдактар газеты «Мужыцкая праўда», аўтар крылатых слоў: «Не народ для ўрада, а ўрад для народа».

26 гадоў жыцця — (такога кароткага!) зрабілі Кастуся Каліноўскага асобаю, роўнай постацям такім як Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Якуб Колас, Алесь Гарун... Сёння, калі ідзеш па сталічнай вуліцы, названай у гонар нацыянальнага адраджэнца, у снег, дождж ці сонечны дзень, заўсёды адчуваеш у сабе непадробныя пачуцці гонару за зямлю і краіну, якія далі свету такую асобу.

Фота Вольгі ЛАСКІ.

№ 1.

MUŻYCKAJA PRAUDA.

Dziecinki!

Minuło uże toje, kali zdawało sia usim, szto mużyckaja ruka zdasce tolko da sachi.—ciepier nastau taki czas, szto my sami możem pisaci, i to pisaci takuju praudu sprawiedliwu jak Boh na niebi. O, zahremić nasza prauda i jak małanka pierelecić pa swieci! Niechaj paznajuć szto my możem nie tolko karmić swaim chlebom, no jeszcze i uczyć swajej mużyckoj praudy.

Pytali i pytajuć usie, szto czuwaci na swieci, chto nam biedym mużykam daść wolność? No praudu skazawszy mało chto chocze skazaci tak jak sumlenie każe—pa sprawiedliwości. My mużyki, braty waszyje, my wam budziem hawaryć celuju praudu, tolko słuchajcie nas!

Maskali, czynowniki i mnoho panou, budué pierepyniać pismo nasze da was; no najduć sia ludzie i z mużykou razumniejszyje i z panskaho rodu i z miasteczkowych, szto choczué waszej swabody, waszaho szczaścia,—jony to wam sami heto pismo dawaci budué, kab wy znali chto wasz pryjaciel, a chto wasz woroch.

Sześć let uże minuło jak packali hawaryć a swabodzie mużyckoj. Hawaryli, talkawali i pisali mnoho, a niczoh nie zrabili. A hety manifest szto Car z Senatom i z panami dla nas napisau, to taki durny, szto czort wiedaje da czeho jon padobny,—nijakoj u niom nienia praudy, niema z joho dla nas nijakoj karyści. Parabili Kancelaryi, zrabili sud, jakby heto nie usio rouno brać u sraku czy z sudom, czy bez suda. Parabili Pisarou, Pasredni-

У Мерачоўшчыну да Касцюшкі

прыедуць шматлікія прыхільнікі героя ў дзень народзінаў. 4 лютага ля памятнага валуна побач з адноўленай сядзібай героя трох кантынентаў пройдуць урачыстасці ў гонар яго памяці. У Івацэвіцкім раёне, як заўсёды, у гэты дзень збяруцца вучні з настаўнікамі, маставікі і дзеячы культуры, прадстаўнікі ўлады і грамадскасці. Сваю згоду на ўдзел у мерапрыемстве далі акрэдытаваныя на Беларусі дыпламаты ЗША, Францыі, Швейцарыі, Польшчы, Літвы, Украіны.

Адзначаць угодкі Тадэвуша Касцюшкі і на Жабінкаўшчыне, якая праўмерна таксама лічыць сябе радзімай знакамітага военачальніка, публіцыста, грамадскага дзеяча.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Да прэм'еры

У лютым грэюць кава і джаз

Так вырашылі ў беларускім Тэатры оперы, які 5 лютага запрашае на незвычайную прэм'еру спектакля «Бах... Кава... Джаз...»

Безумоўна, усё пачалося з Іагана Себасцьяна Баха, калі больш дакладна — з яго «Кававай кантаты». Але зрабіць з Баха нешта... сваё — такое магло прыйсці ў галаву вельмі неардынарнаму чалавеку. Такі ў нас ёсць, і яго імя — Міхаіл Леончык. Хто не чуў яго цымбалы, страціў вельмі многа. Але акрамя таго, малады, але ўжо вельмі вядомы, выдатны беларускі цымбаліст займаецца кампазіцыяй. Гэтаму ён навучаўся ў Германіі, і менавіта майстэрству джазавай кампазіцыі. І скарыстаў атрыманыя веды на практыцы — стаў «сааўтарам» самога Баха, стылізаваўшы яго музыку ў джазавай манеры і дадаўшы нешта ад сябе. Такім чынам мы адначасова зможам дакрануцца да дзвюх эпох — урачыстага барока і вольнага джазавага паветра сучаснасці.

Рэжысёр пастаноўкі Наталля Кузьмянкова пастараецца выкарыстаць гэты канфлікт, які закладзены музыкай. У аснову спектакля будзе пакладзены сямейны канфлікт, які разварочваецца з-за любові да кавы. Прычым, мы зможам убачыць, як гэты канфлікт мог бы выглядаць у розныя перыяды гісторыі — у часы Баха і ў XXI стагоддзі. Герояў розных эпох, зразумела, можна будзе вызначыць па касцюмах, якія прыдумала мастачка Кацярына Булгакава. Музычны кіраўнік і дырыжор Андрэй Іваноў і ўся яго каманда імкнуліся зрабіць маладзёжны па духу, арыгінальны спектакль, прэм'еру якога можна будзе ўбачыць на сцэне сталічнага Дома афіцэраў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

На зямлі Вінцэнта

Першы прафесійны драматург Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч паходзіць з Магілёўшчыны, вучыўся і працаваў у Санкт-Пецярбургу, яго літаратурным парнасам стала Міншчына. Сёння маляўнічыя куточкі ўздоўж крынічнай ракі Ілсач паміж Ракавам, Івянцом і Пяршаямі вабяць усё больш ахвотнікаў наведаць і гэтыя мястэчкі, дзе класік знаходзіў прататыпаў сваіх камедый, і вёску Малая Люцынка, дзе пражыў ён больш за сорак гадоў. І, зразумела, мясцінку Тупальшчына, каб пакласці васільковы букецік ля помніка пад шатамі дрэў парафіяльных могілак.

На жаль, і да 200-гадовага юбілею аўтара «Ідыліі», «Пінскай шляхты», «Люцынкі, або Шведы на Літве» не так шмат зроблена ў яго памяць. Некалі спалілі, а потым і спілавалі славутую ліпу Дуніна-Марцінкевіча, дагэтуль толькі на словах застаецца аднаўленне сядзібы ў Люцынцы. І ўсё ж мусіць тут зямля такая, што любы яе краявід — ці то сцежка ў жыце, ці вежы мястачковых храмаў — усё ўспрымаецца ў кантэксце лёсу і творчасці класіка нацыянальнай літаратуры, тэатральнага дзеяча і асветніка.

НА ФАТАЗДЫМКАХ: бюст Дуніну-Марцінкевічу на могілках у Тупальшчыне; святая крыніца ў Ракаве, якую, наведваючы мястэчка, не мог абмінуць славуты драматург; памятны знак у вёсцы Малая Люцынка — знакавым месцы на беларускай зямлі; ліпа Дуніна-Марцінкевіча, якую паспеў намаляваць мастак і дырэктар музея традыцыйнай культуры Івянца Алег Раманоўскі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Валожынскі раён.



Літаратурная анкета «Звязды»

«Беларускамоўныя творы ўсё ахвотней перакладаюцца на замежныя мовы...»

1. Што, на ваш погляд, можна назваць падзеяй у літаратурным жыцці краіны 2007 года?

Пераклад паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» на ўкраінскую мову. Гэтую перліну сусветнай літаратуры бліскуча перанёс у плынь сваёй роднай мовы таленавіты паэт і перакладчык Валер Стралко. Мае асабістыя ўражанні: пераклад папраўдзе конгеніяльны. Не згубілася ні крыхотка з багацюшчага тэксту і падтэксту паэмы, ні рыскі з адзінства лірычнага і эпічнага ў ёй — поўная сэнсавая і эстэтычная, стылёвая тоеснасць перакладу і арыгіналу; ашчадна захаваны, а таму й выяўны духоўны кантэкст паэмы — жарснае памкненне да волі, неспатольная прага быць гаспадаром свайго жыцця і плёну ўласных рук; аўтарская грамадзянская пазіцыя і душэўная шчырасць. Натхнёны пераствор узрушае як адкрыццё, што сведчыць пра неардынарнасць асобы перакладчыка, пра ягоны інтэлект, пра ягоную густоўную чуйнасць да вобраза і слова. Праца, вартая нашай самай шчырай удзячнасці і найвышэйшай дзяржаўнай узнагароды, бо гэта надзвычай важкі й каштоўны ўнёсак у культуру абодвух народаў, у агульначалавечую духоўнасць. Пагатоў, што Валер Стралко выдатна перакладае і vice-versa, з украінскай на беларускую, ён зайздросна валодае і нашай мовай.

2. Што з напісанага за гэты год вы абазначылі б як асабістая вяршыня?

Правакацыйнае пытанне. Мне складана ацэньваць уласны творчы рух, пагатоў нейкую вартасць сваіх літаратурных плёнаў: пішацца ж і нячаста, і нягуста. Магчыма, праз тое й стаўленне маё да ўласнай творчасці на некалькі градусаў халаднейшае, чым чытацкае. Што праўда, я ў стваранае ўкладаюся безагляднa, усёй поўняй пачуццёвага роздуму. І не мае значэння, пішу я эсэ, вянок санетаў ці вершы ў прозе...

3. Якой вам бачыцца будучыня беларускай літаратуры?

Няпроста разважаць пра будучыню беларускай літаратуры, калі бачыш, у якіх варунках вымушана самасцвярджацца беларушчына, адваёўваць сваё права жывога арганізма «расці, рунець і красавацца». Калі грамадства зрачэцца беларускай мовы, калі інструментам творчага ўжытку наступныя пакаленні абяруць нейкую іншую, не беларускую мову, то й самой беларускай дзяржавы не стане, не тое што літаратуры. Але я веру, што ўсё не так фатальна. Змагацца з культурай недарэчна: дух непераможны. Пагляньце, колькі асвечанай, адухоўленай, таленавітай моладзі сёння ёсць у родным «красным», што значыць, прыгожым пісьменстве! Максім Шчур, Ярына Дашына, Андрэй Хадановіч, Марыйка Мартысевіч, Аксана Спрынчан ды мноства іншых, пра каго я, напэўна, і не ведаю. А наўскід названыя імёны знаныя ўжо і ў Еўропе. Беларускай літаратурай цікавяцца блізкія і далейшыя суседзі па кантыненце, беларускамоўныя творы ўсё ахвотней перакладаюцца на замежныя мовы, беларускіх аўтараў пачалі вылучаць на Нобелеўскую прэмію. Веру, што неўзабаве мы абавязкова займеем свайго Нобелеўскага лаўрэата. Так што будучыня ў нашай літаратуры ёсць — гожая, годная, паўнавартасная.

Ніна МАЦЯШ,
лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова.

Уладзімір ЖБАНАЎ: «БЕЗ БОЛЮ ДАБРА НЕ БУДЗЕ»

Вось так... Пачынаеш з высокага, з вечных каштоўнасцяў і ідэалаў, а потым пайшло-паехала. Са скульптарам Жбанавым пачалі гутарыць аб элітарнасці мастацтва, лёсе сапраўднага творцы, перфомансах сённяшніх мастакоў-эксперыментатараў, якія ўводзяць у шок... А спыніліся на яго развагах аб жанчынах-гітарах, голых англічанах і ідэальных прапорцыях баскетбалістаў. Уладзімір Іванавіч ніяк не пагаджаўся, што сучаснае распутства ў сусветнай культуры нічога карыснага ў грамадства не прынясе. Карэспандэнт газеты не адступаў. Колькі б я ні размаўляў са спадаром Жбанавым, ніколі не здагадваўся, што ён прамовіць у наступную хвіліну. У адным толькі ўпэўніўся пасля інтэрв'ю — дабро ўсё роўна пераможа!

— Уладзімір Іванавіч, ну вось растлумачце мне адну толькі рэч: ёсць мастацтва, якое за стагоддзі стала ўжо прызнаным, але ёсць і сучасныя, мне, напрыклад, месцамі зусім не зразумелыя формы, калі не памыляюся, постмадэрнізму. Дзе «сапраўдная» творчасць, а дзе «падробка»?

— Часам становішся сведкам такой гутаркі: адзін мастак не так крывёю ці чымсьці там яшчэ напісаў карціну, іншы няправільна жанчыну голую зрабіў. А ён так бачыць, так уяўляе! Хто дазволіў сцвярджаць, што правільна, а што не? Я не супраць цэнзуры. Яна павінна быць. Раней праходзілі выставы, дык там яна настолькі жорсткай была, што трапіць творам мастацтва было праблемай. Потым час памяняўся, і зноў жа ўзнікла недарэчнасць — увесь бруд, парнаграфія імгненна паліліся на людзей. Гэта заўважылі, і добра, што ў апошнія гады стварылі спецыяльную камісію. І ўсё роўна, у творчага чалавека ёсць амбіцыі, і часам з-за іх ён пачынае літаральна «несці» абы што. І кажа пры гэтым: «Я маю права выказацца». І вось калі такіх людзей не спыніць, то адна лыжка дзёгцю можа цэлую бочку мёду сапсаваць. І не заўсёды творца можа быць вінаваты. Ёсць і яшчэ адзін бок медаля — калі мы мастацтва навязваем чалавеку, або калі запрашаем гледача зазірнуць у глыбіню твора. Мастацтва належыць народу, гэта так, але калі па ўсіх радыёканалах гучыць адзін толькі рок, чалавек будзе жадаць слухаць джаз. Любая, буйная, выстаўленая на ўсеагульны агляд скульптура, карціна, плакат, музычны твор, дызайнерская рэч, пісьменніцкая работа павінна ўлічваць людзьмі з розных пунктаў гледжання. Таму ёсць і сатыра, і гумар, калі хочаце — прыкол.

— А вы які шлях выбіраеце?

— У мастака ёсць два варыянты. Спачатку трэба ведаць, як людзі ўспрымаюць твой твор, а потым ужо вырашаць, што з гэтага рабіць. Ці ісці па пракладзеным іншымі шляху, ці прасоўвацца ў авангардзе, весці за сабой натоўп. Я за тое, каб весці за сабой людзей. Але пры гэтым трэба тлумачыць, праводзіць лікбез. Мастацтва павінна выхоўваць, а не проста задавальняць, у некаторых краінах у пачатковай школе дзеці ўжо ведаюць да 300 адценняў колераў. Колькі іх ведае наш дарослы чалавек? Пры тым, што такое ж самае адбываецца і ў элітарным мастацтве. Возьмем меладычнага Чайкоўскага — яго музыку з задавальненнем будзе слухаць нават непадрыхтаваны чалавек. А Мусаргскага зразумее хутчэй прафесіянал, пры тым, што абодва кампазітары — геніі.

— А што наконт крытыкі ў ваш бок?

— Прызнацца, на фоне агульнага ўхвалення я атрымаў шмат крытыкі. Нават былі званкі па тэлефоне, і калі б не мая цікаўнасць, я трубку не здымаў бы. Пакуль да канца не разбяруся, камяк у горле будзе стаяць. Быў смешны выпадак пасля таго, як на Камароўцы паставілі маю скульптуру Каня. У гэты час нечакана ўдарылі дажджы, была высокая вільготнасць, і Конь стаў зялёны, як елка. Ну, наступным днём, раніцай, я з калегам прыехаў на месца, узяў воск, растваральнік. Апранулі халаты рабочыя і пачалі ачышчаць. І тут падыходзіць дама, «уся з сябе», узрост бальзакаўскі, манеры арыстакратыкі. У руцэ недаедзены чабурэк. І так, з інтанацыяй напалову пранонсу, напалову жаргону, пытаецца: «А дзе аўтар гэтай работы?». Я ў халаце, прыкідваюся валёнкам, і кажу так, з прыдыханнем: «Стварае». Яна: «Я хацела б спытаць у яго, дзе Захад? Дзе вытанчанасць Еўропы? І ўвогуле, колькі яшчэ мы будзем плясціся ў хвасце». Я пытаюся: «Пра што вы пытаецеся ўвогуле?». Яна: «Ды ўвогуле, пра ўсё навакольнае». «А конь тут пры чым?» — не разумею. «Дык хіба ж гэта конь»... Іншае было меркаванне: якога чорта я ўляпіў у сучасны горад скульптуры розных часоў? Я ў Санкт-Пецярбургу, у калысцы сусветнага мастацтва, у цэнтральным скверы каля Неўскага праспекта бачыў помнік жандару.

— Ну, там не толькі яму помнік стаіць...

— Так, але я не пра тое. Усе прызвычаіліся, што, напрыклад, калі ваенны, дык абавязкова яму буцэльку ў выглядзе аўтамата дарыць трэба. Я з вялікай павагай стаўлюся да народнай творчасці, але калі кожны год, пастаянна, ведаеш, што на канцэрце спачатку будзе гармонік, а потым — цымбалы, дык да антракту хочацца сядзець не ў зале, а ў буфеце. А зрабілі б... Бац, Хлястоў у парваных джынсах. Гэтаксама я стаўлюся да таго, што з'яўляецца ў гарадскім асяроддзі. Ідзеш і бачыш — дзяўчына дзевятнаццатага веку, фатограф мінулай эпохі. Дарэчы, а якога росту дзяўчына з парасонам?

— Ммм... ну, метр семдзесят, наколькі ўяўляю...

— Крыху вышэйшая. Але ў яе ўзросце не бывае такога росту. У памяшканні мы бачым адзін памер, на вуліцы, у прасторы — зусім іншы. На гэта я звярнуў увагу, калі быў яшчэ зусім юнаком. Аднойчы па вуліцы ішла дзяўчына. Здалёк яна здавалася метры два ростам, доўгія ногі, тонкая талія, маленькая галава. Калі ж падышла бліжэй, то аказалася ніжэйшай за мяне, пад рукой праходзіла. Гэта і ёсць прапорцыі. Па грэчаскай навуцы выяўлення, ідэальны рост складае восем з паловай галоў чалавека. Такога — не бывае! Рост чалавека ніжэй, ён вымяраецца ў сем з паловай яго галоў. Таксама і ў коней. Толькі ў Аўстраліі ёсць рэдкая парода, якая ў даўжыню больш, чым звычайныя, а ў холцы дасягае двух метраў. А вышыня сярэдняга каня паўтара метра. Галава чалавека не расце, яна застаецца адноль кавай, тады як тулава, канечнасці выцягваюцца. Таму высокі чалавек прыбліжаны да ідэалу. Але і ідэалу не існуе, не нарадзіўся яшчэ такі чалавек, ну, можа быць, толькі зоркі сусветнага баскетболу. Тым больш, што прапорцыі прыдуманы людзьмі. І для кожнай цывілізацыі яны розныя. На якім-небудзь востраве Сурынам ідэальны чалавек будзе не вышэйшы за паўтара метра.



Дык вось да чаго я гэта вяду. Справа ў тым, што мастакі маніпулююць людзьмі пры дапамозе прапорцый. Возьмем жанчын пышных формаў у Рубенса і Кустодзіева... Творцы як бы знайшлі свой шарм, сваю прыгажосць. Яны прымусілі людзей звярнуць увагу: пышныя жанчыны — гэта не так ужо і дрэнна! Аднак мода падобная знікла хутка, таму што ўсё роўна ў чалавека спрацоўвае абаронча механізм на ўсялякія адхіленні. Я аднойчы пазнаёміўся з дамай, музыкантам. Яна была такая, няхай прабачыць, вялікая, што напрошваюцца нядобрыя параўнанні... Кустодзіеў адпачывае... І калі мы ішлі з ёю ўздоўж шашы, не паверыш, аўтамабілі, прычым дарагія, кожную хвіліну спыняліся і запрашалі яе падвезці. Я спачатку думаў — знаёмыя. А яна растлумачыла, што ўжо стамілася ад маньякаў, для якіх такія жанчыны — экзотыка. Фактычна я, як творца, сутыкнуўся і з іншым, калі людзі падыгрываюць вобразу вельмі тонкіх жанчын, і адмыслова, усімі магчымасцямі намагаюцца быць падобнымі на ўзор.

— І... Які вынік?

— А такі, што мастацтва з'яўляецца вельмі дзейсным рэгулятарам, якое можа пераканаваць людзей у нечым. Адна справа — што кажуць урачы, і іншае — калі мастак усхваляе прыгажосць так, як ён яе разумее.

— А вы? Прызнавайцеся, які тып жанчын падабаецца вам...

— Мне больш імпануюць вобразы 60—70-х гадоў мінулага стагоддзя. Мэрылін Манро, Клаўдзія Кардынале. Падабаецца жаночая фігура, нібыта як форма ў гітары — пышны верх, тонкая талія, і зноў як у гітары. Уласна кажучы, гэты музычны інструмент з'явіўся з-за такой выявы дамскага торса...

— Задаю традыцыйнае пытанне — што новага ствараеце зараз? Толькі так — у кантэксце нашай размовы, пра «сапраўднае» і «несапраўднае» мастацтва...

— Да мяне не так даўно звярнулася кіраўніцтва Баранавічаў з ідэяй стварэння скульптуры дворнічыхі. У іх гарадзе працавала жанчына, якая прысвяціла ўборцы тэрыторыі ўсё жыццё, і вельмі ганарылася сваёй работай. Трэба было стварыць не канкрэтнага чалавека, а вобраз. Сапраўдны ж нарадзіўся, калі я прыйшоў да разумення і ўсведамлення сутнасці работы і характару жанчыны. Гэта была Папялушка. Яна шмат працавала, яе працу эксплуатавалі, яна марыла аб лепшым, і лёс падарыў ёй прынца. Таму я паказаў Папялушку з мятлой і з туфлікам. Зразумела, не так даслоўна, як у казцы Шарля Перо. Але я «зарадзіў» скульптуру правільным вобразам, і стала добра на душы.

Яшчэ адна работа — млын, скульптурны ансамбль, які будзе знаходзіцца ў Партызанскім раёне сталіцы. Мала таго, што пад млыном чалавек можа прайсці, увесь яго воблік стварае момант нечаканасці. А гэта вельмі важна ў мастацтве. Гэта як ты будзеш ісці па вуліцы, і раптам — лятаючая талерка прызямліцца.

— Дык у вас у творчасці момант нечаканасці, які вы выстаўляеце на агульны разгляд — казачны млын, а ў некаторых — голыя часткі тулава, прычым усе — ніжэй за пояс. Розніца, ведаеце, адчувальная...

— Я чытаў аб адной выставе ў Англіі, дзе два мастакі ўзялі ў арэнду вялікі дом, ўсе пакоі якога былі абсалютна пустымі. І толькі ў адным была разнастайнасць — там стаялі самі мастакі, без адзення, адзін насупраць другога. Наведвальнікі прыйшлі на выставу і нічога не разумеюць — знаходзяць толькі пустыя сцены і пакоі. І раптам уваходзяць у адну з залаў і бачаць голых людзей...

— Мне так падаецца, што гэта яшчэ адзін адносна сумленны спосаб адабрання грошай у даверлівых грамадзян...

— А вось невядома! Я так не лічу. Я не думаю, што ўсялякія спосабы зрабіць нешта новае, незвычайнае, нестандартным, нелагічным спосабам праходзяць дарэмна. Большасць авангардыстаў хочуць прыцягнуць да сябе ўвагу тым, што робяць рэчы, якія да іх ніхто не рабіў спробу стварыць.

— І што далей?

— А нічога. Ёсць такое заданне — сядзіць пасярэдзіне натуршчык, з галавы да пятак захутаны ў футра, а студыйцы, якія яго малююць, аголеныя ўсе як адзін. Ім такую задачу паставіў выкладчык. І гэта таксама момант нечаканасці. Але калі творцы будуць яго навязваць навакольным, то гэта прывядзе да сур'ёзных, нечаканых наступстваў. Сярод людзей пачнуцца бойкі, забойствы... Таму трэба ствараць такім авангардыстам умовы для самавыяўлення — рабіць іх выставы ў прыватных установах, абмяжоўваць падыход. Калі ж проста забараняць, то нічога карыснага не атрымаецца. Возьмем парнаграфію — колькі ні забаранялі, яна выклікала яшчэ большую цікаўнасць. А сёння, калі яна існуе ў агульным, неабмежаваным доступе, праз прыватныя тэлеканалы, Інтэрнэт, людзям стала сумна.

— А як жа дзеці?

— Мараль у тым, што не забараняць трэба, а тлумачыць дзіцяці: «Ты ж не будзеш пальцы ў разетку засоўваць, таму што будзе балюча». Так і душы павінна быць балюча, калі перагортваць старонкі, якія з-за ўзросту рана глядзець. Мастацтва — гэта зброя, якая б'е па галаве часам мацней, чым куля ў нагу. Гэта ўсім вядомы пастулат. Таму і казаў я, што з пачатковай школы трэба вучыцца разумець мастацтва. Вось паглядзіце на хіпі, якіх у мае часы амаль ці не забівалі. Зараз яны выглядаюць маленькімі, жаласнымі немаўлятамі, на фоне агульнай распусты. Хоць я не супраць!

— Уладзімір Іванавіч, вы не супраць распуснасці?!

— Так, я не супраць любога распуцтва і ўвогуле ўсяго, што дзеецца зараз у свеце. Растлумачу пазіцыю. Усе мы бачым, што ў сучаснага чалавецтва маральныя цэнзы адсутнічаюць, застаюцца толькі жаданні. Таму невыпадкова не спыняецца барацьба Мефістофеля і Бога. Адзін спакушае людзей, другі іх выратоўвае. Дык вось, без пустазелля, без болю дабра не будзе. Таму ва ўрадлівую глебу і заносяць гной. Я ведаю, што ўсе гадасці, якія здзяйсняюцца сёння ў свеце, толькі падштурхоўваюць людзей. Адных — правалiцца яшчэ ніжэй, іншых — узнесціся на большую вышыню. Для гэтага і існуе ў чалавека розум, каб стрымліваць замахі зла, і ў самім сабе перш за ўсё. Так, можна навыдумляць такі садом, што ай-яй-яй! Але калі ўявіць, да чаго ён прывядзе, то заўсёды спынішся. Чалавек нашпігаваны ўсім, ды я і не сумняваюся, што кожны з нас у думках быў хітруном, зладзеем, вампірам... Прадаўшчыца ў краме памылілася з рэштай — пайшоў далей, прадаў нешта, ведаючы, што яно не працуе — ну і што? Добра, калі гэта мабільнік, а калі аўтамабіль, які праз тры дні трапіць у аварыю? І яшчэ я перакананы, што зло, якое сядзіць, абавязкова накрые злых людзей, як бумеранг.

— Рабіць што-небудзь трэба, каб дабро перамагло?

— Зноў жа, з боку мастацтва, я ніколі не буду прапагандаваць бруд, распуснасць. Калі бачыш, навошта яшчэ і ўвекавечваць, падтрымліваць зло. Яно ж і так трымаецца таму, што яго немагчыма знішчыць.

Аднак трэба з разуменнем ставіцца і да творцы, які можа нестандартным шляхам праяўляць сябе. Калі ж ставіць сваёй мэтай павылузвацца, то так, чалавек «праскочыць», атрымае нейкую папулярнасць.

Дзмітрый АЛЬФЕР,
фота аўтара.

Выставы

Графік-мантажнік

Выстава графікі Паўла Іванова, які працуе мантажнікам па аддзелачных работах балконаў, прадстаўлена ў віцебскім Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа. Выстава «Жыццё ў квадраце» — сапраўднае адкрыццё маладога таленту.

Як паведамілі «Звяздзе» ў тэатры, наогул мастацкай выставы тут не было даўно. І, вядома ж, не кожнаму мастаку будзе дадзена дабро на прэзентацыю сваіх карцін.

Павел Іваноў сябруе з маладымі артыстамі тэатра: Цімурам Жусупавым, Паўлам Давыдоўскім, Арцёмам Бародзічам, якія папрасілі кіраўніцтва пайсці насустрач. Дарэчы, аўтар выставы вельмі здзівіў адказных супрацоўнікаў тэатра тым, што самастойна афарміў і павесіў работы. Таксама пакарыў сваёй шчырасцю і сціпласцю. А яшчэ не часта ўбачыш бігграфію мастака, зробленую ў выглядзе графічнай работы.

«Квадрат» асацыюецца ў віцябчан з забудовай дамоў па праспекце Чарняхоўскага. А яшчэ, напэўна, мастак бачыць сваё жыццё ў свеце — «у квадраце».

Творы «Чорнае малако», «Квадратура круга», «Сіняя птушка», «Чалавек і закон» і іншыя — філасофскі роздум маладога чалавека пра сучаснасць. Адразу адчуваецца яго нестандартны погляд і жаданне падзяліцца сваімі думкамі з сучаснікамі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ці атрымае «Спадчына» вышэйшую ўзнагароду?

Нацыянальны Мастацкі музей Беларусі правёў незвычайную акцыю — выстаўку аднаго вечара. Тут як ніколі раней сабраліся шмат фатографаў, журналістаў, тэлеаператараў, мастакоў і выдаўцоў кніг. Віноўнікам падзеі стаў новы фотаальбом журналістаў Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Аляксеева і Алега Лукашэвіча «Спадчына Беларусі. Скарбы». Як вядома, іх папярэдні альбом перавыдаваўся восем разоў і быў удастоены вышэйшай узнагароды ў кнігавыдавецкай справе — Дыпломам Францыска Скарыны. Новы альбом не саступае свайму папярэдніку ні па якасці, ні па змесце, ні па мастацкім афармленні. Лепшыя творы ювелірнага мастацтва і мастацкага металу, якія з'яўляюцца нацыянальнай спадчынай, знайшлі адлюстраванне на старонках фаліянта.



Фота Вольгі ЛАСКІ.

Краіна здароўя

Выпуск № 5 (61)

А на мой погляд...

Ад пагрозы выратуюць правілы бяспекі. Ці ўсе мы іх выконваем?

Як нядаўна паведамлялася, дзеля прадухілення траўматызму пасажыраў усе беларускія цягнікі аснашчаны спецыяльнымі рамянямі бяспекі, якімі могуць карыстацца найперш тыя з іх, хто набывае білеты на верхнія паліцы вагонаў.

Якія мерапрыемствы, захады, скіраваныя на забеспячэнне для нас з вамі бяспекі, вы лічыце найбольш актуальнымі і патрэбнымі? Што яшчэ, на ваш погляд, можна было б зрабіць у гэтым накірунку?

Віктар ДЭЙКА, дырэктар СВК «Вішнявецкі» Стаўбцоўскага раёна:

— Калі гаварыць пра нашу сельскую мясцовасць, тут, напэўна, дзве галоўныя праблемы: асвятленне вуліц у цёмны час сутак і расчыстка дарог у зімовы перыяд. Калі гаварыць пра першае, лічу, што асвятленне недастатковае. Бяспеку ў цёмны час забяспечвае нашэнне святлоадбівальных элементаў — гэта сапраўды вялікая справа. Усе нашы работнікі маюць рабочае спецадзенне з такімі святлоадбівальнымі элементамі. Асобная тэма — гужавы транспарт. У гаспадарцы ўсе конныя павозкі абсталяваныя імі.

Зразумела, можна прыгадаць тэхніку бяспекі. Напрыклад, усе рухомыя часткі механізмаў і агрэгатаў маюць агароджу і г.д. Увогуле гэта цэлая навука і пра яе можна расказваць доўга.

Сяргей ГОЦМАНАЎ, начальнік Чачэрскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях:

— Ведаеце, калі ўдумацца, пагроза ў выніку незахавання правілаў бяспекі можа быць паўсюдна. Я скажу толькі пра найбольш актуальную для нас на сёння праблему — стан пячнога ацяплення ў зімовы час. Як ты печ ні даглядай, праз нейкі час усё роўна трэба рабіць новую. А каштавала яна нядаўна — з матэрыяламі, з працай — больш за тры мільёны рублёў. Зразумела, што адзінокім пенсіянерам такіх грошай браць няма дзе. Якраз цяпер у вобласці праходзіць месячнік пажарнай бяспекі, найбольшую ўвагу мы надаём менавіта такім катэгорыям грамадзян, каб потым выйсці з прапановамі аб выдзяленні грашовых сродкаў з боку мясцовых органаў улады для рамонту. Электраправодка... У некаторых дамах ёй па 30—40 гадоў, і вельмі рэдка бывае, каб малазабяспечаныя сем'і былі ў стане самастойна цалкам яе замяніць. Тут таксама патрэбна ўвага і дапамога, у тым ліку і з боку зноў жа мясцовых органаў улады. З аўтаномнымі пажарнымі апавяшчальнікамі асабліва праблем няма — яны каштуюць усяго 15—16 тысяч рублёў.

Што яшчэ сказаць? Прымаюцца меры па забеспячэнні бяспекі дарожнага руху, цяпер, напрыклад, праходзіць месячнік язды з уключанымі фарамі. Выкарыстанню рамянёў бяспекі надаецца ўвага, прафілактыцы сярод пешаходаў. Калі гаварыць пра бытавы ўзровень, дык бяспека тых жа сучасных тэлевізараў нам гарантавана ўжо на ўзроўні іх вытворчасці.

Ганна ЧАРНУШЭНКАВА, пенсіянерка, г. Мінск:

— Вось цяпер, у зімовы час, патрэбна, каб камунальныя службы своечасова збівалі з дахаў ледзяшы, калі яны ўтвараюцца. Памятаю, летась было даволі страшна хадзіць па тратуарах. Баюся, калі недзе побач з табой выгульваюць велізарных сабак без намордніка. Чаму такое дагэтуль магчыма? Яшчэ мне як састарэламу чалавеку рызыкоўна выходзіць з пад'езда па лесвіцы, калі ў ім не гарыць лямпачка.

Фёдар ГУЛІЦКІ, старшы інспектар упраўлення ДАІ Міністэрства ўнутраных спраў:

— Выкарыстанне дзіцячых крэслаў і іншых пасіўных сродкаў бяспекі — спецыяльных дзіцячых утрымліваючых прыстасаванняў. За 2007 год 35,9 працэнта дзяцей — калі браць ад агульнай колькасці загінулых за год дзетак — развіталіся з жыццём у якасці пасажыраў. А гэтага ж можна было пазбегнуць. Выкарыстанне святлоадбівальных элементаў: павязак, бранзалетаў і г.д. Тут праблема, на жаль, па-ранейшаму захоўваецца. Толькі за час з мінулых выхадных у краіне ў цёмны час сутак загінулі 10 чалавек. Гэтыя пешаходы не мелі святлоадбівальных элементаў.

Ірына АСТАФ'ЕВА, старшыня Мінскага таварыства спажыўцоў:

— Адкажу на вашы пытанні, абапіраючыся на канкрэтныя звароты па дапамогу да нас грамадзян, што пацярпелі ў тых ці іншых сітуацыях. Вялікая рызыка для спажыўцоў можа ўзнікаць, калі ступеньчатыя ганкі магазіна пакрываюцца лёдам, а спецыяльныя дыванкі адсутнічаюць. Гэта вядзе да траўматызму людзей. У пераходах, у метро на падлозе ёсць рашоткі, і жанчыны, асабліва на «шпільках», рызыкуюць здароўем, калі крочаць па іх. Тое ж можна сказаць і пра слізкія мармуровыя пліты на падлозе. Хацелася б таксама, каб гандлёвыя прадпрыемствы, згодна з рашэннем выканкама, добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю. Бо гэта і чысціня, і прыгажосць, і наша бяспека ў тым ліку. Скажам, каля аднаго рэстарана хуткага харчавання на праспекце лёд на тратуары заўсёды прыбіраюць, а побач з цырульняй непадалёк — ніколі. Хацелася б, каб у суб'ектаў гаспадарання была належная культура ў гэтым сэнсе, бо гэта яшчэ і праблема экалогіі, што асабліва важна ў Год здароўя.

Горад прыгажэе, робіцца больш утульным, на гэта ідуць вялікія сродкі. Але паглядзіце, як часам будаўнікі ўкладваюць тратуарную плітку? Такія перапады па вышыні бываюць, такія яміны потым утвараюцца, што ісці па такім тратуары даводзіцца ў вялікім напружанні, асабліва жанчынам на абцасах, каб кантраляваць уласную бяспеку, не атрымаць траўму. Шкада, што ў такіх будаўнічых работ няма працяглай якасці. Даволі высокім з'яўляецца і траўматызм ад незачыненых каналізацыйных люкаў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«ЧАХОЛ» ДЛЯ ХВОРАГА СЭРЦА

Супрацоўнікі кафедры тэхналогіі трыкатажнай вытворчасці Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (ВДТУ) распрацавалі падтрымліваючае ўстройства жалудачкаў сэрца для хворых на кардыяміапатыю, паведаміў БЕЛТА загадчык кафедры кандыдат тэхнічных навук Аляксандр Чаркоўскі.

Адной з прымет захворвання з'яўляецца павялічаны памер сэрца, з-за чаго орган страчвае помпавыя функцыі і ў выніку парушаецца кровазварот. Выраб складаецца з пругкай трыкатажнай абалонкі, якая фактычна надзяваецца на хворае сэрца. Устройства разлічана на пажыццёвае функцыянаванне і не аказвае адмоўнага ўплыву на чалавека. Дзесяці пацыентам зроблены аперацыі па імплантацыі падтрымліваючага ўстройства. З часам хворы орган набываў нармальную форму і аднаўляў свае функцыі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Прамая лінія

НАША СКУРА — ЛЮСТЭРКА ІМУНІТЭТУ

Адказвае ўрач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурна-венералагічнага дыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 30, 31 студзеня і 1 лютага.)

☎ — Я званю з Баранавіцкага раёна. Майму сыну 17 гадоў. У яго — іхтыёз: сверб, скура сухая. Як лячыцца?

— Іхтыёз — прыроджанае захворванне. Поўнасцю ад яго пазбавіцца практычна немагчыма. Усё лячэнне накіроўваецца на тое, каб аблегчыць стан хворага. У прыватнасці, лячэнне патрабуе перыядычнага прыёму вітамінаў групы А і Е. Усё залежыць ад таго, як цяжка гэта працякае.

— Мы чарнобыльцы. Можа быць, хвароба звязана з гэтым?

— Цяжка сказаць. Хоць, магчыма, гэта і пасадзейнічала развіццю захворвання.

☎ — На провадзе Іўеўскі раён. У майго мужа больш як 20 гадоў псарыяз. Ён ужо вялікі. Што параіце для лячэння? І ці можна прыехаць да вас пракансультавацца?

— Безумоўна, вашага мужа трэба паглядзець. Давайце зробім так. Вы мне патэлефануеце дадатката і дамовімся, што будзем рабіць далей.

☎ — Званю з Гродна. У дачкі з 12 гадоў — вугры. Зараз ёй 16. Прышчы не знікаюць. Чым мы толькі ні лячыліся, нічога не дапамагае. Што нам рабіць? Ці можна прыехаць да вас на кансультацыю?

— Трэба звярнуцца да дэрматолага па месцы жыхарства і, магчыма, не адзін раз. Калі лячэнне не дапаможа, можна парасіць накіраванне ў Мінск. У нас кансультацыі праходзяць у дыспансэры.

☎ — Марына з Мінскага раёна тэлефануе. Скажыце, калі ласка, наколькі высокая верагоднасць заражэння нейкай дрэнню пры аральным сэксе? Якія спосабы засцярогі ад гэтага ёсць?

— Заразіцца можна практычна ўсім тым, чым і пры генітальным сэксе. Інакш кажучы, спосабы засцярогі — такія ж, як і пры звычайным сэксе, з дапамогай прэзерватыва. Хоць і ён не дае 100-працэнтнай гарантыі.

☎ — Званю з Віцебскай вобласці. Сам урач. У мяне артрапатычны псарыяз. Не хачу сядзець на гармонах, якія мне выпісваюць. Да каго ў Віцебску лепш звярнуцца з гэтай праблемай?

— У Віцебскім медінстытуце ёсць профільная кафедра і цудоўны спецыяліст прафесар Адаскевіч. Хутчэй за ўсё, трэба звярнуцца ў скурвендыспансэр, дзе і атрымаць яго кансультацыю.

☎ — Валянціна, званю з Дзяржынскага раёна. Год таму ў мяне з'явіўся пер'явы клешч. І вось ужо год мажуся бензілбензаатам, а эфекту няма. Што рабіць?

— Можа, цяпер у вас ужо ідзе рэакцыя на гэту мазь. Ён нельга так доўга і бескантрольна карыстацца. Калі эфекту няма ад мазі, то або вы пазбавіліся ад пер'явога кляшча, або вашу скуру турбуе нешта іншае. Гнайнічкі могуць быць не толькі ад пер'явога кляшча. Акрамя таго, пажадана яшчэ выключыць нейкія правакуючыя моманты. Калі гэта пер'явы клешч, то неабходна ўбраць пер'явыя падушкі, пярыны і г.д. Але, зноў-такі, трэба ісці на прыём да ўрача і вырашаць пытанне аб тым, што на скуры ў вас цяпер ёсць. Калі лячэнне эфекту не дае, яго трэба спыняць і пераходзіць на іншае.

— А харчаванне можа ўплываць на мае скурныя праблемы?

— Калі гэта пер'явы клешч, то харчаванне не моцна ўплывае. А калі ідуць ужо нейкія іншыя алергічныя праявы, то харчаванне можа ўплываць.

☎ — Званю з Навагрудскага раёна, завуць Ала Аркадзьеўна. Вельмі хвалюе твар сына. Пайшлі вугры, скура чырвоная, страшная. Пачалося гэта з 9-га класа, а зараз ён курсант ваеннай акадэміі ў Мінску. Што толькі ні рабілі — не дапамагае.

— У ваеннай акадэміі ў Мінску ёсць свае супрацоўнікі гэтай прафесіі. Калі яны не спраўляюцца з сітуацыяй, то могуць накіраваць пацыента на кансультацыю ў скурвендыспансэр да нас, каб падабраць іншае лячэнне.

☎ — Тэлефаную са Столінскага раёна, Ганна Іванаўна. У дачкі ўжо 5 дзён высыпка на пясніцы, ягадзіцах. Прымаем цыклавір. Гаворыць, што ў яе апаясваючы лішай. Што гэта такое, як працякае, ці небяспечна для навакольных?

— Гэта віруснае захворванне, выклікаецца вірусам, які падобны на вірус ветраной воспы. Можа праходзіць у розных формах: лёгкай і цяжкай. Вы лечыцеся аднасна невялікі тэрмін. Хвароба будзе паціху праходзіць. На гэту немач звычайна чалавек хварэе толькі раз у жыцці. Захворванне не павінна нікому перадацца. Пажадана толькі, каб не было кантакту з маленькімі дзецьмі.

— А колькі дзён прымаць таблеткі?

— Трэба глядзець па стану скуры.

☎ — Турбуе Ніна Ігараўна. У мужа вялікі псарыяз: на галаве, руках, твары. Што нам рабіць?

— Звярнуцца да спецыяліста па месцы жыхарства, каб ён падабраў адэкватнае лячэнне. Яно можа ўключаць і сістэмную тэрапію, і пэўнае фізіялячэнне. Аднаразовы ці двухразовы зварот да ўрача можа і не даць эфекту. Бо лечыцца не толькі зона пашкоджання, але і сам чалавек. Камусьці патрэбен адзін прэпарат, камусьці другі. А каб правільна падабраць лячэнне, адной-дзвюх сустрэч з урачом недастаткова.

☎ — Ганна з Мастоў. Мне 23 гады, зараз вучуся і жыву ў Мінску ў інтэрнаце. Узніклі скурныя праблемы: скура сухая, зімой моцны сверб, ачагі на руках, нагах, твары. Выкарыстоўвала розныя мазі. Яны дапамагалі, але часова. Як быць?

— Трэба шукаць прычыну. Калі непрыемнасці пачаліся пасля пераезду ў Мінск, і гэта дакладна звязана, то, магчыма, вы трапілі ў стан хранічнага стрэсу на вучобе, або вам не падыходзіць тая ж мясцовая вада, ці з'явілася нешта новае з касметыкі. Я раю вам, калі будуць абвастрэнні, звярнуцца ў скурвендыспансэр на Смалячкова, 1, каб вас агледзеў дэрматолаг, і разам з ім вы вынайшлі прычыну.

☎ — Людміла, званю з Баранавічаў. У майго зусім маленькага дзіцяці быў дыятэз. Цяпер сыну 7 гадоў і ён ужо мае атапічны дэрматыт. Вельмі частыя абвастрэнні. Ці можна нам дапамагчы?

— Абавязкова назіравацца ў алерголага і дэрматолага. Трэба шукаць прычыну, вызначыць курс лячэння. Цалкам верагодна, што гэту паталогію хлопчык зможа перарасці. Калі доктар на месцы не спраўляецца з сітуацыяй, ён можа накіраваць вас у Мінск у наш кансультацыйны цэнтр.

☎ — Ірына, Мінск. Скажыце, ці можна выдаляць папіломы?

— Можна. А калі яны знаходзяцца ў месцах, якія найбольш траўмуюцца, то іх нават трэба выдаляць. Інакш з цягам часу іх колькасць будзе толькі павялічвацца. Гэта могуць зрабіць у любой касметычнай лячэбніцы.

☎ — Прывітанне! Мяне завуць Марыя, званю з Мінска. Хацела б даведацца, ці можна вылечыць вітыліга?

— Дакладны адказ на гэта пытанне вам не дасць ніхто. Вітыліга — гэта плямы на скуры, якія не ўтрымліваюць пігменту. З'яўляюцца яны, як правіла, з цягам часу. Ёсць некалькі метадык, якія паляпшаюць стан скуры, але стопрацэнтнай методыкі вылечвання гэтага захворвання не існуе.

☎ — Івацэвічы на провадзе, Раіса Анатольеўна. Дачцэ — 24 гады. Калісьці ў дзяцінстве моцна хварэла на дыятэз. Не так даўно ў яе на скуры з'явілася лушчэнне, а цяпер скура нібыта пакрылася лускай. Ляжалі ў Брэсцкай абласной бальніцы, былі і на платным прыёме ў Мінску. Дыягназы ставяць розныя: атапічны дэрматыт, нейрадэрміт, экзэма. Ці можна да вас трапіць на прыём?

— Вам трэба звярнуцца ў Рэспубліканскі кансультацыйны цэнтр, які знаходзіцца на базе нашага мінскага дыспансэра. Вазьміце накіраванне ў раённага дэрматолага. Дапускаецца візіт і без накіравання, але гэта будзе адносіцца да шэрагу платных паслуг.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

Дробна драбніца...

Сямейны псіхолаг
Святлана Анішчанкава

«НЕСУР'ЁЗНЫЯ» СПРАВЫ ЮНАЦТВА

Калі спытаць у чалавека сярэдніх гадоў аб самых прыемных успамінах яго жыцця, як правіла, адказ ідзе сваімі шляхамі ў юнацтва. Прыемнае хваляванне адносіць думкі туды, дзе дыхалася лёгка, свабодна і радасна. Увесь свет быў ля ног маладога, моцнага чалавека, які ўпэўнена глядзеў у цудоўнае і паспяховае будучае. Не ведаў ён тады яшчэ глыбокай нуды, суму, безнадзейнасці рэальнага жыцця, з яго шэрай штодзённасцю. Ёсць за што берагчы як каштоўны скарб успаміны аб юнацтве, дзякуючы якім мы дакладна ведаем, што свабода, шчасце і радасць жывуць у душы.

Вядома ж, забыліся страх і трывога тых гадоў, калі рабіліся першыя крокі ва ўсіх накірунках. Вакол цэлае жыццё, а ты топчашся на месцы, трэба ісці, рабіць выбар: кім быць, каго кахаць, а галоўнае — як кахаць. Цела і душа ў маладыя гады бягуць у розных накірунках. Разумная маці-прырода часам неабходна жорсткая да сваіх дзяцей. Трэба зрабіць толькі адзін крок праз бездань страху да асалоды кахання і пазнання глыбіні свету, сэнсу жыцця. Але гэты крок ты павінен зрабіць сам. Стаіць малады чалавек, топчацца, вакол мітусяцца людзі бліскія і чужыя. Яны таксама калісьці былі маладымі і таксама баяліся зрабіць свой першы крок, але час хутка ляціць і ўжо ніхто не памятае, як страшна і адзінока бывае на гэтым краі бездані. Трэба ісці наперад, прырода кліча да вялікіх адкрыццяў і на пытанні: «А калі не атрымаецца, калі не змагу?» загадвае адказваць хутка і бясстрашна. Штурхае наперад, дапамагае, ахоўвае. Патрабаванне адказнасці няўмольна ўзрастае з кожным новым днём. Набіраючы абароты ў 14 гадоў, яно, са шматлікімі абавязацельствамі, як лавіна падае на галовы 18-гадовых, па суткнасці, яшчэ не падрыхтаваных. Няма калі марыць, трэба займацца сур'ёзнымі справамі: ты ўжо дарослы. Каму з блізкіх прыйдзе ў галаву спытацца ў юнака ці дзяўчыны: «Як там у цябе на любоўным фронце, атрымліваецца?..» Наша грамадства разумных, адказных людзей зусім не гатова да абмеркавання самага важнага пытання ў жыцці маладых — сэксуальных адносінаў. Пры гэтым мы моцна нервуемся, апасаючыся «наступстваў», і «прасунутыя» бацькі спрабуюць, акрамя грошай, няложка ўсунуць прэзерватывы ў кішэню сына або дачкі, якія адпраўляюцца на вечарынку. Потым, не звёўшы вачэй да раніцы, падазрона ўглядваючыся ў малады стомлены твар, спрабуем зразумець: «Штосьці было ці не?!» Такім чынам становіцца зразумела, што па той ці іншай прычыне палавое пытанне хвалюе многіх.

Але, на жаль, пазіцыя пазбягання з боку бацькоў і няўпэўненасць з боку маладых прыводзяць да сумных наступстваў. Мы не толькі пазбаўляем сябе радасці ад стваральных зносінаў двух пакаленняў, але, што самае непрыемнае, забываем пра тыя мімалётныя і хуткацечныя гады цудоўнага юнацтва, калі чалавек з'яўляецца поўнаўладным гаспадаром цэлага свету. Ператвараючы юнацтва сваіх дзяцей у чарговую прыступку на шляху да поспеху, мы забываем, што жыццё — не лесвіца. Што кожны ўзроставы этап — шлях да дасканаласці і гармоніі. Юнацтву на гэтым шляху сустракаюцца квітнеючыя дрэвы, цудоўныя абліччы — прыгажосць свету ва ўсёй яго велічы. Шчасце, якое, адчуўшы сумленным і любячым сэрцам на зары жыцця, чалавек старэецца пранесці да канца. Дакладна ведаючы, што яно ёсць, бо ён яго адчуў, пазнаў гэты пах жыцця, ні з чым не параўнальнае адчуванне палёту.

Але грамадства дыктуе свае правілы, дакладней, старэйшае пакаленне — недаверлівае, якое ўжо загадзя ведае, «што будзе далей...»

Безумоўна, бясспрэчна права бацькоў хвалявацца аб сваіх дзецях. Аднак разуменне і давер да іх — пакуль яшчэ рэдкі падарунак у нашым жыцці.

Трэба прыняць думку аб сваім дзіцяці, як аб выніку штодзённых клопатаў, цяпла і любові. Зразумець, што ўсё тое добрае і дрэннае, што было дадзена ў працэсе выхавання, і ёсць — тваё каштоўнае дзіця. Якое, усмоктваючы па крупінках асаблівасці ўзаемадзеяння з навакольным светам ад бацькоў, цяпер хоча аддаць тое, што мае. І калі мы не пазнаём сябе ў сваім дзіцяці або несвядома прыпісваем яму негатыўныя рысы — гэта толькі наша жаданне, з якім прырода ў асобе маладога арганізма абавязкова паспрачаецца. Нечаканыя перамены ў характары сына або дачкі, асабліва негатыўныя яго праявы — гэта сігнал SOS, просьба аб дапамозе няўпэўненага чалавека, маладога дрэва, якое ўпершыню сустракаецца з бурай у моры людскіх страсцяў.

Наша задача — падтрымаць маладое дрэва сваімі моцнымі галінамі, даць зразумець: разам мы — сіла, бура міне, выгляне сонца, свет цудоўны.

Станоўчая, аптымістычная падтрымка фарміруе ў падсвядомасці маладога чалавека перакананасць у сваіх сілах, дае радаснае пачуццё ўпэўненасці за сваё будучае, а гэта, як вядома, палова поспеху.

Глыбока ўкаранелая скаванасць у пытаннях сэксуальных адносінаў мужчыны і жанчыны, няўменне і нежаданне дзяліцца жыццёвым вопытам уласцівыя большасці бацькоў толькі што пасталелых дзяцей. Перастройвацца і адкрываць у сабе новыя рэзервы для развіцця прымусае час. Маладое пакаленне не згоднае з формулай «сэкс—шлюб». Духоўная блізкасць для маладых не абавязкова звязана з сэксуальнымі адносінамі. Вучыць сваіх дзяцей быць шчаслівымі і паўнацэннымі — бацькоўскі абавязак, і на дапамогу тут сёння прыходзіць шматлікая літаратура, якая падрабязна апісвае асаблівасці псіхафізіялагічнага развіцця ў падлеткава-юнацкім узросце.

Пазбягаючы відавочнага, накшталт таго, што ў юнацкім узросце сэксуальныя адносіны мужчыны і жанчыны стаяць на першым месцы, мы аказваем нашым дзецям дрэнную паслугу. Ветранае юнацтва забывае аб расплаце. Адказнасць прыходзіць з гадамі.

Добразычлівая інфармацыя, падтрымка, і як вынік — давер, дапамогуць нашым дзецям пражыць адзін з самых яркіх адрэзкаў жыцця радасна і без «непажаданых наступстваў».

Бліжэй да цела

ПАД... АБЦАСАМ № 1

Як вядома, статыстыка можа ведаць усё. А вось колькі сярод мужчын тых, хто знаходзіцца пад абцасам сваіх каханак і жонак, напэўна, ніколі дакладна не будзе вядома. Вядома ж, калі не правядуць спецыяльнае сацыялагічнае даследаванне. Але ж навошта траціць дзяржаўныя грошы? Безумоўна, высветліцца, што такіх параўнальна нямнога. А мо такіх тысячы?

Смешна, але нават у мультфільмах савецкіх гадоў можна ўбачыць «герояў публікацыі»: казку «Пра рыбака і рыбку» памятаеце? Няшчасны рыбак...

Што ўжо гаварыць пра класіку літаратуры, кінематографа. Ну, успомніці? А фраза «Муля, не нервуй мяне?» — геніяльна!

«Дзіўна», што ў «Руска-беларускім слоўніку» 1991 года выдання наогул няма перакладу рускага слова па гэтай тэме. Значыць, для аўтараў гэта было не актуальна? Альбо ў той час сам факт існавання такіх мужчын у грамадстве афіцыйна не прызнавалі?

А ХТО ГЭТА ТАКІЯ?

У перакладзе з англійскай мовы выходзіць, што такі мужчына — «муж, над якім дамінуе жонка»... Ні больш, ні менш!

А калі яшчэ і не муж, не трэба быць Настрадамусам, каб прадказаць перспектывы.

Колькі жыву, ніколі не чуў ад мужчын, каб яны прызналіся, што жывуць «пад абцасам». Праўда, быў адзін вельмі паказальны выпадак з асабістай журналісцкай практыкі. Адзін прадстаўнік дыпламатычнага корпуса ў Беларусі так шчыра расказваў пра сваё каханне да жонкі, што не ўтойваў пра слёзы ля яе каленяў падчас цяжкіх хвілін жыцця. Ды потым... яго падначаленая жанчына парэкамендавала ўбраць адпаведныя словы з будучай публікацыі.

Успамінаюцца і прызнанні некаторых «зорак масцтацтваў». Ну, напрыклад Філіп Кіркораў калісьці прызнаўся ў гэтым. Зразумела, пад такой жанчынай, як Ала Барысаўна, напэўна, «за гонар быць «на ўзроўні яе крокаў»?

— Адназначна, такія «слабыя» мужчыны не атрымалі ў дзяцінстве дастатковай любові ад маці... Ёсць у некаторых даследаваннях нават цэлае дзяленне такіх мужчын па катэгорыях, — расказвае псіхолаг Аляксей Лявонаў. — Але ж такая методыка вызначэння тыпаў, безумоўна, рэч спрэчная, бо ўсё ў кожнай пары па-рознаму складваецца.

Жанчыны, бывае, скардзяцца, што мужык не можа просты цвік убіць у сцяну. Але і нават мужчына з «залатымі рукамі», з паважанай пасадай можа трапіць у адпаведны «спіс». Аказваецца, дзеляцца тыя, хто «пад абцасам», на «звычайных», «хатніх», «умоўных» і іншых...

«Звычайныя» — нейкія мазахісты па жыцці. Яны — слабыя асобы, якія на ўсё гатовы, толькі каб самім не прымаць рашэнняў, нічога з сабе як асобы не ўяўляюць. Будуць «падначаленымі» і ў хамаватай гандляркі, і ў сантэхніка, які адмовіцца чыніць кран... Пры гэтым «цуд» можа пры выпадковасці... здрадзіць жонцы, каб проста даказаць самому сабе, што ён і «не такі ўжо «апошні»...

«Хатнія» — поўнасцю залежаць ад жанчын, звычайна не могуць сябе самастойна абслугоўваць па гаспадарцы, але гэта не абавязкова. Жанчыны для іх як маці, у поўным сэнсе гэтага слова — выражаюць усё за мужчын. Пры гэтым першыя могуць добра паўплываць на службовы рост «падначаленых», ствараюць іх імідж у адзенні, паводзінах. Знаёмыя такога мужчыны адразу заўважаць, што пра яго добра клапоцяцца, ды адзначаць, што яму «вельмі пашанцавала ў жыцці»...

«Умоўны» «пад абцасам» можа быць сапраўдным талентам, які вельмі любіць справу, якой займаецца, ды і калегі вельмі могуць яго паважаць. Проста ён не хоча лішніх канфліктаў з жонкай з-за дробных хатніх спраў. Тыпу: «усё роўна яна не будзе задаволеная, а ініцыятыва заўсёды пакараецца». Пры гэтым ён вельмі цэніць сям'ю, гатовы зрабіць для яе дабрабыту ўсё магчымае. Але ён не будзе цярпець, калі каханая «перасковае праз планку цярпення», лепш знойдзе сабе іншую «гаспадыню».

А ёсць яшчэ **«зачараваныя»**, якія ў перыяд заканасці могуць рабіць усё, каб «завалодаць» жанчынай, а потым прабачце, жанчыны... Але сярод іх ёсць «вечна закаханыя», гатовыя на многае мо і ўсё жыццё. Жывуць і іншыя тыпажы.

«ПАД АБЦАСАМ» — НЕ ІМПАТЭНТ!

Знаёмы сэксапатолаг, дарэчы, адразу развеяў нейкі стэрэатыпны жаночы міф пра слабыя сэксуальныя магчымасці «мужчын пад абцасам».

— Безумоўна, калі жанчына ва ўсім хоча быць першай і нават у ложку не дае мужу расслабіцца, у апошняга могуць узнікнуць праблемы ў патэнцыі. А бывае, яна проста лічыць, што сам факт сэксуальных адносінаў з ёю для «мужчыны пад абцасам» — проста «падарунак з нябёсаў», таму і не вельмі думае пра тое, ці задаволены ён сэксам... У выніку здаровы, раней моцны ў сэксуальным плане мужчына можа сутыкнуцца з праблемамі падчас палавога акта. І лячэнне ў такім выпадку — вельмі доўгі і цяжкі комплексны працэс.

Быў выпадак, калі лячыўся мужчына медыкаментознымі сродкамі, прымаў стымулятары, але і гэта не вельмі дапамагала. Прызнаваўся потым, што пасля змены партнёршы патэнцыя часцей за ўсё не падводзіла... Ды параўноўваючы «сам факт працэсу», пахі, усё роўна вярнуўся да былой сваёй «сцервы».

Выходзіць, актыўнасць па жыцці для «сцерваў», бывае, даводзіць і да сур'ёзных праблем. Але ж пазбавіцца ад залежнасці ад іх — «галаўны боль».

— Калі такі кіне — нічога, знойдзе сабе чарговага, — адзначаць некаторыя чытачы. Ёсць думкі, што развіццё фемінізму спрыяе папаўненню шэрагаў «пад абцасам». Мо і так?

І не трэба быць сэксапатолагам, сацыёлагам, каб адзначыць, што тыя, хто «пад абцасам», звычайна чамусьці сустракаюцца, жывуць са «сцервамі». І моцных, працяглых па часе шлюбаў у такіх выпадках шмат. Напэўна, цягнуцца адзін да аднаго супрацьлегласці?

ЯК ПАЗБАВІЦЦА «АД ХВАРОБЫ»?

Напэўна, цяжка. Бывае, што жанчына настолькі валодае мужчынам: яго настроем, для творчых — натхненнем, што гэты працэс залежнасці так моцна зацягвае, і ў выніку нават не кожны псіхіятр дапаможа.

Чытаў, што ў буйных гарадах нават спецыяльныя курсы арганізоўваюць. Безумоўна, жанчынам, якія залежаць ад мужчын, яшчэ цяжэй, бо вядома, што прадстаўніцы «слабай паловы чалавецтва» — манагамныя па сваёй прыродзе. Але гэта зусім іншая тэма.

Сапраўдным здзіўленнем сталі для мяне экспрэс-адказы па тэме знаёмых жанчын: «Хацелі б вы, каб «мужык быў пад вашым абцасам?», «Я думаю, што заслугоўваю ўвагі іншых», «Не, безумоўна, я што, не магу быць слабай?», «Такіх мужчын проста не паважаю», ну і г.д.

І як цікава, калі некаторыя жанчыны з такімі поглядамі праз нейкі час пачынаюць сустракацца з... Правільна, з тымі, хто яе «не заслугоўвае».

Што датычыцца назвы артыкула з нумарам 1, напэўна, можа атрымацца дыялог з чытачамі. Мо хто падзеліцца асабістым вопытам і карыснымі парадамі пазбаўлення ад «хваробы»? А, можа, для большасці «залежных» — гэта звыклы лад жыцця? Формула кахання, напэўна, не без такіх складаных нюансаў?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗА ГОД ЗДАРОВАЙ СЯМ'І!

Учора ў рамках фізкультурна-спартыўнага свята ў гарналыжным комплексе Сілічы адбылася прэзентацыя Года здароўя на Міншчыне. На працягу года ў сталічным рэгіёне пройдзе шэраг масавых фізкультурна-спартыўных мерапрыемстваў пад дэвізамі «За здаровую і алімпійскую Міншчыну», «Здаровая сям'я — здаровая нацыя», «Фізічная культура, спорт і турызм — у кожную сям'ю».

Свята адкрыў старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід Крупец. «Поспех любога грамадства знаходзіцца ў прамой сувязі з яго фізічным развіццём. Нездарма здароўе і здаровы лад жыцця — адзін з прыярытэтных накірункаў у палітыцы нашай дзяржавы. І наша задача, каб здаровы лад жыцця стаў нормай жыцця для ўсіх беларусаў», — адзначыў губернатар. Міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч падкрэсліў, што Мінскую вобласць спецыяльна выбралі ганаровым госцем Міжнароднай выставы «Тыдзень моды на здароўе»: «Міншчына — найбуйнейшы рэгіён краіны, які дынамічна развіваецца. У вобласці функцыянуюць лепшыя вучэбна-трэніровачныя базы, лепшыя гарналыжныя курорты, кіраўніцтва і жыхары рэгіёна надаюць клопату аб сваім здароўі вялікую ўвагу».

Трохразовая алімпійская чэмпіёнка па фігурным катанні Ірына Родніна нагадала, што 2008 год названы ў Расіі годам сям'і, і прапанавала ў рамках Саюзнай дзяржавы аб'яднаць Год здароўя і Год сям'і ў год здаровай сям'і. Яна таксама зычыла беларусам моцнага здароўя і пажадала, каб кожны ўзняўся ў жыцці на свой п'едэстал.

Ірына ПРЫМАК.

Мінск — Сілічы.

Замест віягры

Спецыялісты Інстытута мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі распрацавалі тэхналогію стварэння ўнікальнай біялагічна актыўнай дабаўкі для павышэння патэнцыі. Яе асноўны кампанент — кітайскі грыб кардзіцэпс, які ў прыродзе «селіцца» ў лічынках насякомых, што жывуць у высакагор'ях Кітая і Тыбета. Дзякуючы такому незвычайнаму пажыўнаму асяроддзю кардзіцэпс утрымлівае рэчывы, якія павышаюць не толькі патэнцыю, але і перашкаджаюць працэсу старэння органаў і тканак, зніжэнню артэрыяльнага ціску.

Мінскія вучоныя плануюць вырошчваць кардзіцэпс, дакладней, міцэлій-грыбніцу, з дапамогай біятэхналогій — у вадкім пажыўным асяроддзі. Так яны змогуць атрымаць прадукт, які перавышае па лекавых уласцівасцях прыродны.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск-Навіны».*

Карані

ВЯСЕЛЛЕ Ў МУЗЕІ

У Чавусах маладыя не замаўляюць шыкоўныя лімузіны — гавораць, на мясцовых праездах цяжка развярнуцца.

Затое ў райцэнтры знайшлі свой спосаб зрабіць дзень заключэння шлюбу адметным: маладыя і іх госці прыходзяць у раённы гісторыка-краязнаўчы музей, каб далучыцца да нацыянальных вясельных абрадаў і традыцый.

Галіна і Іван САЎЧАНКІ — рукі і лёсы звязаны чырвоным поясам.

Ідэя запрашаць маладых у музей нарадзілася з размоў з фотамайстрамі: у халодны сезон у маленькім правінцыйным горадзе цяжка знайсці краявіды і помнікі, якія ўпрыгожылі б вясельную карцінку. А ў выніку атрымалася не проста фатаграфаванне ў музейных інтэр'ерах, а цэлы народны абрад, дзе галоўныя дзеючыя асобы — жаніх і нявеста.

Жанчына ў нацыянальным строі — хустцы, андараку і вышыванай кашулі — запрашае маладых у зал этнаграфіі: **«Бачу — не адну пару лапцяў Бог сваптаў, пакуль гэтую пару разам сабраў!»**

Проста на парозе маладым звязваюць рукі, каб сімвалічна аб'яднаць іх жыццёвыя шляхі ў адно цэлае: **«Пары злучаюцца ў небе, вяселлі ладзяцца на зямлі».** Звязваюць маладым рукі альбо тканым чырвоным поясам (чырвоная нітка, паводле прыметы, адпуджвае нячыстую сілу і зберагае ад дурнога вока), альбо вясельным ручніком.

Іна КАЗАКОВА паказвае музейную рэліквію — саматканы вясельны ручнік

У фондах Чавускага музея ёсць вясельны саматканы ручнік. Дырэктар музея Іна Казакова называе яго рэліквіяй.

— Паглядзіце на ручнік, — запрашае яна. — На двух канцах ён мае розны арнамент, для нявесты і жаніха. Тут чырвоныя расліны, якія сімвалізуюць росквіт прыроды і жыцця. А на іншым баку — чырвона-чорныя ромбы ды квадраты, і гэта мужчынскі вобраз урадлівасці.

У чавускага ручніка ёсць свая гісторыя. Яго вышывала ў першай палове XX стагоддзя жыхарка вёскі Папоўка А. Навасельцава. Дзяўчына рабіла яго для сябе, але вайна перакрэсліла ўсе мары. Яе сям'я была ў бежанцах, а калі вярнуліся ў родныя хаты... Мужыкоў неставала, так і не пайшла жанчына замуж. Але яе ручнік цяпер у музеі — ім звязваюць лёсы маладых.

Між тым, маладыя садзяцца на лаву — **«каб жыццё было такое роўнае, як гэтая лаўка».** На стале самавар і патэфон. Можна патанцаваць пад песню.

Тут распавядаюць пра пасаг, які рыхтавалі для нявесты ды складалі ў вялікі куфар. Такі куфар ёсць у экспазіцыі залы этнаграфіі. На яго паклалі кажух ворсам наверх: **«Кажух цёплы і махнаты, жыць вам добра і багата».** Маладыя з задавальненнем сядзяць на ім, каб быць заможнымі: ролю грошай у жыцці сям'і ніхто не аспрэчвае. У народзе гаварылі: **«Колькі варсінак на гэтым кажуху — столькі грошай у кашальку».**

У музеі адразу даюць і грашовыя купюры, якія так і называюцца — «грошы». **«Дарую грошы, каб дзеці былі харошы!»**

А калі вяселлі банкаўскія — тады ідуць у ход і «долары». Як, напрыклад, у Ганны і Івана Саўчанкаў, якія працуюць у мясцовым аддзяленні аднаго з банкаў.

— Мы ўбачылі музейнае вяселле на відэастужцы ў знаёмых, і адразу загарэліся зрабіць такое, — распавядае Ганна. — Такое свята выдатнае атрымалася — госці былі ў захапленні! Цяпер ёсць што ўзгадаць. Напрыклад, як да драўлянага зрубу падводзілі: **«Колькі ў хаце сучкоў, каб столькі было сынкоў! А колькі шчэлачак, каб столькі было дзевачак!»** Ну, мы з мужам над гэтым працуем...

У музеі маладая з усіх сілаў круціць прасніцу, каб прадэманстраваць свае здольнасці ў гаспадарчых справах. Малады нясе жонку праз парог — каб псота не прыстала да пары. Праўда, не праз усе дзверы музейных парогаў, а толькі праз адзін.

Уся музейная цырымонія вядзецца па-беларуску, з народнымі жартамі і гульнямі. Галінка бярозы — маладому: **«Дару галіну бярозы, каб муж да жонкі заўсёды прыходзіў цвярозы!»** Аказваецца, атрымаць у падарунак на вяселле буракі — гэта не здзек: **«Дарую бураками, каб дзеці былі не дуракамі».** Але найбольшай папулярнасцю сярод маладых і іх гасцей карыстаецца... палена: **«Дорым маладому палена — цалуй жонцы калена!»** Цалуюць з вялікім задавальненнем!

— Зразумела, мы імкнёмся рабіць так, каб маладым ставаць сапраўднае свята, вясёлае і без напружання, — каментуе Іна Казакова. — Аднак наш вясельны праект мае на мэце не толькі забаўляць людзей, але і прыцягнуць увагу да нацыянальных традыцый і роднай мовы. Ды і часта, прабачце, няма ў рускай мове такіх смачнасцяў, як у нашай беларускай!

У музеі распавядаюць, што была адна нявеста з Санкт-Пецярбурга, якой даводзілася перакладаць шэптам. Але ўсе звычайна не толькі разумеюць беларускую мову, але і падхопліваюць яе, падказваюць новыя вясельныя жарты. Іна Казакова прызнаецца, што вельмі любіць такую публіку — сваты з вёсак ніколі не застаюцца ў баку ад гульняў.

Маладыя і іх госці вельмі любяць фатаграфавацца ў музеі. На фоне намаляваных на сцяне ў зале этнаграфіі старых Чавусаў, у залах прыроды з чучаламі буйных жывёлаў. А найбольш папулярнай для здымкаў, нечакана для музейных супрацоўнікаў, стала зала, якая расказвае пра партызанскі рух у Вялікую Айчынную вайну. Зямлянка з гармонікам — абсалютны хіт. На другім месцы рамантычная размова закаханых з дзвюх эпох: ён — з ваенным тэлефонам, яна — з мабільным.

Што ж датычыцца народных абрадаў, то маладыя і іх бацькі і вераць, і адначасова не вераць ва ўсе прыметы і забабоны. Але важна, што з гатоўнасцю і цікавасцю іх выконваюць. А потым гавораць, што ў музеі атрымалася сапраўднае свята — не толькі для арыгінальных здымак, але і для саміх маладых.

Ва ўсякім разе вяселлі ў Чавускім музеі карыстаюцца папулярнасцю. Амаль штотыдзень у музей прыходзіць маладая пара. Каштуе гэта задавальненне ўсяго 15 тысяч рублёў. Доўжыцца прыкладна гадзіну, а напрыканцы маладыя атрымліваюць друкаваныя «Пажаданні». І жартаўлівыя прыказкі, і сур'ёзныя наказы.

«Каб жылі багата, як восень,
Каб былі красны, як вясна,
А душы — як празрыстая вада.
Каб разам усё жыццё ішлі,
Шчасце-долю сабе знайшлі».

Ілона ІВАНОВА.

г. Чавусы.

НЕЦВЯРОЗАГА ВЫРАТАВАЎ ФЛІКЕР

Па чыгуначных рэйках каля Кобрына ішоў чалавек нападпітку. Ішоў ды і прылёг. Добра, што на рукаве быў флікер. Машыніст грузавога цягніка метраў за 200 заўважыў прадмет, які свеціцца, і прымяніў экстраннае тармажэнне. Бяды ўдалося пазбегнуць, а небараку ўсяго толькі давядзецца заплаціць штраф за пераход чыгуначных пуцей у недазволеным месцы.

Яна СВЕТАВА.

ПЕРШЫ ГІПЕРМАРКЕТ У АБЛАСНЫМ ЦЭНТРЫ

1 лютага ў Магілёве адкрыўся гіпермаркет «Гиппо». Гэта першы гіпермаркет, які пабудаваны ў абласным цэнтры Беларусі.

Яго будаўніцтва пачалося напрыканцы 2005 года. Будынак і аўтастаянка ўзведзены на перакрыжаванні вуліц Маўчанскага і Габрыэўскай. Гандлёвая плошча магілёўскага гіпермаркета — 5,5 тысячы квадратных метраў. Асартымент тавараў, харчовых і прамысловых — больш за 45 тысяч. Іх цэны дырэкцыя акрэслівае як прымальныя.

У гіпермаркеце знайшлі працу каля трох соцень магілёўчан.

Ілона ІВАНОВА.

МАХЛЯРСТВА З АЛЕЕМ

Дзве сотні пачкаў алею з падробленымі звесткамі ўпёр індывідуальнаму прадпрымальніку сталічны дзялок.

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, 41-гадовы мінчанін «адкарэктаваў» на прадукце дату яго вырабу і спосаб, а таксама дадзеныя наконт якасці алею. «Прычасаўшы» такім чынам хадавы тавар, прайдзісвет без цяжкасцяў рэалізаваў падробку на рынку ГД «Ждановічы». У дачыненні да махінатара ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

А СУД «ПРЫКУРЫЦЬ»...

Жыхарцы вёскі Чырвоны Маяк, што ў Гомельскім раёне. І ў гэтым няма сумнення на той прычыне, што ў розных схованках яе хаты (у калідоры, на гарышчы, хлеўчуку і г.д.) работнікі праўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гомельскага аблвыканкама і інспекцыі па падатках і зборах выявілі 3868 пачкаў дарагіх цыгарэт на суму каля пяці мільёнаў рублёў. Усе яны былі замежнай вытворчасці і без акцызных марак. Жанчына, 1963 года нараджэння, нідзе не працавала і тытунёвымі вырабамі гандлявала дома. Вобыск быў зроблены па санкцыі пракуратуры. А напрадзе — суд, які, што цалкам магчыма, дасць «прыкурыць» зламысніцы «на поўную катушку». У адпаведнасці з Крымінальным кодэксам.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

У ЛЮТЫМ — ДВА ЗАЦЬМЕННІ

Адразу два зацьменні — сонечнае і месяцавае — чакаюцца ў лютым. Але, як паведамілі ў Абсерваторыі БДУ, беларусам пашчасціць убачыць толькі месяцавае — 21 лютага.

Кольцападобнае сонечнае зацьменне пачнецца 7 лютага ў 3 гадзіны 38 хвілін і закончыцца ў 6 гадзін 27 хвілін, аднак, на жаль, яно не будзе бачна на тэрыторыі рэспублікі. Паназіраць гэту прыгожую астранамічную з'яву, хоць і не такую яркую, як поўнае зацьменне, можна на паўднёвым усходзе Аўстраліі, у Новай Зеландыі, Антарктыдзе і на паўднёвым захадзе Ціхага акіяна. У такі час Месяц закрывае сонечны дыск не поўнасцю, а пакідае тонкі «вогненны» абадок.

А вось прыватнае месяцавае зацьменне пачнецца ў 3 гадзіны 43 хвіліны 21 лютага, у 5 гадзін 4 хвіліны наступіць поўнае зацьменне, якое дасягне свайго піку ў 5 гадзін 26 хвілін і закончыцца ў 7 гадзін 9 хвілін. Зацьменне найлепш будзе бачна ў Амерыцы, Заходняй Афрыцы, на паўднёвым захадзе Азіі і Еўропе. Немагчыма яго будзе назіраць ва Усходняй Азіі і ў Аўстраліі. Працягласць поўнай фазы — каля 51 хвіліны.

У Абсерваторыі БДУ адзначылі, што любое зацьменне (месяцавае або сонечнае) — гэта частковае або поўнае зацьменне аднаго нябеснага цела ценем або іншым нябесным целам. Сонечнае зацьменне мае месца тады, калі Месяц, за кошт праекцыі свайго дыска на дыск Сонца, закрывае сонечнае святло, якое ідзе да Зямлі. Месяцавае зацьменне — з'ява пагружэння Месяца ў конус зямнога цяню (Зямля пры гэтым знаходзіцца на лініі, якая злучае Сонца і Месяц), што суправаджаецца значным зніжэннем яркасці месяцавага дыска.

Зацьменні адбываюцца некалькі разоў на год цыклам: месяцавае або сонечнае або два месяцавыя і сонечнае або два сонечныя і месяцавае. Яны ідуць з інтэрвалам у два тыдні. У 2008 годзе зацьменняў павінна быць чатыры: два ў лютым і два ў жніўні.

З даўніх часоў зацьменні аказвалі на чалавека незабыўнае ўражанне, а ў некаторых народаў асацыяваліся з містычна-фатальнымі працэсамі. Напрыклад, у народаў Усходу лічылася, што ў момант зацьмення Свяшчэнны Дракон паглынае па чарзе Сонца і Месяц, і гэта зусім дакладна не абяцае нічога добрага — можа толькі наклікаць на Зямлю новыя беды, аж да сусветнай катастрофы.

Падобныя міфы даўно канулі ў вечнасць, але тым не менш астролагі не лічаць неспрыяльны ўплыў зацьменняў толькі састарэлым вымыслам містычна настроеных старажытных людзей. У індывідуальнай астралогіі зацьменні да гэтага часу застаюцца адмоўным фактарам, які мае тэндэнцыю дрэнна ўплываць на лёс і здароўе чалавека. Перыяд зацьменняў, а гэта дата першага і апошняга зацьмення плюс-мінус тыдзень, — асаблівы перыяд у жыцці людзей. Усё, што адбываецца ў гэтыя дні, носіць лёсавызначальны, фатальны характар. Яно можа мець доўгія наступствы, тэрмінам ад паўгода да 19 гадоў. Таму астролагі раяць перад тым, як што-небудзь зрабіць у гэты перыяд, добра падумаць, ці трэба вам гэта.

Чаму я чытаю «Звязду»

«Колькі ў газету ні зварталіся — яна заўсёды дапамагала»

Кацярына Фёдараўна Цімошчанка, пенсіянерка, пасёлак Красны Пільшчык Ельскага раёна:

— Газету выпісваю даўно, неаднойчы даводзілася звяртацца ў рэдакцыю па дапамогу і кожны раз нашы праблемы вырашаліся. Напрыклад, гадоў пяць таму вы перадалі мой ліст старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» Надзеі Ермаковай, пасля чаго мне дадому даслалі медаль ветэрана банка, падарунак, букет кветак, а да пенсіі штомесяц пачалі пералічваць адну базавую велічыню. А перадгісторыя такая. Па нейчаму загаду ў раёне скарацілі ўсе сельскія ашчадныя касы, у адной з якой я і працавала і кантралёрам, і загадчыкам. Да пенсіі не далі дапрацаваць тры гады. Паставілі на біржу, дзе пратрымалі 1 год і 9 месяцаў. Калі прыйшоў час афармляць пенсію, высветлілася, што я быццам і не ветэран сістэмы, маўляў, стаяла на біржы. Гэта я, адпрацаваўшы 34 гады?! Вось тады вы мне і дапамаглі аднавіць справядлівасць, хаця колішняе раённае кіраўніцтва было вельмі незадаволена маім зваротам у «Звязду». Дарэчы, і аналагічную праблему маёй сяброўкі адначасова вырашылі.

Яшчэ быў калісьці выпадак: не было ў магазіне дзіцячага харчавання, а ў мяне ж тры ўнучкі. Даводзілася ў райцэнтр за ім ездзіць, ды і там шмат не давалі. Як толькі «Звязда» закранула гэтую праблему, у краму столькі дзіцячага харчавання завезлі — дагэтуль стаіць *(смяецца)*.

Таму калі мне пачалі да пенсіі даплачваць адну базавую, сказала: у знак удзячнасці буду за гэтыя грошы заўсёды выпісваць «Звязду» *(смяецца)*. Нават нявестка мая выпісала яе, кажа, добрая газета! Вось толькі вярнулася ад суседкі, чытала ёй пра вясельны каравай з артыкула Крука і Катовіч, маўляў, у цябе ж дзеці дарослыя, глядзі, каб з тымі «шышкамі» ўсё як след атрымалася *(смяецца)*. Так, пенсія ў суседкі ўсяго 240 тысяч, лішніх грошай на газеты няма, таму хаджу, паказваю цікавыя артыкулы.

Я ў газеце цікаўлюся абсалютна ўсім, напэўна, толькі рубрыку пра аўтамабілі не чытаю. Навошта гэта бабе *(смяецца)*. Надвор'е, гараскоп, навіны, пра сад-агарод — усё вельмі падабаецца. Дзед вось крыжаванкі разгадвае любіць. Дзякуй вам за газету, дзякуй за дапамогу!

ЦІ ПРЫГОЖАЯ ЖАНЧЫНА — ВЫЗНАЧЫЦЬ СУД?

Сітуацыя

Што звычайна лічыць галоўным прадстаўніца цудоўнага полу ў сваім знешнім абліччы, доўга адгадваць не трэба. Вядома ж, прыгажосць. І калі хто-небудзь зробіць намёк ёй, што гэтага ў яе не зусім хапае або яно наогул адсутнічае, то крыўда ў жанчыны пранікае да глыбіні душы. А калі хто міжволі (неасцярожным словам ці неабдуманым учынкам або прамашкай), як кажуць, зробіць замах на яе прывабнасць, тут ужо можа разыграцца такое — такое... Як гэта здарылася летась у Мазыры. Прозвішчы герояў нашага артыкула з-за пікантнасці сітуацыі мы змянілі.

Была другая дэкада ліпеня, калі Алена Бялова наведалася ў касметычны салон індывідуальнай прадпрымальніцы Валянціны Сямковай. Ёй тэрмінова патрэбна было навесці «марафет» на твары (асвяжыць скуру). Каб яшчэ больш зачараваць свайго абранніка, бо ў пачатку жніўня павінна было адбыцца вяселле з ім. За работу ўзялася касметолаг Ніна Громава, якая, даведаўшыся аб прычыне візіту дзяўчыны, пабяцала ўсё зрабіць на самым вышэйшым узроўні.

Паслухаем Алену Бялову. Яна сцвярджае, што Громава пасадзіла яе ў спецыяльна абсталяванае крэсла і пачала рабіць нейкія працэдуры на твары і на пэўны час выйшла з кабінета. І тут на яе, Бялову, паліўся кіпень з апарата «Вапазон». У выніку яна атрымала тэрмічны апёк шыі. Гэта была трагедыя! Як яна будзе выглядаць на сваім вяселлі, як адаб'ецца ўсё на яе здароўі — страх аглушыў яе. Тым больш, што калі праз чатыры дні Алена прысутнічала на вяселлі родзіча яе будучага мужа, вымушана была не прыкрываць нічым той апёк, бо для яго хутчэйшага загойвання павінен быў быць доступ паветра.

Ды наогул доўгі час яна адчувала дыскамфорт. Не магла загараць, не магла паехаць з мужам на мора. І ўсё з-за гэтага праклятага апёку! Колькі перажыванняў, колькі страчаных сілаў, душэўных пакут — ведае толькі яна. Кампенсаваць гэту маральную шкоду ў стане толькі дзесяць мільёнаў рублёў. З чым і звярнулася ў суд Мазырскага раёна і горада Мазыра. Кампенсацыю фізічнага болю яна ацаніла ў 12 790 рублёў (пакупка лекавага прэпарата «Пантэнол», прызначанага ўрачом).

А зараз — слова Валянціне Сямковай і Ніне Громавай. Уладальніца салона і касметолаг гаворыць, што апёк шыі Бяловай адбыўся з-за яе няправільных дзеянняў. Алена ляжала на кушэтцы ў час правядзення працэдуры, і ніякая вада-кіпень на яе капаць не магла. І калі б яна не ўстала ў адсутнасць касметолага, якая выйшла на адну—дзве хвіліны з кабінета, дык пара з сопла апарата не апякла б яе шыю. На гэтае месца касметолаг нанесла спецыяльны крэм і спытала, ці можна працягваць працэдуру. Адказ быў станоўчым. Громава перажывала за стан здароўя кліенткі, вечарам таго ж дня і раніцай наступнага званіла ёй па тэлефоне дадому, дала ёй нумар свайго тэлефона для магчымай кансультацыі. Бялова не павінна была ўставаць з кушэткі. Яны, Сямкова і Громава, гатовы кампенсаваць маральную шкоду кліенткі ў суме, эквівалентнай двумстам долараў.

А вось што сказала дачка Алены Бяловай Соф'я. Касметолаг адсутнічала не адну—дзве хвіліны, а больш за пяць. І калі кіпень пачаў капаць на кушэтку, яна папярэдзіла аб гэтым маці, і тая ўстала. Соф'я шукала Громаву, але адразу знайсці яе не змагла.

Прывядзём судова-медыцынскія заключэнні. Экспертыза патлумачыла: вызначыць, ад чаго ўзнік апёк (ад вады-кіпеню ці гарачай пары апарата «Вапазон») немагчыма. Але факт застаецца фактам: Алена Бялова атрымала тэрмічны апёк пярэдняй паверхні шыі (каля аднаго працэнта яе), які адносіцца да катэгорыі першай—другой ступені цяжкасці, што азначае — лёгкія цялесныя пашкоджанні, якія не прывялі да кароткачасовага расстройства здароўя. У той жа час трэба прызнаць, што пачырваненне на шыі ісціцы выклікана яе індывідуальнымі асаблівасцямі і нельга сказаць, што гэта — вынік апёку, бо тое пачырваненне ўзнікае і ў іншых месцах шыі. Падобныя апёкі зажываюць, не ўтвараючы рубцоў і не выклікаючы іншых небяспечных вынікаў. Касметолаг Ніна Громава, згодна з інструкцыяй па ахове яе працы, не павінна была пакідаць кліентку без свайго назірання.

Судовыя рашэнні. На пасяджэнні суда першай інстанцыі абодвум бакам (ісціцы і адказчыцы, у ролі якой выступала індывідуальны прадпрымальнік) было прапанавана заключыць міравое пагадненне. Бялова пагадзілася на кампенсацыю ў два мільёны рублёў, Сямкова настойвала на двухстах долараў. Процістаянне, адным словам.

Суд улічыў усе абставіны справы: характар прычыненых кліентцы фізічных і маральных пакут, патрабаванні разумнасці і справядлівасці і вырашыў спагнаць з уладальніцы салона на карысць пацярпелай 592 790 рублёў і 93 640 рублёў пошліны на карысць дзяржавы. Бялову гэта не задаволіла, і ў касацыйнай скарзе ў абласны суд яна настойвала на тых двух мільёнах рублёў, але атрымала адмову.

Ну што тут скажаш? Толькі адно: прыгажосць — страшная сіла!

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ТАЯМНІЦЫ, ЗНЕСЕНЫЯ Ў МАГІЛУ

Пра тое, што ў Драгічынскім раёне здарылася два забойствы адзінокіх пенсіянерак, інфармацыя прайшла па ўсіх СМІ і ўжо нават затрыманы падазроныя, яны даюць паказанні і быццам бы прызналіся ў яшчэ некалькіх аналагічных злачынствах. Гэта афіцыйны бок справы, а як яно там было, пакажа следства і суд. І з гэтай прычыны мы не будзем спяшацца з высновамі, а звернем увагу на адзін фактар, які датычыцца смерці старых людзей.

Калі ў вёсцы Аляксеевічы памерла 76-гадовая Вольга Супруновіч, то ў родных яе смерць выклікала падазрэнне. Твар у крывападцёках, вырваная засаўка, украдзены грошы і рэчы. Супрацоўнікі міліцыі хутка ўстанавілі, што старую задушылі. А вось з другой пенсіянеркай усё было складаней.

У 70-гадовай Марыі Азарчук родных не было, яе пахаваў сельгаскааператыў «Іменінскі», а праз 33 дні пасля смерці прыйшлося рабіць эксгумацыю (даставанне трупа з магілы для медыцынскай экспертызы), бо пасля забойства 5 студзеня пенсіянеркі ў Аляксеевічах узнікла падазрэнне, што не сваёй смерцю памерла і Марыя Азарчук. Хоць калі ў яе хату зайшлі суседкі, то ўбачылі, што пенсіянерка ляжыць каля ложка на падлозе, а нос і рот у яе пасінелыя. Мёртвую прыбралі ў апошні шлях і пахавалі.

У горадзе ўсё проста — прыязджае «куткая дапамога» і канстатуе факт смерці. У вёсцы, калі памірае стары чалавек, найчасцей ніхто гэтага не робіць. Нехта з блізкіх ці знаёмых ідзе на ФАП і там яму выдаюць даведку, што стары памёр, напрыклад, ад хваробы сэрца. А ўлічваючы, што на старасці ў кожнага нейкая балячка ёсць, ды калі чалавек яшчэ звяртаўся ў ФАП ці амбулаторыю, то ніякіх сумненняў і падазрэнняў факт смерці чалавека на восьмым дзесятку не выклікае. Пажыў стары, то чаго яшчэ хацеў?

Можна з упэўненасцю сказаць: калі б на самым пачатку была ўстаноўлена прычына смерці першай ахвяры, то не было б і наступных.

І канстатацыя смерці пакінае датычыцца не толькі адзінокіх, але і ўсіх старых, якія памерлі, — непасрэдна на месцы.

Фактаў гвалту над пенсіянерамі шмат, але часта яны не маюць агалоскі. Старая памерла, а калі суседкі пачалі абмываць яе, то ўбачылі, што ўсё цела ў сіняках. Памылі, апранулі дый у труну паклалі. І папаўзла па вёсцы чутка, што гэта нявестка з сынам на гарэлку пенсію ў старой «прасілі». А дзе быў хоць нехта з медработнікаў? Спецыялісту дастаткова паглядзець на нябожчыка, каб зрабіць нейкае заключэнне. Вось чаму выезд фельчара ці ўрача для візуальнага абследавання памерлага абавязковы. Заключэнне медработнік павінен даваць не завочна, а толькі абследаваўшы нябожчыка, каб выявіць магчымыя сляды гвалту. Так патрабуе закон.

Думаю, тут толькі адна праблема. Многія вёскі ад таго ж ФАПа знаходзяцца за дзесяць ці болей кіламетраў і дабірацца да іх няпроста, але ж па даведку нехта прыязджае, бо пахаванне надоўга не адкладваецца. Ды і «куткая дапамога» ў райцэнтрах працуе спраўна. Ва ўсякім разе яшчэ ніводзін галоўны ўрач райбальніцы не сказаў, што ёсць праблемы з выездам да хворага.

Не будзем забываць, што наша грамадства яшчэ не зусім адкрытае і з гэтай прычыны мы часта не хочам умешвацца ў тое, што нас не датычыцца. Лічым за лепшае адысці ў бок, чым афіцыйна заявіць аб сваіх падазрэннях. Тут часам праглядаецца і пэўны недавер да праваахоўных органаў.

Трагічныя факты расправы з адзінокімі пенсіянерамі ў Драгічынскім раёне паказалі, што праблема, найперш, узнікла з-за недагляду, абыякавасці работнікаў медыцынскай структуры ў вёсцы. І гэта датычыцца не толькі аднаго раёна. Аналагічная сітуацыя і ў іншых. А колькі па гэтай прычыне старых знесла тайну сваёй смерці ў магілу, ніхто не ведае.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

КАШУЛЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Простыя рэчы

У беларускай мове існуе дзве нібы раўназначныя назвы гэтага віду мужчынскай і жаночай вопраткі. «Кашуля» і «сарочка». Здаецца, раўназначныя. Але, на мой погляд, сарочка больш адпавядае сподняму адзенню, асабліва ў жаночай вопратцы. Дазвольце такі крыху гарэзлівы ўспамін з прачытанага некалі рамана Самерсэта Маэма «Тэатр». Гераіня, актрыса, у цягніку ў асобным, для яе прызначаным, купэ саступае настойліваму паклонніку. Не-не, не жадаючы гэтага. Але ж саступае... І вось яе перажыванні пасля гэтага. Не-не, не пра здраду мужу. Яна перажывае, што магла б апрануць старую сарочку, але вось нешта падказала — і апранула новую.

Гавораць жа: нарадзіўся (менавіта) у сарочцы. А яшчэ ёсць праклён — каб цябе сарочка не чапала. А знешнюю абалонку сэрца называюць сардэчнай сарочкай. І ў той жа час існуе трывалае ўжыванне слова сарочка, якое датычыцца менавіта той вопраткі, якую носяць зверху, якая можа быць упрыгожаннем. У Алеся Александровіча:

Табе вышыла сарочку
Цветам васільковым
І саткала паясочак
З нітак каляровых.

Не кранаючы нашых вельмі далёкіх папярэднікаў, а зазірнуўшы толькі на некалькі стагоддзяў назад, прызнаем, што сарочка-кашуля была першай вопраткай немаўляці, калі выходзіла яно са стану спавівання, пазбаўлялася палюшак. Часам аж да першага пастушковага ўзросту гэта і было ў дзіцяці адзіным адзеннем. Гэта ад нішчымніцы тых стагоддзяў. Але наша этнаграфічная літаратура настойліва падае, што менавіта кашуля сталася важным паказчыкам спецыфікі матэрыяльнай культуры беларусаў. Безумоўна, асновай гэтага адзення служыла льняное даматкане палатно, зразумела, найлепшай якасці, бо яно ж бліжэй за ўсё да цела, яно не муліць, яно пот у час работы ў сябе забірае. Некалі ў сямідзесятых гадах мінулага стагоддзя паболела ў нашых мясцінах гасцей з суседняй Польшчы, з Амерыкі, іншых краін. Прыязджалі на радзіму (стала дазволеным) беларусы, якія збегам абставінаў апынуліся ад яе далёка. Нам, журналістам, цікава было назіраць іх сустрэчы з роднымі і сваякамі. Я не заўважаў, а мае калегі-жанчыны прыкмецілі: госці, хоць і нябедныя, апраналі менавіта ўсё натуральнае, ільняное, асабліва кашулі. Хоць і камечыцца хутка, але ж затое целу прыемна. У нас жа ў той час у самым разгары была мода на нейлонаваныя кашулі. Неяк, шукаючы нешта ў мацяных шафах, натрапіў на іх. Памацаў пальцамі. Як мы такое маглі насіць? Ды яшчэ ў спёку? Але ж было модным.

А кашуля сапраўднага беларускага строю была трох тыпаў: тунікападобная, з прамымі плечавымі ўстаўкамі, з гесткай, якая злучала дзве яе паловы. Былі кашулі з адкладным каўняром, са стаячым каўняром, былі без каўняра. Але не магла абысціся кашуля без вышывання, у асноўным чырвоным і чорным колерамі. У народнай паэзіі не злічыць прыкладаў менавіта гэтага. Вось праводзіць дзяўчына старэйшага брата на службу ў войска:

Я каўнер вышывала
Свайму большаму брату.
У каўнярочку вышыла
А я жаркае сонца.
У рукавочку вышыла
А я ясны месячык.
У падалочку вышыла
А я дробныя звёзды.

І ўсё мае значэнне. Ад сонейка рэкруту будзе цёпла, ад месяца відна, а ад зорак весела. Ну, як тут не ўтрымацца і не працытаваць Багдановічава?

У Максіма на кашулі
вышыты галубкі;
Я за тое вышывала,
што цалуе губкі.
У Максіма на кашулі
вышыты лісточкі;
Я за тое вышывала,
што цалуе вочкі.
У Максіма на кашулі
вышыты падкоўкі;
Я за тое вышывала,
што цалуе броўкі.

І ўсё! Але не дасягнуць вам ніколі гэтай цнатлівасці і пекнаты — тыя, хто бяздумна таўчэцца пад песні, дзе таксама нехта нешта цалуе.

Між іншым, у народнай паэзіі ёсць прыклады і іншага кшталту. Напрыклад:

А Лявоніха не жонка была,
Не мытую
мне кашулю дала, —
Не мытую, не качаную,
У суседа пазычаную.

Як бы там цяжка і беспрасветна ні жылі (па некаторых развагах) нашы папярэднікі-беларусы, але ў лазню хадзілі яны рэгулярна. І свежая, памытая, выкачаная драўляным рублём кашуля ў кожнага была абавязкова. Вось у жартаўлівай народнай песні:

Убралася бабка
Ды ў белае белле.
— Цяпер вядзі, дзед, мяне
З сабой на вяселле.

Чалавек, які шмат працуе фізічна, пад потам, як гавораць у народзе, разумее па-сапраўднаму, якую асалоду прыносіць тое ж мыццё ў лазні, пасля якой абавязкова трэба апрануцца — не ў новае, але мытае і свежае. А чаму толькі людзі цяжкай працы? Некалі Уладзімір Маякоўскі сваім нядобразычліўцам кінуў: «И кроме свежевымытой сорочки мне в этом мире ничего не надо». Безумоўна, паэтычная гіпербала. Але ж за ёй стаіць сапраўднае жыццё.

Пішучы пра такую простую рэч, як кашуля, я прыкінуў: а пакаленне, да якога я належу? Мы ж таксама за свае пяцьдзесят з нечым гадоў прайшлі праз розныя этапы не — моды, а проста адносінаў да кашулі. Заспелі мы і дамаканыя. Але ў школу нас бацькі адпраўлялі ўжо ў баваўняных — у клетачку ці паласку — кашульках. Мы насілі з сабою ў школу нарукаўнікі. Сённяшнім чытачам гэта малазразумела. Нарукаўнік — гэта такое, найчасцей з паркалю чорнага колеру, прыстасаванне, якое надзявалася ніжэй ад локця і да манжэта, каб не выціралася летам кашуля, а зімою пінжак вучня. Потым сталі трапляцца для кашуль штапель, байка, у больш заможных вучняў і шаўковыя кашулі. Бацька, якому два гады давялося выпадкова праслужыць сяржантам звыштэрміновай службы ў Польшчы, прывёз мне на кашулю тонкага вельвету. Гэта было вельмі шыкоўна. А потым прыйшла і адышла мода на хімію. Дзецюкамі мы пацяжы пачалі прышпіляць да сваіх кашуль і гальштукі. Але ў нашым правінцыйным асяроддзі гэта неяк не прывілося. Наколькі бачу са старых фатаздымкаў, пры гальштуку я ў дзень заканчэння школы, у дзень вяселля, у дзень, калі мяне прымалі ў рады Камуністычнай партыі — тут, помніцца, перад фатаграфаваннем я гальштук пазычыў, інакш нельга было — ды вось і ўсё. Хоць, прызнаюся, мужчын, якія носяць строгія касцюмы, белыя сарочкі і ўмела падабраныя гальштукі, паважаю. Сустракаеш такога чалавека — і ўзнікае разуменне, што гэта не проста будзённая сустрэча. Гэта альбо важная (для цябе) справа, альбо чарговая (для цябе) непрыемнасць, альбо ты са сваёй кваліфікацыяй кашуляй і швэдрам зноў патрапіў не ў сваю кампанію.

І камізэлька да кашулі. Наколькі помню, тыя касцюмы называліся «тройкамі». Гэта значыць: нагавіцы, пінжак і камізэлька. У сваёй маладой яшчэ дарослаці неяк набыў і я такую «тройку». Як выглядаў у ёй — меркаваць не мне. Але нязручнасцяў хапала. І перш за ўсё з-за таго, што кашуля пастаянна выпаўзае з-пад гэтай камізэлькі. Напэўна, для таго адзення патрэбен і адпаведны разварот — каб не было лішніх і занадта спрытных рухаў, каб ты сябе паводзіў паважна, адпаведна апранутаму. Але, але... і нашы папярэднікі са сваімі кашулямі з самаробнага палатна ўмелі насіць і камізэлькі. Зноў жа з любімай мною «Новай зямлі» Якуба Коласа. У леснічоўцы рыхтуюцца сустракаць гасцей. І:

А для гасцей святой нядзелькі
Надзелі новыя камзэлькі.

Вайсковы строй кашулі — гімнасцёрка. Было, прапатнела сотні разоў за часы службы яна і на маіх плячах. І ўвогуле ў паэзіі, асабліва расійскай, шмат радкоў менавіта пра гімнасцёрку. Ну а песень колькі! Хоць бы тая класічная, у якой гаворыцца пра таго, хто з пагорачка спусціўся. А мне ўспомніліся радкі ранняга, ваенных часоў Пімена Панчанкі. Адшукаў у зборы яго твораў:

І калі будзе яму горка
Ці сэрца зойдзецца ад крыўды, —
Успомніць кроў на гімнасцёрках
І вочы, што землёй пакрыты.

Тагачасная, ваенная паэзія проста «геройствавала», услаўляла, заклікала. А Панчанка як прадбачыў, што напрадзе ў ветэранаў самай вялікай вайны не толькі слава. Відаць, таму тэма гэтыя радкі і запомніліся яшчэ са студэнцкіх гадоў.

Сёння хрысцяць дзяцей, не хаваючыся, спадзяюся, і не для моды. І вось калі пасля святой вазіцы атрымлівае немаўля крыжык, а потым апранаюць на яго сарочку, прыліпае яна да мокрага цельца — вельмі хвалюючы момант. І заўсёдна спадзяванне, што гэтай хрышчонай душы наканаваны спакой і шчасце.

Алесь КАСЦЕНЬ.

Вёска Касцяні Пастаўскага раёна.

ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ



МІХАСЬ І БУДУЧЫНЯ

Міхась старанна чакаў лепшых часоў. Ён чакаў так доўга, што і сам не заўважыў, як стаў чакаць лепшага не ў нашым, а ў іншым свеце. У гадзіны роспачы Міхась набывае латарэйныя квіткі і дорыць жонцы.

БАРМЕН І РЭШТА

Барселонскі бармен узяў дый насыпаў мне поўную жменю грошай. Не скажу, што тамака была вялікая сума, і ўсё ж прыемна трымаць на далоні важкія манеты. Я замовіў у вакзальным барчыку адну каву, можна было і віскі замовіць, але я люблю ў апошнюю хвіліну перад адпраўкаю цягніка глынуць горкай і вогненнай кавы. Глыток бадзёрасці ніколі не зашкодзіць у дарозе. Папрасіў я экспрэса, выклаў купюру, а бармен — завушніца ў адным вуху — насыпаў мне песетаў, якія цяперака еўра. Шкада толькі — еўра былі не мае, а суседа па барнай стойцы. Давялося аддаваць.

ВАЛОДЗЯ І ТРЫСТА СЛОНІКАЎ

Схільнасць да працы з дробнай пластыкай у Валодзі была заўсёды. Вучачыся на першым курсе мастацкай вучэльні, ён зляпіў з каляровага пластыліну цэлую хакейную каманду і падарыў тых сіне-чырвоных хакеістаў майму чатырохгадоваму брату. Той прасіў зляпіць яшчэ іншаколерных гульцоў, каб займець магчымасць забаўляцца ў настольны хакей чорным гузікам замест шайбы. Валодзя сеў і зляпіў зялёна-чырвоных ліліпутаў з драцянымі клюшкамі. Слава аматара цацачнай скульптуры ў Валодзі была вялікая, таму ён і не здзівіўся, што перад Новым годам да яго ў майстэрню завітаў салідны мужчына ў касцюме і гальштуку. Той мужчына і замовіў ажно трыста слонікаў з шамоту. За кожнага слоніка паабяцаў заплаціць тры рублі. Валодзя ляпіў, ён ляпіў і ляпіў слонікаў, ажно пакуль не сцяміў, што трыста скульптурак у тэрмін ён адзін не зробіць. Нават падключыўшы сяброў-аднакурснікаў, ён не выканае замову ў тэрмін. Таму слонікаў ляпілі ўсе скульптары мастацкай вучэльні тры дні і тры ночы. Зляпілі, а замоўца не прыйшоў. А яшчэ высветлілася, што Валодзя не ведае, як таго замоўцу завуць і дзе яго шукаць. Спадзевы, што нехта жорстка пажартаваў з нашых скульптараў, таксама не спраўдзіліся. Так і засталіся шамотныя слонікі ў скульптурнай майстэрні стаяць. Так і стаялі напамінам, што не ўсе замовы эканамічна выгадныя.

ЧАЛАВЕК І СТРАХ

У Гатычным квартале Барселоны страшных людзей хапае. Але калі ты там гуляеш часцяком на працягу чатырнаццаці гадоў, дык паціху-патроху прывыкаеш да самых рознаблічных персанажаў. Здаецца, нічым цябе ўжо не здзівіш і нішто цябе ўжо не ўразіць, толькі Гатычны квартал можа і ўразіць і напалохаць. Па вузкай вулцы насустрач мне ішоў высокі худы мужчына са звераватым тварам. Выраз твару ў яго быў такі, што хацелася залезці на сцяну. І гэта быў менавіта выраз на досыць прывабным і правільным тварам. Мужчына набліжаўся да мяне, размахваючы вялізным кулаком. І тут я ўбачыў, што ў руцэ ён сціскае тоўстую змяю. Змяіная галава вытыркалася з кулака, а цела тугімі коламі абвілося вакол запясця. Страшнатвары прайшоў паўз мяне, ледзь не зачапіўшы мяне змяюкаю. Добра, што апошнім часам я перастаў баяцца змей, а так бы мог і памерці ад пераляку.

АПЕЛЕС, ПРАТАГЕН І СЦЯНА

Аднойчы Апелес прыйшоў да Пратагена і, не заспеўшы таго дома, узяў пэндзаль з жоўтай фарбаю і правёў па яго сцяне тонкую-тонкую лінію. Вярнуўшыся дамоў, Пратаген зразумеў: толькі Апелес мог пісаць так тонка! — схапіў пэндзаль і правёў па Апелесавай лініі яшчэ больш тонкую сваю, чырвоную. На другі дзень зноў прыйшоў Апелес, пабачыў лінію ў лініі і ўпісаў у іх яшчэ адну, чорную, самую тонкую. Пратаген прызнаў сваю паразу. Кавалак сцяны, на якім спаборнічалі мастакі, пасля быў асцярожна выразаны, і ў галерэі імператара Аўгуста сярод шматфігурных міфалагічных карцін гэты белы квадрат з трыма тонкімі лініямі здаваўся зусім пустым і выклікаў асаблівае захапленне... Чытаеш такое і згадваюцца сучасныя мастакі, якія адзін за адным спрабавалі стварыць пусты квадрат з тонкімі ды найтанчэйшымі лініямі. Стваральнікаў квадратаў стала столькі, што на выставах не засталося месца для шматфігурных карцін на біблейскія і міфалагічныя сюжэты. Чым болей з'яўлялася квадратаў, тым меншае захапленне яны выклікалі. Расчараваныя ў квадратах гледачы павярнуліся творамі да шматколерных ды пазалочаных абразоў. Тады хітравокія мастакі навыперадкі пачалі пісаць шматфігурныя абразы вялікіх памераў. Абразоў стала столькі, што вочы самі шукаюць неабрэкламленую і не завешаную абразамі чыстую сцяну...

КРАЎЧАНКА І СЛОВА

У маладосці я запойна чытаў дэтэктывы. Сярод іх прамільгнуў і раман Войтэха Стэклача «Як забіць залатога салаўя». Акрамя крымінальнай інтрыгі ў рамане дакладна апісвалася пражскае музычнае асяроддзе. Маладыя музыкі стваралі біт-ансамблі, каб змагацца з засільлем псеўда-фальклорных калектыўчыкаў. Пазней галоўны герой скажа: «Лепшыя з нас пачалі граць джаз і джаз-рок, а самыя разумныя заняліся стварэннем чэшскай папулярнай музыкі. Я ніколі не належаў да лепшых і разумных...» Нешта падобнае адбывалася і ў Беларусі. Стваралісь рок-гурты, якія супрацьстаялі афіцыйнай эстрадзе. «Мы не будзем іграць мёртвыя ноты! Мы не будзем спяваць мёртвыя словы!» — казаў мне Сяржук Краўчанка, бас-гітарыст з гурта «Бонда». Музыка «Бонды» была жывая. І раптам словы прапалі, і «лепшыя» зайгралі джаз, а «разумныя» перасунуліся ў папсу. Але ні там і ні там не было сапраўднага і жывога слова, былі тэксты і тэксцікі, рыфмы і рытмы, а слова і выразнасці не было. Краўчанка пайшоў гандляваць музычнымі інструментамі. Разумею.

Адам ГЛОБУС.

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Пагоня

У залатым полі збройная рука натуральная з мячом у замаху выходзіць з-за блакітнага воблака.

Гербам ПАГОНЯ карысталіся: Алелькавіч, Андрайковіч, Біцютка, Варатынец, Гедымін/Гедзімін, Загурскі, Залескі, Залуцкі, Карэцкі, Клаеўскі, Кундзіч, Куракін, Мсціслаўскі, Паклонскі, Пастаўка, Пачабут-Адляніцкі, Пацёмкін, Пліскоўскі, Пяркоўскі, Раплінскі, Роланд, Рыбіцкі, Сангушка, Сандэцкі, Семяновіч, Стэфановіч, Чорба, Шварц, Ягела, Янчура.

Пазняк

У чырвоным полі рыцар у срэбных латах, прабіты стралою праз грудзі навылет злева направа.

Гербам ПАЗНЯК карысталіся: Апазнанскі, Пазняк, Пазнякоўскі, Паслевіч, Процкі.

Палукоз

У чырвоным полі чорная асліная галава прама.

Гербам ПАЛУКОЗ карысталіся: Бобрык, Богуш, Бржастоўскі/Берастоўскі, Ваенскі, Ваўчок, Велявейскі, Вольскі, Грабоўскі, Гутоўскі, Жалязоўскі, Завіша, Закрэўскі, Кукель, Курадоўскі, Ліпніцкі, Невяроўскі, Нівінскі, Патрыкоўскі, Паўлоўскі, Пшэрадоўскі/Прарадоўскі, Пястрэцкі, Свіндзінскі, Свідэрскі, Свяжынскі, Стралкоўскі, Стрыгоцкі, Улодак, Хмялеўскі, Юркоўскі.

Памян



У залатым полі чорная зубраная галава, працятая мячом зверху ўніз, тронкі мяча залатыя.

Гербам ПАМЯН карысталіся: Альшэўскі, Асецкі, Астраменцкі, Асухоўскі, Бачкоўскі, Бржазоўскі/Беразоўскі, Вольскі, Воўк-Курачэўскі, Глінскі, Горскі, Грабоўскі, Грахоўскі, Дамброўскі/Дуброўскі, Длужнеўскі, Закрэўскі, Зданоўскі, Зубоўскі, Іздэбскі, Калкоўскі, Камінскі, Качынскі, Клапатоўскі, Крушынскі, Кяльчэўскі, Ліноўскі, Макавецкі, Маляўскі, Мілеўскі, Пажарскі, Памазанскі, Памян, Петрашкевіч, Пржацлаўскі, Прыстаноўскі, Пузіноўскі, Пяткевіч, Радзішэўскі, Радзялоўскі, Сакалоўскі, Саковіч, Свяржаўскі, Серафіновіч, Сіцінскі, Скрага, Сускі, Юрага, Язвінскі, Язмінскі, Янчэўскі.

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

УТВЕРЖДЕНО
Наблюдательный совет ОАО «АСБ Беларусбанк» 27 декабря 2007 года протокол № 27

ЗАВЕРЯЮ
Начальник управления по ценным бумагам Главного управления Министерства финансов РБ по г. Минску
_____В.Н. Омельянович
09 января 2008 года

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций **тридцать четвертого, тридцать пятого, тридцать шестого и тридцать седьмого** выпусков Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк»

1. Наименование эмитента

на русском языке:

полное: Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (в дальнейшем именуемое «Банк»);

сокращенное: ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк» (ОАО «АСБ Беларусбанк»);

на белорусском языке:

полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк»;

сокращенное: ААТ «Акцыянерны Ашчадны банк «Беларусбанк» (ААТ «ААБ Беларусбанк»).

2. Банк зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 27.10.1995. Регистрационный номер 56.

3. Место нахождения эмитента, телефон, электронный адрес

Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32. Телефон — (017) 218-84-08, телефон / факс — (017) 222-26-26. E-mail — info@belarusbank.by

4. Основные виды и срок деятельности эмитента

В соответствии с законодательством Республики Беларусь и на основании лицензии Национального банка Республики Беларусь Банк осуществляет следующие банковские операции:

— привлечение денежных средств физических и юридических лиц во вклады (депозиты);

— размещение привлеченных денежных средств от своего имени и за свой счет на условиях возвратности, платности и срочности;

— открытие и ведение банковских счетов физических и юридических лиц;

— открытие и ведение счетов в драгоценных металлах;

— осуществление расчетного и кассового обслуживания физических и юридических лиц, в том числе банков-корреспондентов;

— валютно-обменные операции;

— купля-продажа драгоценных металлов в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь;

— привлечение и размещение драгоценных металлов во вклады (депозиты);

— выдача банковских гарантий;

— доверительное управление денежными средствами по договору доверительного управления денежными средствами;

— инкассация наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и иных ценностей;

— выпуск в обращение банковских пластиковых карточек;

— выдача ценных бумаг, подтверждающих привлечение денежных средств во вклады (депозиты) и размещение их на счета;

— финансирование под уступку денежного требования (факторинг);

— предоставление физическим и юридическим лицам специальных помещений или находящихся в них сейфов для банковского хранения документов и ценностей (денежных средств, ценных бумаг, драгоценных металлов и драгоценных камней и др.);

— перевозка наличных денежных средств, платежных инструкций, драгоценных металлов и драгоценных камней и иных ценностей между банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями, их обособленными и структурными подразделениями, а также доставка таких ценностей клиентам Банка и небанковских кредитно-финансовых организаций.

Помимо банковских операций Банк вправе осуществлять в соответствии с законодательством Республики Беларусь:

— поручительство за третьих лиц, предусматривающее исполнение обязательств в денежной форме;

— доверительное управление драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;

— операции (сделки) с драгоценными металлами и (или) драгоценными камнями;

— лизинговую деятельность;

— консультационные и информационные услуги;

— выпуск (эмиссию), продажу, покупку ценных бумаг и иные операции с ценными бумагами;

— продажу лотерейных билетов;

— иную деятельность, предусмотренную законодательством Республики Беларусь.

Банк может осуществлять отдельные виды деятельности, перечень которых определяется законодательными актами Республики Беларусь, только на основании специального разрешения (лицензии).

Банк вправе осуществлять производственную и (или) торговую деятельность для собственных нужд, а также в случаях, предусмотренных законодательными актами Республики Беларусь.

Банк осуществляет следующие виды деятельности в соответствии с Общегосударственным классификатором видов экономической деятельности Республики Беларусь:

— страховое посредничество (деятельность страхового агента);

— сдача внаем собственного недвижимого имущества.

Срок деятельности Банка не ограничен.

5. Основные показатели финансово-хозяйственной деятельности Банка:

Показатели	*2006 год*	*на 01.10.2007*
Прибыль, млн руб.	122 126,3	119 134,7
Рентабельность, %	10,1	11,4

6. Объем эмиссии, количество и вид облигаций

Объем эмиссии облигаций Банка 34-го выпуска — 15 000 000 000 (Пятнадцать миллиардов) белорусских рублей;

количество — **15 000** (Пятнадцать тысяч) облигаций. Серия «**БД»,** номера «**000 001—015 000**»;

вид — неконвертируемые процентные облигации на предъявителя.

Объем эмиссии облигаций Банка 35-го выпуска — 10 000 000 000 (Десять миллиардов) белорусских рублей;

количество — **20 000** (Двадцать тысяч) облигаций. Серия «**БЕ»,** номера «**000 001-020 000**»;

вид — неконвертируемые процентные облигации на предъявителя.

Объем эмиссии облигаций Банка 36-го выпуска — 7 000 000 000 (Семь миллиардов) белорусских рублей;

количество — **35 000** (Тридцать пять тысяч) облигаций. Серия «**БЖ»,** номера «**000 001—035 000**»;

вид — неконвертируемые процентные облигации на предъявителя.

Объем эмиссии облигаций Банка 37-го выпуска — 3 000 000 000 (Три миллиарда) белорусских рублей;

количество — **30 000** (Тридцать тысяч) облигаций. Серия «**БЗ»,** номера «**000 001—030 000**»;

вид — неконвертируемые процентные облигации на предъявителя.

7. Номинальная стоимость облигаций

34-го выпуска — 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости — 1 000 000 (Один миллион) белорусских рублей;

35-го выпуска — 500 000 (Пятьсот тысяч) белорусских рублей. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости — 500 000 (Пятьсот тысяч) белорусских рублей;

36-го выпуска — 200 000 (Двести тысяч) белорусских рублей. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости — 200 000 (Двести тысяч) белорусских рублей;

37-го выпуска — 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей. В течение всего срока открытой продажи облигации продаются первому их собственнику по номинальной стоимости — 100 000 (Сто тысяч) белорусских рублей.

8. Условия обеспеченности облигационного займа

Облигации выпускаются Банком под обеспечение. Исполнение обязательств Банка по облигациям 34—37 выпусков обеспечивается нижеуказанными способами на общую сумму **37,8 млрд. руб**.:

8.1. **поручительством (по облигациям 34-го, 35-го, 37-го выпусков)**:

— Сельскохозяйственного частного унитарного предприятия «АСБ Первая весна» на сумму **15 (Пятнадцать) млрд. руб.** сроком по 01.03.2011 по облигациям **34-го** выпуска;

— Сельскохозяйственного частного унитарного предприятия «АСБ Тетерино» на сумму **10 (Десять) млрд. руб.** сроком по 01.03.2011 по облигациям **35-го** выпуска;

— Сельскохозяйственного частного унитарного предприятия «АСБ Тетерино» на сумму **3 (Три) млрд. руб.** сроком по 01.03.2011 по облигациям **37-го** выпуска;

8.2**. залогом (ипотекой) недвижимого имущества (по облигациям 36-го выпуска):**

Предметом залога является принадлежащее Банку на праве собственности административное здание по ул. Сурганова, 66 в г. Минске общей площадью 2983,8 кв.м оценочной стоимостью **9 827 350 982** (Девять миллиардов восемьсот двадцать семь миллионов триста пятьдесят тысяч девятьсот восемьдесят два) белорусских рубля, в том числе: оценочная стоимость первой части административного здания по ул. Сурганова, 66 в г. Минске (инв. № 4421) в сумме 2 909 947 492 белорусских рубля; оценочная стоимость второй части административного здания по ул. Сурганова, 66 в г. Минске (инв. № 10011) в сумме 6 917 403 490 белорусских рублей (Акт оценки основного средства филиала № 520 ОАО «АСБ Беларусбанк», передаваемых в залог в качестве обеспечения запланированного объема эмиссии документарных облигаций ОАО «АСБ Беларусбанк» на предъявителя для физических лиц от 17.12.2007).

Банк вправе обеспечивать вышеуказанным предметом залога (ипотеки) иные свои обязательства в размере не более разницы между стоимостью данного предмета залога и требуемым размером обеспечения обязательств Банка по облигациям 36-го выпуска, обеспеченных названным предметом залога (последующий залог). Владельцы облигаций Банка 36-го выпуска согласны на передачу вышеуказанного предмета залога в последующие залоги.

Названный залог (ипотека) прекращается с момента вступления в силу акта законодательства, предоставляющего право банкам выпускать свои облигации без их обеспечения.

9. Начальный срок открытой продажи облигаций

Начальный срок открытой продажи облигаций 34-го, 35-го, 36-го и 37-го выпусков (далее — облигации) — **01.03.2008.**

10. Место и время проведения открытой продажи облигаций

Первичное размещение облигаций производится филиалами Банка, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, его филиалами и центрами банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка с **01 марта 2008 года по 31 мая 2009 года**, если больший срок не будет определен Правлением Банка.

Первичное размещение облигаций осуществляется путем их открытой продажи ежедневно в течение операционного дня до момента полной реализации всего объема эмиссии облигаций.

Владельцами облигаций могут быть физические лица – резиденты и нерезиденты, приобретающие их не в целях предпринимательской деятельности (далее — физические лица), РУП «Белорусские лотереи», РУП «Национальные спортивные лотереи» и Банк.

11. Порядок оплаты облигаций

Физические лица, изъявившие желание приобрести облигации не в целях предпринимательской деятельности, обязаны внести наличными либо перечислить в Банк в безналичном порядке денежные средства в оплату облигаций.

РУП «Белорусские лотереи» и РУП «Национальные спортивные лотереи» для приобретения облигаций обязаны перечислить в Банк в безналичном порядке денежные средства в оплату облигаций.

Денежные средства от первичной продажи облигаций будут поступать на соответствующие счета в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка.

12. Срок обращения облигаций

Срок обращения облигаций — **с 01.03.2008 по 31.08.2010**.

13. Условия и размер выплаты дохода по облигациям и порядок его определения

Выплата дохода по облигации производится в виде купонного дохода при условии предъявления физическим лицом оригинала облигации периодически:

по облигациям 34-го выпуска — один раз в три месяца;

по облигациям 35-го, 36-го, 37-го выпусков — один раз в шесть месяцев.

Днем начала выплаты соответствующего купонного дохода является первый рабочий день после истечения определенного купонного периода, то есть истечения трех месяцев (по облигациям 34-го выпуска) и шести месяцев (по облигациям 35—37 выпусков) со дня начала первичного размещения, предусмотренного решением о выпуске облигаций, или со дня истечения предыдущего купонного периода соответственно.

Начисление купонного дохода по облигации осуществляется со дня первичного размещения соответствующей облигации по 31 августа 2010 года включительно.

Со дня истечения срока обращения облигаций купонный доход не начисляется.

Первый купонный доход по соответствующей облигации начисляется со дня ее первичного размещения по день истечения купонного периода, в котором было произведено первичное размещение данной облигации.

Второй и последующие купонные доходы по облигации начисляются со дня начала очередного купонного периода по день истечения данного купонного периода. Дата окончания последнего купонного периода — 31 августа 2010 года.

Расчет купонного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за купонный период, определенный в соответствии с вышеуказанными правилами, по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь **плюс 2** (Два) процентных пункта.

Купонный доход рассчитывается по следующей формуле:

Д = (K1*H*t1 + K2*H*t2 + …. + Kn*H*tn)/360*100

где:

Д — купонный доход;

t1, t2, tn — количество дней соответствующей части купонного периода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной. При этом сумма t1 + t2 + ……+ tn должна быть равна количеству дней в соответствующем купонном периоде;

K1, K2, Kn — равная действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь плюс два процентных пункта — процентная ставка по купону (процентов годовых) за соответствующую часть периода начисления купонного дохода, в пределах которой действующая ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;

H — номинальная стоимость облигации.

При расчете купонного дохода по облигации количество дней в месяце условно принимается за 30. В месяцах, имеющих 31 день, 31-е число в расчет не принимается (за исключением случая, если этот день является днем первичного размещения облигации), а в феврале купонный доход, начисленный на последний день февраля, повторяется столько раз, сколько дней не достает до 30.

Расчет купонного дохода производится с округлением до наименьшего номинала банкноты, находящейся в обращении на территории Республики Беларусь в порядке, установленном в Банке при совершении операций по счетам физических лиц, связанных с выдачей наличных денег.

Выплата купонного дохода осуществляется филиалами Банка, центрами банковских услуг Банка, структурными подразделениями Банка, его филиалами и центрами банковских услуг, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка, начиная с первого рабочего дня со дня окончания соответствующего купонного периода. Последний купонный доход и иные неполученные владельцем облигации на момент погашения купонные доходы выплачиваются в день погашения данной облигации. Выплата части купонного дохода не производится.

При досрочном погашении облигации по ней выплачиваются купонные доходы, рассчитанные в соответствии с вышеуказанным порядком, только за истекшие купонные периоды; за текущий купонный период доход не выплачивается.

При досрочном погашении, а также в период погашения (с 01 сентября 2010 года по 28 февраля 2011 года) уплата неполученных владельцем облигации купонных доходов отдельно от возмещения номинальной стоимости облигации не производится.

14. Срок и порядок погашения (досрочного погашения) облигаций

Облигации погашаются по требованию их владельцев при предъявлении оригинала облигации в Банк. При этом требование о погашении облигации должно быть предъявлено с **01 сентября 2010 года по 28 февраля 2011 года.**

Требование о досрочном погашении облигации может быть предъявлено по истечении одного года от даты первичной открытой продажи соответствующей облигации.

Обязательства Банка по погашению облигаций, по которым в срок погашения названных облигаций не было предъявлено требование об их погашении с предъявлением оригиналов погашаемых облигаций, и обязательства по выплате дохода по данным облигациям после истечения вышеуказанного срока погашения прекращаются.

При погашении облигаций, предъявленных к погашению с 01 сентября 2010 года по 28 февраля 2011 года, владельцу возмещается номинальная стоимость облигаций, а также уплачиваются все неполученные владельцем облигаций купонные доходы наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

При досрочном погашении облигаций владельцу возмещается номинальная стоимость облигации, а также уплачиваются все неполученные владельцем облигаций купонные доходы, начисленные только за истекшие на день досрочного погашения купонные периоды, наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. За купонный период, в течение которого облигация предъявлена к досрочному погашению, купонный доход не выплачивается.

Погашение облигации после истечения срока погашения производится в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

При погашении (досрочном погашении) облигации выплата части номинала облигации, части купонного дохода или купонного дохода за не все истекшие купонные периоды не производится.

15. Условия отказа в продаже облигаций

В продаже облигаций может быть отказано при непредставлении в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, справки налогового органа о представлении декларации об источниках денежных средств, вносимых в счет оплаты приобретаемых облигаций и других необходимых документов.

Операции с облигациями, подлежащие особому контролю в соответствии с законодательством о предотвращении легализации доходов, полученных незаконным путем, осуществляются при условии предъявления физическим лицом, совершающим операцию, документа, удостоверяющего личность.

16. Условия и порядок возврата средств инвесторам при отказе от выпуска (запрете продажи) облигаций

В случае отказа от выпуска (запрете продажи) облигаций Банк в срок не позднее 30 дней с момента принятия решения об отказе от выпуска возвращает владельцам облигаций денежные средства, направленные на покупку облигаций, с уплатой процентов за пользование денежными средствами по процентной ставке, равной действующей ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь **плюс 2** (Два) процентных пункта.

17. Место и время ознакомления с проспектом эмиссии облигаций

С более подробной информацией и проспектом эмиссии облигаций можно ознакомиться в филиалах, центрах банковских услуг Банка, структурных подразделениях Банка, его филиалов и центров банковских услуг, а также в ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их операционного времени.

Председатель Правления
ОАО «АСБ Беларусбанк» Н.А. ЕРМАКОВА

Главный бухгалтер
ОАО «АСБ Беларусбанк» И.П. ЛЫСОКОВСКАЯ

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Адміністрацыя Фрунзенскага раёна г. Мінска

аб'яўляе аб правядзенні грамадскага абмеркавання будаўнічага праекта па аб'екце «Карэкціроўка праекта фірменнага прадпрыемства па пашыве і продажы футравых вырабаў пад медыцынскі цэнтр з памяшканнямі адміністрацыйнага і гандлёвага прызначэння па вул. Прытыцкага».

Абмеркаванне будзе праводзіцца з 15.02.2008 г. па 24.02.2008 г. шляхам экспазіцыі па адрасе: ***вул. Прытыцкага, 46 у памяшканні ЖЭС-37 з 9.00 да 18.00.***

Аддзел архітэктуры і горадабудаўніцтва адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска, вул. Кальварыйская, 39, каб. 221, тэл.: 2044173, 2561038, 2044167.

ПРЫЕМНА МЕЦЬ СПРАВУ З ПРАФЕСІЯНАЛАМІ

З 21 па 31 студзеня ў нашай краіне знаходзілася група прадстаўнікоў дэпартамента грашова-крэдытных сістэм і рынкаў капіталу Міжнароднага валютнага фонду (МВФ). Мэта візіту — вывучыць практыку і працэдуры кіравання крэдытнымі рызыкамі ў банках, дапамагчы Нацбанку ў распрацоўцы сістэмы стрэс-тэсціравання і справаздачы аб фінансавай стабільнасці, вывучыць існуючыя механізмы планавання дзеянняў у надзвычайных сітуацыях, у тым ліку і механізмы абароны фінансавай сістэмы. У задачу місіі МВФ таксама ўваходзіла прадастаўленне рэкамендацый па паспяховым вядзенні выпуску каштоўных папер на міжнародных рынках капіталу.

Леанід ТУГАРЫН.

Дарагую матулю і бабулю ***Тацяну Пятроўну АНТАНОВІЧ*** *з в. Саская Ліпка Нясвіжскага раёна сардэчна віншуем з юбілеем.*

Жадаем, каб салодка спалася, лёгка ўставалася, смачна снедалася, спрытна бегалася.

З любоўю і павагай родныя і блізкія.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (26 студзеня). Па гарызанталі: Бузіна. Факір. Акцёр. «Эда». Одум. Зала. Араб. Кліп. Рагу. Асот. Кляштар. Аг. Вінт. Трап. Інвар. Будка. Акваланг. Амт. Самоа. Юра. Аскал. Нармаль. Ілія. Аорта. Сірока. **Па вертыкалі:** Прызба. Ліханка. Твар. Актава. Сміт. Гіра. Юкала. Апалонік. Каралі. Плыт. Альяс. Бас. Марш. Тула. Карэ. Ратэрдам. Драга. Акно. Рэха. Бур. Пагалоска.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Дзевы павінны кантраляваць эмоцыі, а Блізнятам самы час праявіць ініцыятыву

ВАЕН. Прадумманасць у дзеяннях пойдзе толькі на карысць кар'еры. Нетрадыцыйны падыход дапаможа пры рэалізацыі творчых ідэй, задумаў і планаў. У панядзелак прывесці ў парадак справы будзе нялёгка, але неабходна. У чацвер лепш не разглядаць дзелавыя прапановы, бо вас можа падвесці недастатковая інфармацыя. Заплануйце на выхадныя дні што-небудзь незвычайнае і арыгінальнае.

ЦЯЛЕЦ. Давядзецца не адзін раз адстойваць свой пункт гледжання перад навакольнымі. Аргументуйце яго, але не прапускайце словы апанентаў: у іх могуць быць каштоўныя намёкі. У панядзелак для дасягнення мэтаў необходна праявіць ініцыятыву. У аўторак пажадана ўсімі сіламі пазбягаць канфліктных сітуацый. У нядзелю пастарайцеся заставацца бесстароннімі назіральнікамі.

БЛІЗНЯТЫ. Праяўляйце больш актыўнасці і творчай ініцыятывы на рабоце. Забудзьцеся, што такое лянота і стомленасць, працуйце столькі, колькі зможаце. Атрымаецца рэалізаваць імкненні і задумы. Усё будзе цудоўна, калі не станеце спрачацца з начальствам. Ёсць магчымасць з лёгкасцю вырашыць праблемы, якія хвалююць. Зможаце абаперціся на неабходную дапамогу сяброў. Сачыце за маўленнем і будзьце больш асцярожнымі пры зносінах з калегамі.

РАК. Пазітыўны погляд на свет дазволіць з лёгкасцю спраўляцца нават з самымі складанымі задачамі. У панядзелак адпачніце ад мітусні і клопатаў, адчуйце смак да жыцця. Выкарыстоўвайце нечаканую сустрэчу з кіраўніцтвам у сваіх мэтах: падзяліцеся сваімі цудоўнымі ідэямі — вашу ініцыятыву абавязкова падтрымаюць. Другая палова пятніцы — удалы дзень для таго, каб будаваць планы на бліжэйшы час.

ЛЕЎ. Аптымізм і ўменне не паддавацца маркоце будуць выключаць сімпатыю ў навакольных. У пачатку тыдня з'явіцца цудоўная магчымасць бліснуць талентамі на публіцы. Магчыма, хтосьці зацікавіцца вамі з прафесійнага пункту гледжання. Настае цікавы тыдзень, які можа падараваць ажыццяўленне праектаў.

ДЗЕВА. Пастарайцеся захоўваць спакой і разважлівасць. Не даваляйце сабе затрымлівацца ў палоне сваіх ілюзій. У панядзелак паспрабуйце асабліва дакладна выконваць усе абавязкі. Ёсць шанц, што ваша працавітасць не застанецца незаўважанай. Старайцеся падтрымліваць сябе ў прыўзнятым настроі, кантралюйце эмоцыі. У суботу вельмі пажадана заняцца вырашэннем хатніх спраў і праблем. Заканчыцца тыдзень з пачуццём глыбокага задавальнення ад асведамлення значнасці ўсяго, што зроблена вамі.

ШАЛІ. Зможаце на славу папрацаваць і выдатна адпачыць. Але калі хочаце зрабіць гэтыя дні сапраўды незабыўнымі, ініцыятыву давядзецца браць у свае рукі. Памятайце, што зараз імгненныя праблемы, па сутнасці, — не больш чым ілюзія. Галоўнае — не праглядзець сапраўды перспектыўныя справы. Вам будзе ўласціва камунікабельнасць і лёгкасць у зносінах. Не варта хавацца дома: ёсць выдатны шанц пашырыць кола карысных знаёмстваў.

СКАРПІЁН. Лепш за ўсё занятца паступовым асваеннем новай прасторы. Гэты перыяд прынясе зносіны з цікавымі людзьмі. У пачатку тыдня могуць азадачыць камандзіроўкай, з якой вы паспяхова справіцеся — чым заслужыце адабрэнне начальства. У сераду могуць абвастрыцца адносіны з калегамі: не варта даводзіць справу да канфліктнай сітуацыі. У пятніцу, перш чым прыняць адказнае рашэнне, ацаніце сітуацыю з розных бакоў і, пажадана, парайцеся з кімнебудзь.

СТРАЛЕЦ. Вас можа чакаць творчы ўздым і, як вынік, нечакана ўдалыя вырашэнні праблемных задач, якія патрабуюць узгадненння з начальствам. Будзеце зносіцца больш, чым звычайна. Лепшым упрыгажэннем будзе сціпласць — менавіта яна дазволіць пазбегнуць прамашак і недалікаў у рабоце. У другой палове тыдня лепш заняць пазіцыю чакання і рыхтавацца да кампрамісаў, якія дазволяць вырвацца наперад.

КАЗЯРОГ. Захочацца, каб усё ішло па плану, але для гэтага яго давядзецца не толькі скласці, але і ўпарадкаваць. Акрэпне воля, стане лягчэй настойваць на сваім. Лішнія справы рашуча адмяціце — гэта спатрэбіцца і ў асабістым жыцці, і на рабоце. У аўторак будзьце больш уважлівыя да інфармацыі, якую атрымліваеце — тады апынецеся ў патрэбным месцы ў патрэбны час. У чацвер магчымыя невялікія непрыемнасці у сямейных справах.

ВАДАЛЕЙ. Зможаце бліснуць вострым розумам, ёсць усе шанцы стаць незаменным у кампаніі. Адпачывайце і весяліцеся ад душы. У сярэдзіне тыдня давядзецца крыху папрацаваць — аднак успрыміце гэта з лёгкасцю, калі не з задавальненнем. Прадэманструйце калегам вашы якасці лідара. Найбольш спрыяльныя дні на гэтым тыдні — чацвер і пятніца, неспрыяльны — аўторак.

РЫБЫ. Давядзецца даказваць ваш высокі прафесіяналізм. Добры тыдзень для людзей творчых прафесій. Чым больш будзеце зносіцца з людзьмі, тым лепш пойдуць справы. Уважліва сачыце за навінамі, каб не прапусціць важнай інфармацыі. Размоў з начальствам у сераду лепш пазбягаць, асабліва калі хочаце чагосьці ад яго дабіцца. Прэтэнзіі можна будзе выказаць потым.

Забытае? Новае? Вечнае!

Нявеста і шаферка: эстафета пераемнасці,

або Танец у вэлюме нявесты — сімвал хуткага замужжа

Марыя Мікалаеўна з г. Любань задае далікатнае пытанне: «Ажаніўся мой сын. Я — удава, таму вянок з нявесты здымала братава жонка. Адначасова яны з братам былі на вяселлі сватамі. Яна зняла вэлюм і надзела яе на сваю дачку. Тая праз некалькі месяцаў выйшла замуж і нарадзіла, а ў маёй дачкі дзяцей няма і да гэтага часу. Чаму так? Можа, нельга было перадаваць гэты вянок другому чалавеку?»

Практычна ў любым абрадзе ёсць два планы яго ўвасаблення. Адзін вонкавы — той, які бачны і зразумелы ўсім яго ўдзельнікам. Другі — патаемны, прыхаваны, значна больш складаны для ўспрымання і разумення. Часам ён таксама можа быць відавочным, але сэнс яго будзе зразумелым толькі вузкаму колу людзей. Так, у той момант, калі бацькі сустракалі маладых перад парогам хаты хлебам-соллю, старэйшая прадстаўніца роду — звычайна бабуля, выконвала яшчэ адзін абрад, накіраванасць якога мела таямнічы характар. *Яна клала на парозе адамкнёны замок з адкрытай дужкай і засцілала ручніком, каб ніхто не бачыў яго. Як толькі жаніх пераносіў нявесту на руках цераз парог, бабуля згортвала ручнік, падымала замок і замыкала яго. Потым ключ пакінуць бацькам маладога, а замок (сімвал жаночага ўлоння) аддадуць бацькам маладой. Мелася на ўвазе сімвалічнае замыканне шлюбнай пары: як ніхто не адамкне замок, так ніхто не разлучыць гэту пару!*

Беларускія сямейна-родавыя святы (радзіны, вяселле, пахаванне, будаўніцтва і асваенне хаты) аказаліся ў гэтым аспекце найбольш паказальнымі. Аднак вясельна-абрадавы комплекс утрымліваў у сабе, бадай што, найвыяўленшую колькасць таямніц, многія з якіх не раскрыты навукоўцамі да гэтага часу.

Беларускае вяселле толькі на першы погляд падаецца святам у гонар дваіх, якія заключылі паміж сабой шлюб. Насамрэч гэта далёка не так. У ім у адзін вузел зніталіся лёсы вельмі многіх людзей, якія ў абавязковым парадку, самым непасрэдным чынам уплываюць на сумеснуюдолю маладых, на характар іх жыцця, на іх дабрабыт і шмат што іншае. Менавіта таму маладым не мела права адпраўляць дзяцей да вянца.

З другога боку, вяселле было зарыентавана на далёкую перспектыву развіцця таго роду, які ладзіць вялікае свята. Людзі радаваліся, доўга рыхтаваліся да сустрэчы гаваровых гасцей, прадумвалі кожную дэталь. (А не так як сёння бывае: адна сям'я стол накрывала, а другая тыя грошы, якімі адарылі маладых, ухапіла — і за парог!).

На сёння ўжо многія маладыя пары ведаюць прымету, скіраваную на характар іх узаемаіснавання: ***хто першым у ЗАГСе ці царкве стане на ручнік, той і будзе верхаводзіць у сям'і.*** Аднак не ўсе ведаюць, што з гэтым жа ручніком звязана яшчэ адна прымета. На працягу ўсяго вяселля побач з маладымі знаходзяцца шафер і шаферка. Яны перасцерагаюць маладых, ва ўсім дапамагаюць (напрыклад, у нявесты выпала з рук насовачка або зваліўся шалік, то падняць гэтыя прадметы меў права толькі шафер, але ні ў якім разе не жаніх). Зразумела, што за такі клопат іх трэба было аддзячыць. А які падарунак мог быць для іх самым пажаданым? Ды толькі адзін: сімвалічна перадаць ім эстафету прадаўжэння роду — г.зн. выканаць падчас вяселля такія сакральна-магічныя дзеянні, якія будуць максімальна спрыяць іх шлюбу. У гэтым выпадку мы маем на ўвазе не абавязковы шлюб паміж шаферам і шаферкай, гэта могуць быць дзве зусім розныя сям'і.

Маршалак і старшая шаферка рассцелюць у храме ручнік, на якім жаніх і нявеста будуць знаходзіцца на працягу ўсяго таінства вянчання. Але як толькі святар павяжа рукі маладых і павядзе іх да алтара, нявеста, саступаючы з ручніка, абавязкова зачэпіць яго абцасам і пацягне за сабой. Канцы ручніка тут жа наблізяцца адзін да аднаго. Гэтым сімвалічным дзеяннем нявеста быццам «пацягне» за сабой шафера і шаферку — і вы збліжайцеся, абірайце сабе пару, як тая пара канцоў ручніка. Адчуваеце, якая жыццесцвярджальная ідэя закладзена ў гэты просты на першы погляд рытуал?

Ідэя непасрэдная перадачы энергетыкі з'яўляецца скразной для беларускай народнай культуры. Але яна заўсёды вымагала ўзаемавагі абодвух бакоў. Вясковая жанчына расказвала: «У мяне штогод быў добры ўраджай капусты. І вось аднойчы завітала суседка і папрасіла расады. Я аддала проста так. Усё — з таго часу ў яе багаты ўраджай, а ў мяне толькі цырубалкі тырчаць. А трэба ж было, каб яна хоць капейчыну заплаціла, тады і ёй добра было б, і мне».

Як толькі заканчвалася дзяльба каравая, маці маладога (у некаторых мясцінах — хросная або нават сваця) здымала з галавы нявесты вэлюм і перадавала яго бліжэйшым сяброўкам — дружкам, якія знаходзіліся ў перадшлюбным узросце. Кожная з іх павінна была тройчы перакруціцца, танцуючы, а затым маці перадавала вэлюм наступнай дзяўчыне.

У народзе глыбока верылі: каторай першай перададуць вэлюм, тая і будзе спадзявацца на хуткае замужжа. Менавіта з гэтай нагоды вэлюм зусім заканамерна надзявалі перш за ўсё «старшай шаферцы» — той, якая сядзела побач з нявестай. У тым жа выпадку, які разглядаем мы, адбылося прынцыпова важнае парушэнне, наўмысна зробленае адным з галоўных удзельнікаў рытуалу. Калі б гэту ролю выконвала родная маці жаніха, то яна ні ў якім разе не магла б не аддзячыць першай самую лепшую сяброўку нявесты. Але ж маці была на той час удавой, таму замест яе вэлюм здымала братавая — жонка яе роднага брата. І скарысталася сітуацыяй. Зразумела, як свая сарочка бліжэй да цела, так і свая дачушка — больш родны чалавек, чым усе сяброўкі нявесты. Вось і не ўтрымалася жанчына ад спакусы, «пераскочыла» цераз галовы, да сваёй дачкі кінулася. Але пры гэтым забылася (ці проста не хацела думаць), што парушае правіла суіснавання і пасляддоўнасці, што свая дачка і зяць — не муж і жонка, а брат і сястра. І ў іх не можа быць дзяцей. Вось і не ідзе ў іх жыццё.

Так што вянок як сімвал прадаўжэння жыцця перадаваць трэба было абавязкова таму, каму гэтага вымагала традыцыя, а не так, як гэтага захацелася. Аднак сітуацыя гэта далёка не безнадзейная. Мы здольны яе паправіць.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

Добры дзень, родныя словы!

З ПІСЬМА Ў РЭДАКЦЫЮ

Шаноўны Анатоль КЛЫШКА!

Добры дзень і нізкі паклон Вам як рупліўцу роднай мовы, матчынага слова.

*Цудоўна Вы патлумачылі, у якім выпадку трэба пісаць ці казаць **зараз** і ў якім — **цяпер**. Ужо ніколі не зблытаеш.*

*Будзьце ласкавы, «расстаўце кропкі над «і» і адносна правільнага абыходжання са словамі **прадуктыўнасць** і **прадукцыйнасць**. У іўеўскай раённай газеце чамусьці пішуць прадукцыйная жывёла (?!..).*

Матэрыял менавіта з такім «ляпсусам» дасылаем Вам. Трэба ж было ўжыць слова прадуктыўная. Ці не так?

З павагай і ўдзячнасцю чытачы «Звязды».

г. Іўе.

Разважайма прадуктыўна

Дзякуй, сябры-мовалюбы, на добрым слове на адрас нашай рубрыкі.

А што да слоў прадукцыйная жывёлагадоўля, то міжволі паўстае няпростае пытанне і пра слова прадуктыўны.

Тут у нашым мовазнаўстве існуюць розныя думкі.

Здаецца, проста. Звычайна ад іншамоўных назоўнікаў на **-цыя** лёгка ўтвараецца прыметнік: да поўнай асновы слова далучаем суфікс **-н-**, і вось ужо канцавая частка прыметніка **-цыйны.**

Кожны з нас тут жа, здаецца, можа прывесці дзесяткі такіх прыкладаў: авіяцыя — авіяцыйны, арганізацыя — арганізацыйны, акупацыя — акупацыйны, кульмінацыя — кульмінацыйны, навігацыя — навігацыйны, пунктуацыя — пунктуацыйны...

З самых розных галін жыцця.

У рускай мове адпаведнікам такой канцавой часткі найчасцей выступае форма — **ционный.** У пэўных словах яшчэ і **— тивный**. Ёсць рускія словы з адным і тым жа значэннем, але з двума гэтымі канцавымі «аздабленнямі»: мелиора**тивный** і мелиора**ционный**. У нашай мове тут дасканала дае рады адна канцавіна: меліяра**цыйны**.

На гэтай падставе наш вядомы мовазнавец доктар філалагічных навук Павел Сцяцко прапануе ўвогуле адмовіцца ад фінальнай часткі **-тыўны** і скрозь выкарыстоўваць толькі **-цыйны**, нават у словах з розным значэннем.

З гэтым, аднак, цяжка пагадзіцца. Возьмем першы лепшы прыклад: **кансультацыйны** і **кансультатыўны**.

Скажаш **кансультацыйны** і зразу ж адчуеш: «які мае дачыненне да кансультацыі, прызначаны для яе». А **кансультатыўны** — гэта «дарадчы, з дарадчымі правамі»: кансультатыўны орган. Гэтак, як падаюцца гэтыя словы ў пяцітомным (у шасці кнігах) «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (ТСБМ).

Або возьмем **аперацыйны** і **аператыўны**. Калі **аперацыйны** звязаны з розныміазначэннямі слова аперацыя, то **аператыўны** — гэта «здольны хутка і правільна выконваць практычныя задачы; дзейсны».

Або **камунікацыйны** (які мае дачыненне да шляхоў зносінаў, лініі сувязі і пад.) і **камунікатыўны** (які адносіцца да абмену думкамі, перадачы інфармацыі пры дапамозе мовы). Паслухацца Паўла Сцяцко і адмовіцца ад слова камунікатыўны, пашырыўшы яго значэнне на слова камунікацыйны, ніяк не выпадае.

Вучоны спасылаецца на лаціну, на напісанне там падобных назоўнікаў з **-tio**, дзе, як лічыць П. Сцяцко, «літара **t** у фінале **-tio** чытаецца як [ц]»... І далей: «І як можа ўтварэнне ад назоўніка з цвёрдым гукам [ц] набываць на яго месцы гук [т]: інтуіцыя — інтуітыўны». (П. Сцяцко. «Праблемы нормы, культуры мовы», Гродна, 1998, стар. 37).

Але ўсё ў тым, што лацінскі назоўнік intuitio якраз паходзіць ад дзеепрыметніка intuitus, а той ужо ад дзеяслова intueri. Трошкі іншы ланцужок радаслоўя...

Але нам далей бы ад лаціны і бліжэй да беларушчыны, да слоў **прадукцыйны** і **прадуктыўны**.

Сельскагаспадарчая жывёла, таму што яна дае прадукцыю, вядома ж, — прадукцыйная. Гэтак, як пазначае ТСБМ. Але, як мне здаецца, яна можа быць больш ці менш **прадуктыўнай**. Такім чынам гэты якасны прыметнік можа мець розныя ступені параўнання. (Гэтак жа, як і ранейзгаданы якасны прыметнік **аператыўны**: больш аператыўны і самы аператыўны. А **аперацыйны** — адносны прыметнік і ад яго ступеняў параўнання не ўтворыш.)

Дык вось ТСБМ не адрознівае праз суфіксы значэнні, здавалася б, адметных слоў прадуктыўны і прадукцыйны, што робяць, напрыклад, слоўнікі польскай мовы.

А да таго ж слова прадукцыйны ў нашай мове абазначае і тое, што ў рускай мове **производительный**. Бачыце, колькі значэнняў узвалілі ў Слоўніку на адзін прыметнік.

А словам **прадуктыўны** ТСБМ дазваляе карыстацца толькі ў лінгвістыцы. У граматыцы прадуктыўны — гэта «здольны ўтвараць новыя словы ці формы; які дзейнічае ў сучасны перыяд». Скажам, прадуктыўная прыстаўка, прадуктыўны суфікс.

Шкада, што так выходзіць: наша мова мае багатыя сродкі, а мы імі не карыстаемся.

Дык што можна сказаць пад канец размовы?

Супрацоўнікі раённай газеты ўважліва чытаюць Тлумачальны слоўнік беларускай мовы.

Анатоль КЛЫШКА.

Усміхнёмся!

— Чуў, ва Уладзівастоку абяцаюць моцнае пахаладанне.
— Сіноптыкі?
— Энергетыкі!

☺

Добрая барада хавае не толькі недахопы твару, але і недахопы фігуры.

☺

— Доктар, што ў мяне?
— А што ў вас?

— Разумееце, калі я прысядаю на адной назе, пастукваю сябе нізкэй спіны па чарзе левай і правай рукой, дакранаюся кончыкам языка да кавалачка фольгі на фарфоравай талерцы, дык у мяне ў правым баку страляе. Што гэта?

— Свабоднага часу ў вас зашмат...

☺

З малочных прадуктаў больш за ўсё люблю малочнае парася!

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.56	16.51	8.55
Віцебск —	7.50	16.36	8.46
Магілёў —	7.46	16.41	8.55
Гомель —	7.37	16.43	9.06
Гродна —	8.10	17.07	8.57
Брэст —	8.05	17.13	9.08

Месяц

Апошняя квадра.

Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Рымы, Яфіма;*

К. *ГРАМНІЦЫ (АХВЯРАВАННЕ ПАНА), Марыі, Аскара, Карнелія, Міраслава.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА -1..+1°С	КІЕЎ +3..+5°С	РЫГА +3..+5°С	
ВІЛЬНЮС -1..+1°С	МАСКВА -1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ -2..0°С	

Дзве даты

2 лютага

1838 год — 170 гадоў з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага, рэвалюцыянера-дэмакрата, публіцыста, паэта, аднаго з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863—1864 гадоў. Вясной 1861 года стварыў рэвалюцыйна-дэмакратычную арганізацыю на Гродзеншчыне для падрыхтоўкі паўстання супраць царызму. У 1862—63 гадах выдаваў першую беларускую газету «Мужыцкая праўда», падпісваючы свае матэрыялы псеўданімам «Яська-гаспадар з-пад Вільні». Арыштаваны ў студзені 1864 года. У турме напісаў «Лісты з-пад шыбеніцы» — палітычны запавет рэвалюцыянера. Пакараны смерцю публічна ў Вільні на гандлёвай плошчы Лукішкі. Жыццё і дзейнасць Кастуся Каліноўскага аказалі вялікі ўплыў на развіццё перадавой думкі ў Беларусі.

1709 год — на востраве Мас-о-Цьера экіпажам карабля знойдзены англійскі матрос А. Селкірк, які правёў у адзіноце 9 гадоў. Менавіта ён стаў прататыпам галоўнага героя рамана Даніэля Дэфо «Рабінзон Круза».

Цытата дня

«Сумленнасць — гэта калі думаеш сказаць адно, а кажаш праўду».

Аляксандр Пярлюк.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Паболей святла!

Нягледзячы на камфорт, якім людзі акружаюць сябе ўсё больш, мы цесна звязаны з маці Прыродай, залежым ад яе і, у тым ліку, ад надвор'я на нашай зямлі. Нават звычайны недахват сонечных промняў прыводзіць да масы праблем. А пра неабходнасць свежага паветра і прагулак і казаць не даводзіцца. Пастаянна мы сутыкаемся і з магнітнымі бурамі, уплывам на нас Месяца, тэмпературнымі скачкамі. Як жа захаваць сяброўскія адносіны з надвор'ем і падтрымліваць сваё здароўе на належным узроўні?

У многіх у асенне-зімовы перыяд з'яўляюцца прыкметы дэпрэсіі, калі прападае цікавасць да ўсяго, што раней падавала, пагаршаецца сон, цяжкім становіцца абуджэнне, пачынаюцца «дзівосы» з апетытам — ён або прападае, або, наадварот, робіцца празмерным, і асабліва відавочная цяга да вуглявадзістай ежы. На рабоце падае прадукцыйнасць, чалавек хутка стамляецца і можа зведваць невытлумачальныя адчуванні трывогі, віны ці страху.

Вучоныя і ўрачы ў адзін голас кажуць аб недахопе сонечнага святла, з-за чаго і разгараецца ўвесь сыр-бор. Лістапад і снежань з'яўляюцца самымі цёмнымі месяцамі года, і ў студзені—лютым сонейка радуе нас зусім малую колькасць часу ў суткі.

Дзе ж выйсце? Іх некалькі. У першую чаргу асноўную ўвагу ў лячэнні трэба надаць святлу. Калі нашы вочы бачаць святло, мозг выпрацоўвае неабходныя нам гармоны ў патрэбнай колькасці, а як толькі святла становіцца мала, пачынаюцца збоі ў гарманальнай сістэме і, як вынік, у рабоце ўнутраных органаў. Чалавек пачынае горш сябе адчуваць, у яго псуецца настрой, з'яўляецца ўпадак сілаў.

Навярстаць недабранае восенню і зімой святло можна, калі знаходзіцца як мага больш на сонцы ці ў ярка асветленым памяшканні.

Прагулкі на свежым паветры ў выхадныя дні могуць цалкам абараніць нас ад зімовай дэпрэсіі. Гуляць трэба па тры гадзіны два дні запар. А калі сумясціць прагулкі з фізічнымі мэтах зімой можна займацца і ў ярка асветленых спартыўных ці танцавальных залах, атрымліваючы пры гэтым асалоду ад рухаў, рытмаў музыкі і проста зносінаў адначасова з адным — усё гэта выдатна ўзнімае настрой і перашкаджае ўпадніцкім думкам забіваць галаву.

Яшчэ адна парада псіхолагаў, якая можа абараніць ад з'яўлення дэпрэсіі, — насіць як мага больш светлага і яркага адзення і ўвогуле акружаць сябе яркімі прадметамі: развесіць прыемныя карціны, якія выклікаюць толькі светлыя адчуванні, выкарыстоўваць занавескі цёплых тонаў (перавагу аддавайце ружовым, жоўтым, аранжавым, зялёным колерам). І нарэшце, часцей усміхайцеся, чытайце вясёлыя кнігі, глядзіце старыя добрыя камедыі, таму што даўно даказана — смех і ўсмешкі папраўляюць здароўе і наладжваюць работу гарманальнай сістэмы.

Не забывайце і пра прыемныя пахі, выкарыстоўвайце эфірныя алеі цытрусавых ці кветкавых духмяныя палачкі.

(Працяг тэмы — наступным разам.)

-2475-

НЕАБХОДНЫЯ ДРОБЯЗІ

Вініл ці шаўкаграфія?

Прыходзячы ў чый-небудзь дом, першы позірк мы кідаем на сцены — гэта своеасаблівая «візітоўка» жылля. Калі вы вырашылі выбрацьдля сваіх сцен «адзежу» ў выглядзе шпалераў, скарыстайце наступныя парады.

Прыхожая і кухня. Гэтым памяшканням, як і іншым, у якіх сцены схільныя да хуткага забруджвання, будуць прыдатныя шпалеры са шчыльнага вінілу ці «пад фарбаванне». Іх можна праціраць вільготнай анучкай ці мыць шчоткай (калі ёсць адпаведныя адзнакі на этыкетцы).

Гасцёўня. У гэтым пакоі можна скарыстаць любыя шпалеры. Праўда, выбіраючы недарагія папяровыя, будзьце гатовы да таго, што праз год яны могуць выліняць. Класічны інтэр'ер упрыгожаць тэкстыльныя шпалеры ці шаўкаграфія.

Спальня. Тут таксама дапускаюцца любыя пакрыцці сцен, аднак найлепшыя — шаўкаграфія (яна найбольш даўгавечная) ці шпалеры з вінілавым пакрыццём.

Дзіцячы пакой. Шпалеры з выявамі герояў мульцікаў парадуюць малых. Часцей за ўсё гэта папяровыя шпалеры ці з вінілавым напыленнем. Не забудзьце пацікавіцца экалагічнай чысцінёй «дзіцячых» шпалераў.

ХАТНЯЯ МАЙСТЭРНЯ

Рассоўны стол цыркуляркі

Каб было зручней распілоўваць доўгія дэталі, стол цыркуляркі можна павялічыць, дадаўшы самаробную высоўную секцыю.

Для гэтага адрэжце дзве трубы (пластыкавыя ці металічныя) даўжынёй, роўнай шырыні стала цыркуляркі, і прымацуйце іх пад сталом на кранштэйнах па абодвух баках паралельна плоскасці пілавальнага дыска так, каб яны не перашкаджалі мяняць яго становішча па вышыні і вугле.



Стол высоўнай секцыі з фанеры таўшынёй 12 мм прымацуйце да дошкі 25х100 мм, якая павінна выступаць за трубы не менш чым на 25 мм. У дошцы правсвідруйце адтуліны і ўклейце ў іх брускі круглага сячэння дыяметрам 25 мм. Устаўце свабодныя канцы брускоў у трубы. У патрэбным становішчы высоўную секцыю зафіксуйце шкантам дыяметрам 6 мм, які ўваходзіць у адтуліну ў трубе накіравальнай і ў бруску.

Пры распілоўцы цяжкіх дэталяў высоўную секцыю пастаўце на дзве-тры ножкі

-2476-

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларусь Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 607. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Лабарант філіяла ў Століне Наталля БЫК.

З ліпеня 1944 года пачынаецца гісторыя ААТ «Пінскі малочны камбінат». Тады гэта быў невялічкі завод, на якім працавала ўсяго 10 чалавек. А вось з 1945 па 1960 год адбываецца станаўленне прадпрыемства, яго інтэнсіўнае развіццё. Устанаўліваецца новае абсталяванне, павялічваюцца вытворчыя магутнасці, а гэта дае магчымасць перапрацоўваць значна больш сыравіны і зрабіць больш разнастайным асартымент прадукцыі.

У 1965 годзе малаказавод у адну змену перапрацоўвае ўжо 100 тон малака. А ў 1994 годзе ўступіў у эксплуатацыю новы вытворчы корпус, у якім выраблялася 60 тон натуральнамалочнай прадукцыі і 2,5 тоны масла ў гадзіну, а праз чатыры гады ўжо ўведзены цэх па вырабе тварагу і лінія па вытворчасці глазураваных сыркоў.

Пінскі гарадскі малочны завод праіснаваў да 30 снежня 1994 года, а затым быў пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства (ААТ) «Пінскі малочны камбінат».

У 2003 годзе Брэсцкі аблвыканкам прымае рашэнне аб далучэнні да ААТ «Пінскі малочны камбінат» стратнага Столінскага масласырзавода.

Сёння ААТ «Пінскі малочны камбінат» — сучаснае рэнтабельнае прадпрыемства, аснашчанае высокатэхналагічным абсталяваннем.

Дырэктар ААТ «Пінскі малочны камбінат» Уладзімір МУЛЯРЧЫК:

«КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАЯ ПРАДУКЦЫЯ — ГАРАНТЫЯ СТАБІЛЬНАСЦІ ПРАДПРЫЕМСТВА»

Прадстаўляем суразмоўцу

Калі прадпрыемства працуе стабільна, то ў гэтым вялікая заслуга яго кіраўніка, які падбірае кадры і вызначае стратэгічную лінію развіцця. І, як паказвае жыццё, пры роўных эканамічных умовах, найперш канкурэнтаздольныя тыя прадпрыемствы, на якіх кіраўнік гаспадар.

Вось такім і з'яўляецца дырэктар ААТ «Пінскі малочны камбінат» Уладзімір МУЛЯРЧЫК. Сам Уладзімір Іванавіч з заможнага роду, яго дзяды былі гаспадарамі, але вядомыя пературбацыі мінулага стагоддзя, калектывізацыя ўсіх зрабілі роўнымі. Калі загінуў бацька, сям'я апынулася ў цяжкім становішчы і на старэйшага сына лягла адказнасць за родных. У войску, як старшына, Уладзімір Мулярчык атрымліваў 25 рублёў, 20 з якіх адсылаў сястры-студэнтцы. Дзве малодшыя сястры атрымалі вышэйшую адукацыю, і тут ёсць пэўная заслуга брата.

Гэта ўспамінаецца не дзеля прыгожага ўступу да размовы, а для таго, каб адзначыць, што Уладзімір Мулярчык — асоба адказная, чалавек, які ўмее трымаць слова, і калі бярэцца за справу, то імкнецца давесці яе да канца. І невыпадкова ў 23 гады яму ўжо даверылі ўзначальваць калектыў, які налічваў 110 чалавек.

А ў цэлым Уладзімір Іванавіч на пасадзе кіраўніка 35 гадоў, з іх 28 аддадзена Пінскаму малочнаму камбінату.

— Уладзімір Іванавіч, падчас нашай сустрэчы два гады таму вы былі занепакоены філіялам камбіната ў Століне. Вы там часта бывалі, а як справы з выпускам сыру ў Століне сёння?

— Цяпер Столін я наведваю радзей, бо там сітуацыя нармалізавалася і філіял працуе стабільна. Падабраны кадры, праведзена рэканструкцыя былога сыраробнага завода. У філіял уклалі 4,5 млрд рублёў, а гэта дало магчымасць узвесці два рэзервуары для вады па 700 м³ кожны, помпавую станцыю другаснага пад'ёму, замяніць знешнія водаправодныя сеткі, а галоўнае, пабудаваць сучаснае сырасховішча на 600 тон сыру. Ды і што казаць, калі тры гады таму мы выраблялі толькі 1600 тон сыру, то сёння ўжо пяць тысяч тон.

— А ўвогуле, якую колькасць цвёрдага сыру вам неабходна вырабляць? Ці ёсць тут перспектыва для росту?

— Сыр — прадукцыя запатрабаваная, бо дае найбольшую рэнтабельнасць пры перапрацоўцы малака, і рэнтабельнасць гэтая пастаянная. На сыр ёсць спажыўцы. Таму гэтай прадукцыі нам неабходна выраблять як мага больш. Каб давесці вытворчасць цвёрдага сыру да 20 тон у суткі, патрэбна закупіць і ўстанавіць лінію па вырабе такога сыру. Дарэчы, тэндар на аўтаматычную лінію па вытворчасці цвёрдага сычужнага сыру коштам у 6,2 млн еўра выйграла польская фірма «Обрам». Гэта дасць магчымасць ужо ў 2009 годзе вырабляць 8,5 тыс. тон сыру. Між іншым, у мінулым годзе са 104 тыс. тон перапрацаванага малака на сыр пайшло 37 працэнтаў.

— Пабываўшы на сырасховішчы і ўбачыўшы агромністыя штабелі сыру, міжволі падумаеш, а ці не чакае ваш камбінат перавытворчасць? Беларускі рынак такой колькасці сыру не пераварыць.

— Затое пераварыць расійскі. Найперш туды мы свой сыр і пастаўляем. Праўда, з кожным годам у Расіі ўзрастае канкурэнцыя і патрабаванні да якасці прадукцыі ўсё большыя. А неўзабаве мы пачнём вытворчасць элітных сыроў.

— У гэтым ёсць неабходнасць? Для большасці айчынных і расійскіх пакупнікоў не тое што элітны, а «Пятроўскі» ці «Букавінскі» — дараговатыя.

— Мы павінны працаваць на перспектыву. А тое, што нашы людзі перавагу аддаюць мясу, а не сыру, то ніхто адмаўляць не будзе. Калі ў той жа Францыі ці Галандыі вырабляюць больш за 400 гатункаў сыру, то там у насельніцтва і падыход да гэтага прадукту іншы. Але і ў нас пакупнік павінен мець выбар. Элітныя сыры хоць і даражэйшыя, але ж і смакам яны адрозніваюцца, і якасць у іх вышэйшая, бо вырабляюцца па іншай тэхналогіі, у іх большы тэрмін выспявання.

— А як да вашай прадукцыі ставяцца расійскія спажыўцы?

— У асноўным наша прадпрыемства мае справу з трыма расійскімі фірмамі, якія на біржы і змагаюцца за прадукцыю нашага камбіната. Наш сыр даходзіць да Камчаткі і расійскія пакупнікі яго ведаюць. Мы даём закупшчыкам графікі вытворчасці, асартымент...

— І ніякіх праблем?

— Ёсць адна праблема. Біржа не нясе адказнасці за выплату падатку на дабаўленую вартасць у Расіі. І калі расійскія фірмы ўхіляюцца ад выплаты гэтага падатку, то і ўзнікае праблема. Да канца ўсё павінна даводзіць біржа.

— А як справы складваюцца з малочнай прадукцыяй? Ці карыстаецца яна попытам у пінчукоў?

— Да малочнай прадукцыі стаўленне мясцовага насельніцтва своеасаблівае — яно стараецца купляць прадукцыю свайго прадпрыемства. Мінулі часы, калі людзі імкнуліся нешта купіць у яркай упакоўцы. Сёння перавагу аддаюць натуральным прадуктам, а наша малочная прадукцыя якраз такой і з'яўляецца. У ёй няма ніякіх дабавак і кансервантаў, таму яна не можа доўга захоўвацца. Але гэта не бяда — назаўтра можна купіць усё свежае.

— Уладзімір Іванавіч, што вы найбольш цэніце ў сваіх падначаленых і ці часта памыляліся пры падборы кадраў?

— Самае галоўнае, што павінна быць у чалавека, — гэта прафесіяналізм. Я ў кіраўніках ужо 35 гадоў і пры падборы кадраў рэдка памыляюся. Паглядзіш на чалавека і ўжо ведаеш прыкладна, на што ён здольны.

— Вы можаце прызнаць сваю памылку, адступіць ад сваіх амбіцый?.. Скажу, што далёка не кожны кіраўнік здольны на гэта.

— Я стараюся прымаць рашэнні абдумана, а яшчэ лягчэй гэта зрабіць калегіяльна. З падначаленымі мне лёгка, бо стараюся прыслухоўвацца да іх думак. І калі яны аргументаваныя, то пры чым тут амбіцыі? І прызнаць памылку няма праблем. А ў цэлым сур'ёзных памылак не было, хоць дробныя здараліся.

— Уладзімір Іванавіч, апошнія пытанні. Ці здзейсніліся вы як асоба і ці заможны вы чалавек?

— Прадпрыемства, якое я ўзначальваю, за мінулы год атрымала 8 мільярдаў рублёў чыстага прыбытку пры рэнтабельнасці ў 17 працэнтаў. З дзевяці аналагічных прадпрыемстваў вобласці мы займаем трэцяе месца і за апошнія два гады фінансавае становішча камбіната палепшылася. Думаю, што і мая заслуга ў гэтым ёсць. А наконт таго, ці заможны я, то скажу, што лічу сябе багатым чалавекам. У мяне два сыны, якія атрымалі вышэйшую адукацыю і пры справе. Ужо маю траіх унукаў, дык якога багацця яшчэ хацець? Было б толькі здароўе, а патрэбнасці ў мяне не вялікія. Я ні аб чым не шкадую, толькі хацеў бы на сваім прадпрыемстве зрабіць яшчэ што-небудзь карыснае і парадаваць гэтаму.

...Безумоўна, не ўсе праблемы падчас нашай гутаркі былі адзначаны, бо іх, як на кожным прадпрыемстве, хапае. Вось хоць бы праблема цяпла, якое сёння неабходна купляць. З гэтай прычыны і ўзнікла неабходнасць будаваць свае кацельні.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

ААТ «Пінскі малочны камбінат»

Рэспубліка Беларусь
225710 г. Пінск,
вул. імя М. Шыло, 2
тэл/факс: +375 165 34 15 49
+375 165 34 51 29
УНП 200299008

Камера захоўвання сыроў у Століне. Намеснік галоўнага інжынера Генадзь МАРОЗ і ўпакоўшчыца Наталля МІХНАВЕЦ.

На ўчастку вытворчасці масла працуюць Таццяна КУЛІК, Антаніна САЦ і Марыя МАСІЯНЧЫК.

Фасоўшчыкі цэха па вытворчасці сухой малочнай прадукцыі Галіна ПІСКУНОВІЧ і Алена НЕНАДЗІК.

Лабаранткі Галіна АПАНАСЮК і Таццяна ДЗІМІТРЫЧЭНКА.

ДАРЫ ПАЛЕССЯ

Натуральныя прадукты запатрабаваны часам

Сёння на прадпрыемстве выпускаецца больш за 100 назваў малочнай прадукцыі, якая вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

Амаль палова малака, якое паступае на камбінат, ідзе на вытворчасць масла, яшчэ 37 працэнтаў — на цвёрдыя сыры; на выраб натуральнамалочнай прадукцыі (малака, кефіру, смятаны, тварагу і розных творожных вырабаў) — 15 працэнтаў. Ідзе пастаяннае абнаўленне выпускаемай прадукцыі. Напрыклад, у мінулым годзе было выраблена 15 працэнтаў новых відаў ад агульнага аб'ёму прадукцыі.

А самае важнае, што на Пінскім малочным камбінаце імкнуцца выпускаць толькі натуральныя прадукты.

Асаблівую ўвагу пакупнікоў прыцягвае дэсертная група творожных вырабаў, якіх на прадпрыемстве выпускаецца 6 відаў. Менавіта дэсерты творожныя прызнаны ў мінулым годзе лепшым таварам у Беларусі.

«Творожок для сластён» 4-працэнтнай тлустасці вырабляецца з курагой, чарнаслівам, а таксама з напаўняльнікамі «Ваніль» і «Карамель». Гэты від прадукцыі мае чысты кісла-салодкі смак і можа ўжывацца як самастойны прадукт ці дэсерт да чаю ці кавы.

Не маюць наракання з боку спажыўцоў і такія гатункі масла, як: «Сялянскае», «Бярэсце» хатняе, «Бярэсце» дарожнае, «Бярэсце» лугавое. Яны вырабляюцца з натуральных вяршкоў метадам бесперабойнага збівання.

Карыстаецца попытам і малако «Дары Палесся», якое мае тлустасць 3,4 працэнта і вырабляецца з малака кароў з наступнай пастэрызацыяй. Дзякуючы найноўшым тэхналогіям апрацоўкі прадукт захоўвае смак натуральнага малака і карысныя рэчывы.

А зараз паглядзім на цвёрдыя сыры, якія асабліва цікавыя для спажыўцоў. Напрыклад, сыр «Галандскі» 45-працэнтнай тлустасці з'яўляецца традыцыйным сычужным сырам, вырабленым па класічнай тэхналогіі. Ён вельмі папулярны ў расійскіх спажыўцоў, і ўжо трэці год запар сыр «Галандскі» прызнаны лепшым таварам Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі. З гэтай прычыны «Галандскі» займае вядучае месца ў пастаўках сыроў — на яго долю прыпадае 80 працэнтаў ад усяго аб'ёму.

Але сваіх прыхільнікаў маюць і іншыя гатункі цвёрдых сыроў. І напэўна, яны не ўступаюць «Галандскаму». У кожнага свой густ. Сыр «Бярэсце» 40-працэнтнай тлустасці вылучаецца сваім смакам і духмянасцю элітных высакатлустых сыроў.

Сыр «Губернатарскі» 50-працэнтнай тлустасці мае ўмерана выражаны кіславаты сырны смак і пах. Тэрмін выспявання гэтага сыру 30 сутак.

Да новага віду сыроў адносіцца сыр сычужны цвёрды «Слівачны» 50-працэнтнай тлустасці. Гэты сыр упершыню вырабляецца з нізкай тэмпературай другога нагрэву. Як і сыр «Губернатарскі», мае ўмерана выражаны кіславаты смак і пах.

А сырам з нізкай тлустасцю з'яўляецца «Палескі» (20 %, 30 %), які шырока выкарыстоўваецца для вырабу гарачых страў, напрыклад, піцы ці смажанцаў.

Адносна сыру «Белавежскага» можна сказаць, што ён вылучаецца тым, што праходзіць працэс гарачага ці халоднага вэнджання і вырабляецца з сыру «Галандскага», нарэзанага на кавалачкі і нацёртага перцам чорным, духмяным, чырвоным і часнаком. Мае востры пах і смак з выражаным адценнем прыпраў. Сыр «Белавежскі» ўжываецца да чаю, піва, з яго можна прыгатаваць розныя пасты і бутэрброды. Тэрмін захоўвання гэтага сыру 90 сутак.

А хіба не карыстаюцца папулярнасцю сыркі творожныя глазураваныя рознай тлустасці з ванілінам, какосавай стружкай, напоўненыя карамеллю, малінай ці вішняй!? Пералічваць усе віды прадукцыі няма неабходнасці, бо якасць яе добра вядома далёка за межамі Беларусі. Напрыклад, сухое малако і казеін Пінскага малочнага камбіната ведаюць у Японіі, на Філіпінах, Германіі, ЗША...

Матэрыял падрыхтавалі Сымон СВІСТУНОВІЧ і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота аўтараў.

А вось што сказалі пра свайго дырэктара тыя, хто штодня кантактуе з ім

Намеснік галоўнага інжынера Генадзь МАРОЗ:

— Уладзімір Іванавіч кіраўнік патрабавальны, умее дабівацца намечанай мэты. Калі выказаць яму сваю прапанову і яна дзельная, то дырэктар падтрымае. Ва ўсякім разе, калі я выходзіў на яго, то адмовы не было.

Намеснік дырэктара Канстанцін ШЛЯЖКО працуе з Уладзімірам Мулярчыкам дзесяць гадоў.

— Адзначу, што ён ніколі не павышае голас і заўсёды вытрыманы. У дырэктара нават у кабінеце кожная рэч на месцы. «Культура дысцыпліную чалавека, і калі ў яго ўсё нармальна на працы, то гэта ўжо многа», — любіць гаварыць Уладзімір Іванавіч.

Па заслугах і ўзнагароды

Безумоўна, усё, што здолела дасягнуць прадпрыемства, — заслуга калектыву, які працуе зладжана і мэтанакіравана. І як кажуць, па заслугах і ўзнагароды.

А іх у ААТ «Пінскі малочны камбінат» вялікая колькасць, і таму за лепшае будзе спыніцца толькі на апошніх.

На штогадовай рэспубліканскай канферэнцыі «Якасць-2007», якая праходзіла ў Палацы Рэспублікі, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі А. Кабякоў уручыў дырэктару прадпрыемства Уладзіміру Мулярчыку прэмію ўрада Рэспублікі Беларусь за ўкараненне высокаэфектыўных метадаў кіравання якасцю і ўкараненне на гэтай аснове калектывам ААТ «Пінскі малочны камбінат» канкурэнтаздольнай прадукцыі.

На Брэстчыне толькі Пінскі малочны камбінат атрымаў гэтую высокую прэмію. А яшчэ быў прысуджаны дыплом лаўрэата конкурсу Дзяржстандарта Расіі «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі». На конкурсе ж «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» лаўрэатам стаў дэсерт творожны.

А прэмію аблвыканкама ў галіне якасці дырэктару ААТ «Пінскі малочны камбінат» Уладзіміру Мулярчыку ўручыў кіраўнік вобласці Канстанцін Сумар.

Скажу, што ў 2005 годзе сыр «Пятроўскі» атрымаў сярэбраны медаль, а сыр «Галандскі» заваяваў «бронзу» ў 2006 і 2007 гадах.

Прадукцыя ААТ «Пінскі малочны камбінат» адзначалася дыпломамі і станавілася лаўрэатамі выставак «Садружнасць», «БелАгра», перамагала ў конкурсе якасці «Прадукт года».

Але жыццё не стаіць на месцы, і неўзабаве ўсе поспехі калектыву стануць гісторыяй. Можна не сумнявацца, што найбольшыя дасягненні ў ААТ «Пінскі малочны камбінат» яшчэ наперадзе.

Аператар лініі вытворчасці тварагу Алена ХОМЕЦ.